№ 30 (436) 12 жніўня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



**Каму ў Беларусі жыць добра**
ТОР–5 забаваў сталічнага топ–мэнэджэра.
Старонка 15

**Байкот «Нямецкай хвалі»**
Адкрыты ліст Віталя Сіліцкага.
Старонка 2

**Цнатлівая сьціпласьць рок-дыназаўраў**
Севярын Квяткоўскі пра кнігу «Іх МРОЯ. Іх N.R.M.».
Старонка 2

## НАВІНА Ў НУМАР

**Валэнса сустрэўся зь ліцэістамі**

Экс-прэзыдэнт Польшчы Лех Валэнса 10 жніўня сустрэўся з навучэнцамі Беларускага ліцэю, які ў жніўні працуе ў Гданьску. Валэнса зазначыў, што для яго «няма Беларусі без Эўропы, як і няма Эўропы безь Беларусі». Ён падкрэсьліў, што палякі гатовыя дапамагаць беларусам у іх змаганьні за свабоду, але сваю прышласьць беларусы мусяць будаваць сваімі рукамі, не чакаючы паратунку ані з Усходу, ані з Захаду. Ліцэісты мелі сустрэчы з кінарэжысэрамі Анджэем Вайдам ды Кшыштафам Занусі, польскім палярным падарожнікам Маркам Каміньскім, сынам драматурга Францішка Аляхновіча Юркам, гісторыкам Аленай Глагоўскай. А Гданьскае рачное параходзтва арганізавала для іх бясплатную вандроўку па Гданьскай затоцы.

**ЛБ, Гданьск**

## ГІСТОРЫЯ

**Дзе пахаваны наш першы сьвяты**

Торвальд Вандроўнік быў першым хрысьціянскім місіянэрам у Беларусі. Магчыма, гэта ён адпяваў Рагнеду і Ізяслава. «Там ён пахаваны ў адной гары каля Полацку, і называюць палачане яго сьвятым», — пішуць сагі. Магіла сьвятога — у Полацку на Востраве? Піша Алесь Аркуш. **Старонка 14.**

## НОВЫЯ ТЭХНАЛЁГІІ

**Кампутарны Багдановіч**

Сёньня кожны можа напісаць новы верш Багдановіча ці Купалы з дапамогай кампутара. Досьведам дзеліцца Аляксандар Ворвуль. **Старонка 18.**

**Дык падпісвайся!**

На любой пошце можна аформіць падпіску на ліпень—сьнежань. Падпісны індэкс газэты «Наша Ніва» 63125. Падпіска для прыватных асобаў будзе каштаваць 4510 рублёў у месяц, для арганізацыяў — 5631 рубель. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3340 рублёў на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.

# Бура над краінай

**Бура 9 жніўня** была такое сілы, што ўпершыню за пяць гадоў перарвалася трансьляцыя Беларускага тэлебачаньня. У выніку аварый на лініях электраперадачы быў абясточаны будынак на Камуністычнай, 6.
Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага** на старонцы 12.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Водападзел на радыёхвалях

Палеміка вакол мовы вяшчаньня «Нямецкае хвалі» зьбілася на эмацыйны тон. Гэта кантрастуе з абыякавасьцю ўладных менскіх структураў. Піша **Сяргей Харэўскі.**

Сапраўды, яны перажылі «101,2», «Балтыйскія хвалі» ды «Рацыю» — паўнавартасныя радыйныя праекты, у якіх бралі ўдзел дзясяткі найбольш прафэсійных беларускіх журналістаў. А ўжо ж паўгадзінныя «беларускія» ўстаўкі ў этэр нямецкае радыёстанцыі ў Менску можна й не заўважыць. Пагатоў што рэйтынг самое «Нямецкае хвалі» ў Беларусі настолькі малы, што не трапляе нават у зазор статыстычных памылак.

А вось беларускія незалежнікі не хаваюць расчараваньня. Чакалася, што Эўразьвяз паспрыяе ў стварэньні дзейснага інфармацыйнага каналу для Беларусі. Між тым рашэньне пра «Нямецкую хвалю» адно спраўкавала раскол дэмакратычнае апазыцыі.

Бурапена камэнтароў адносна праекту «Deutsche Welle» для Беларусі выявіла, што незалежнае грамадзтва застаецца падзеленым у моўным пытаньні, і гэты падзел глыбокі.

**Працяг на старонцы 3.**

## Саюз палякаў? — Маёр Кузьміч слухае!

Улады ладзяць фарс перавыбараў у Саюзе палякаў, але гэта злавесны фарс. Піша **Сяргей Максімовіч** з Горадні.

Як вядома, улады праз два месяцы пасьля заканчэньня апошняга, 6-га Зьезду СПБ зьнянацку абвясьцілі яго вынікі несапраўднымі. Зьезд адбыўся 12—13 сакавіка ў Горадні, дзе праходзілі і ўсе папярэднія. Улады, такім чынам, два месяцы прызнавалі законны выбар дэлегатаў і само нававыбранае кіраўніцтва Саюзу. А вось цяпер газэта «Głos znad Niemna», якую вы пускаюць Т.Кручкоўскі з паплечнікамі, сьцьвярджае, што,

**Працяг на старонцы 7.**

### Заклікаю да байкоту «Нямецкай хвалі»

Эўрапейская камісія прыняла рашэньне пра вяшчаньне радыёстанцыі «Нямецкая хваля» на Беларусь — выключна на расейскай мове. Такі падыход зьяўляецца вынікам поўнага неразуменьня працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі, зьвязаных з адраджэньнем беларускай дэмакратычнай нацыі. Усьлед за афіцыйнай прапагандай лукашэнкаўскага рэжыму эўрапейскія бюракраты спрабуюць насадзіць у грамадзкую сьвядомасьць думку пра беспэрспэктыўнасьць і фактычна неіснаваньне попыту на беларускую мову сярод грамадзян Беларусі. Не былі ўзяты пад увагу ні вопыт пасьпяховых беларускамоўных мэдыйных праектаў (такіх, як газэта «Свабода» і радыё «101,2»), зьнішчаных уладамі, ні вынікі перапісу насельніцтва 1999 г., згодна зь якімі больш як тры чвэрці грамадзян краіны прызнаюць беларускую мову роднай. Яшчэ больш абсурдным выглядае рашэньне пра вяшчаньне на Беларусь расейскай рэдакцыяй «Нямецкай хвалі» — людзьмі, для якіх Беларусь зьяўляецца ўсяго толькі пабочным заняткам і ад якіх нельга чакаць глыбокага веданьня і разуменьня працэсаў, што адбываюцца ў Беларусі.

Адраджэньне нацыянальнай самасьвядомасьці — неабходная ўмова дэмакратызацыі любой нацыі. Неразуменьне гэтага факту вядзе толькі да ўмацаваньня тэндэнцый, якія спрыяюць утрываленьню дыктатуры ў Беларусі. Крыўдна, што эўрапейскія бюракраты, якія так клапоцяцца пра захаваньне аўтэнтычных нацыянальных культур на тэрыторыі ЭС, цалкам падтрымалі палітыку зьнішчэньня беларускай мовы і культуры.

Я не выступаю за выдаленьне расейскай мовы зь беларускай мэдыйнай прасторы. Я пратэстую толькі супраць палітыкі выдаленьня мовы беларускай. Беларусы і беларускамоўныя грамадзяне маюць слухаць навіны і на сваёй мове! Афіцыйны Менск штодня топча гэтае права, практычна зьнішчыўшы беларускае слова на дзяржаўным ТБ. Сёньня да гэтай палітыкі далучыўся і ЭС. Інакш як ганебным такое рашэньне ахарактарызаваць нельга.

Заклікаю беларускіх палітыкаў, журналістаў, аналітыкаў і грамадзкіх дзеячоў, якім неабыякавы лёс роднага слова, да байкоту так званага «беларускага вяшчаньня» «Нямецкай хвалі» да зьмяненьня яго моўнай палітыкі.

**Віталь Сіліцкі, доктар паліталёгіі**

Далучаемся да закліку Віталя Сіліцкага:

**Уладзімер Арлоў**, пісьменьнік; **Валер Булгакаў**, кандыдат філязофіі, рэдактар часопісу «ARCHE»; **Анатоль Грыцкевіч**, доктар гістарычных навук; **Андрэй Дынько**, рэдактар газэты «Наша Ніва»; **Алесь Марачкін**, старшыня Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына».

Ліст адкрыты да падпісаньня. Сьпіс падпісантаў будзе надрукаваны.

### Алесь Разанаў: «Форма пярэчыць зьместу»

Паэт Алесь Разанаў, ляўрэат прэміі Гердэра, пра сытуацыю зь «Нямецкай хваляй».

На ляўрэацкіх урачыстасьцях у Вене пасол аднае краіны сказаў мне: «Нам незразумела, чаму супрацоўнікі беларускага пасольства размаўляюць паміж сабою не на беларускай мове. Няўжо яны самі не разумеюць, што гэта ня робіць ім гонару?»

Тое самае зараз я мог бы сказаць і пра пачутую навіну. Вядома, той, хто будзе слухаць беларускую праграму «Нямецкай хвалі», зразумее яе і так, але заўсёды пры гэтым будзе ўзьнікаць і заставацца ня вытлумачаным пытаньне, чаму яна гучыць не па-беларуску.

Форма бярэцца пярэчыць зьместу, а самы асноўны зьмест праграмы быў бы якраз у тым, што яна гучыць адпаведна з аб'яўленай назвай.

Ды і ў Эўрапейскі Зьвяз новыя краіны ўваходзяць не для таго, каб растварыцца ў новай-старой затоцы, а з пэўнаю мэтамэтай — каб відавочней і паўней выяўляць і, выяўляючы, спасьцігаць тое, што робіць іх імі.

У часе маёй «нямецкай вандроўкі» мне неаднаразова даводзілася чуць, і прэса пра гэта пісала, што я там зьдзяйсьняю пэўную місію. Ім відней. Але мне вельмі хацелася б, каб слынная «Нямецкая хваля» сваёю новай праграмай таксама пачала зьдзяйсьняць пэўную і такую цяпер істотную для Беларусі місію. Проста інфармацыі ўжо замала.

Усюды, і ў Гановэры, і ў Бэрліне, я сустракаўся з маладымі беларусамі, выпускнікамі айчынных, а ў некаторых выпадках яшчэ і нямецкіх ВНУ — яны добра валодаюць і нямецкай мовай, і сваёй і ахвотна далучыліся б да гэтай дзялянкі дзейнасьці.

Ды і ў самой рэдакцыі «Нямецкай хвалі» ёсьць і беларуская «прысутнасьць»: з выпускніцай лінгвістычнага ўнівэрсытэту, што памятае яшчэ лекцыі Пятра Васючэнкі, я меў гаворку на адной міжнароднай паэтаканфэрэнцыі ў Боне. Дамовіліся на выступленьне. Лепш за ўсё, калі яно ня будзе мець патрэбы ў самаперакладзе, а прагучыць, як гучаць на «Нямецкай хвалі» іншыя галасы, — у арыгінале.

# Цнатлівая сьціпласьць рок-дыназаўраў



**Віктар Дзятлікoвіч. Іх Мроя. Іх N.R.M.** – Менск: Сучасны літаратар, 2005. – 320 с. + 32 вкл.

Легенды сусьветнага року ўжо пры жыцьці раскладаюцца журналюгамі «на атамы». І нікому няма ратунку. Публіка хоча ведаць: хто з кім спаў, хто што калоў, паліў, бухаў... Пра першую беларускую кнігу такога кшталту піша **Севярын Квяткоўскі**.

«Цнатлівасьць» — падказаў мне нутраны голас, калі я прабегся па зьмесьце кніжкі Віктара Дзятлікoвіча, але не пасьпеў зафіксаваць імгненнае падазрэньне, што ўзьнікла ў сьвядомасьці.

Пятнаццаць разьдзелаў з кароткімі падразьдзеламі, якія распавядаюць пра жыцьцё і творчасьць удзельнікаў праектаў «Мроя» і «N.R.M.». Ёсьць тэксты ўсіх песень і шэраг фатаздымкаў. Няма іменнага паказьніку.

Я ведаў, што Віця Дзятлікoвіч піша кніжку «пра Мрою», і чакаў яе — кніжку. Праглынуў амаль не адрываючыся. Якасная журналісцкая праца. Віктар першым увасобіў ідэю, якая даўна блукала ў розных галовах: стварэньне тэкстаў пра беларускі рок-асяродак — ад мастацкіх кніжак да сцэнароў для дакумэнтальнага кіно. (Польская прадусарка Яланта Кільян нават пачынала здымкі.) «Іх МРОЯ. Іх N.R.M.» — гэта своеасаблівы сцэнар для тэлевізійнага дакумэнтальнага фільму. Праўда, без эфэктнай фінальнай кропкі. Такое сабе трохкроп'е пры канцы, як намёк на працяг — «Іх МРОЯ. Іх N.R.M.-2», «Іх МРОЯ. Іх N.R.M.-вяртаюцца»... Назва падалася нейкай груваснай, неэфэктнай. Пазьней зразумеў, што назва — ключ да тых пытаньняў, да таго адчуваньня недахопу, што ўзьнікла амаль ад пачатку чытаньня.

Менавіта на «тэлесцэнарнасьць» я скінуў адчуваньне недахопаў: галасоў, азначэньняў, фактуры, урэшце. Можа, аўтар сам сабе бачыць відэашэраг, які дапамагае адчуць палітру вобразаў герояў кніжкі? Сапраўды, хай бы хто сказаў — «гаўно гэтая Мроя, гаражны рок». Каб падпярчыць-падвастрыць тэкст.

Апрача «мроеўцаў», у тэксьце толькі дзьве асобы гавораць жыўцом — тэлерадыёжурналіст Віталь Сямашка і музычны агляндальнік Зьміцер Падбярэскі. Але не пра герояў кніжкі: іхныя маналёгі дапамагаюць аднавіць атмасфэру часу.

**Працяг на старонцы 8.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Палкоўнік Дзьмітры Паўлічэнка атрымаў ад Аляксандра Лукашэнкі трэці ордэн — «За службу радзіме» ІІІ ступені — за «заслугі ў забесьпячэньні грамадзкага парадку». На фота: закатаўшы рукавы, палкоўнік сочыць за выпрабаваньнямі крапавых барэтаў.**

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

### Палескі цырульнік

*В.А.*

Сонца яму на скуры малюе зоркі і свастыкі,
а ён, паслаўшы апёкі да самай яснай халеры,
паказвае найвышэйшую клясу мастацкай гімнастыкі,
калі размотвае стужкай рулён туалетнай паперы.

Плыве за вадою й зрабіўся крыху цырульнікам,
бо неабачлівым рыбкам галовы стрыжэ да шыек,
хвасты падстрыгае русалкам, палескі унікум,
ператвараючы іх у спартсмэнак–паралімпіек.

Воўну з аблокаў стрыжэ і сплаўляе паверхняй ракі,
а рэшткі ўначы сабе цягне ў намёт пад галаў;
смак хлеба, якім ён корміць мясцовых дзяўчат з рукі,
аддае сродкам ад камароў — зрынутых зь неба анёлаў.

Ён ведае, дзе бярозкі растуць скрозь старыя пні,
нібы на голае цела мераюць фенечкі і маністы.
Калі ён заходзіць мыцца ў раку, у мыльнай пене сьляпні
канаюць, быццам замерзлыя ў горных сьнягох альпіністы.

Гарэлку ператварае ўначы ў навальнічны сок,
які цячэ лістотаю дуба ў жывым электрычным праменьні,
і кроплі здаюцца сухімі, як жоўты палескі пясок,
быццам сябры й сяброўкі кінулі зь неба па жмені.

*24–31 ліпеня, рака Сьцьвіга — Менск*

### «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

Самы высокі чалавек на сьвеце — гэта беларус Віцебскай губэрні, Хведар Махоў, мае росту больш як сажань. Праз яго пярсьцёнак лёгка праходзіць рубель.

**26 жніўня 1910 г. №35**

Паштовая скрыня

**Пасадзец. Зьмітрок Бядуля.** – Ужо лепей, пішыце яшчэ. Толькі больш увагі на мову.

**29 (11) ліпеня 1910 г. №31.**

**А.Гаруну, Юстыне, А.Зязюлі.** – Чаму змоўклі?

**Жлобін. Цішка Гартны.** – Добра, прысылайце нам свае думкі аб бацькоўшчыне.

**5 (18) жніўня 1910 г. №32.**

# Водападзел на радыёхвалях

Працяг са старонкі 1.

ТБМ, лідэры БНФ, Згуртаваньне беларусаў сьвету рэзка крытычна адрэагавалі на тое, што пад выглядам праекту для дэмакратыі за эўразьвязаўскія грошы ў нашым этэры будзе пашырацца расейская мова.

Усьвядоміўшы, наколькі балючае для беларусаў гэтае пытаньне, немцы пачалі няўклюдна апраўдвацца. Ганс-Георг Вік спаслаўся на фінансавыя праблемы. А кіраўніца расейскае рэдакцыі «Нямецкай хвалі» спадарыня Рабітц сказала ў інтэрвію БелаПАН: «Параўнаньне «беларуская мова — добра, расейская мова — кепска» — дурное», хоць ніхто зь яе апанэнтаў так пытаньня ня ставіў.

Беларускія патрыёты не параўноўвалі мовы, а зьвярталі ўвагу на тое, што выбар расейскай мовы радыётрансьляцыі спрыяе той культурнай палітыцы й той ідэалёгіі, што насаджае ў нас Лукашэнка, і сее раскол у незалежным грамадзтве. Спн.Рабітц у інтэрвію БелаПАН параўнала беларускую сытуацыю з сытуацыяй у Сярэдняй Азіі, дзе перадачы «Нямецкай хвалі» па-расейску цэняць. Магчыма, гэта і так. Але нідзе ў тых краінах моўнае пытаньне ня мае той вастрыні, як у Беларусі.

Другая частка апазыцыі вітала ініцыятыву нямецкіх дыпляматаў. «Мы и так знаем, что большинство белорусов думает по-русски», — безапэляцыйна сьцьвярджае «Белорусская деловая газета». Ну чым не Лукашэнка? Тамсама робіцца й высновa: дарма, маўляў, апраўдваецца Вік, было б перад кім… У той жа час «БДГ» прызнае: «Гучаньне «Нямецкай хвалі» на мове тытульнай нацыі спрыяла б адраджэньню беларускае самасьвядомасьці».

У ёрніцкім тоне адкамэнтавала змаганьне беларусаў за мову «Белорусская газета». А БелаПАН выцягнула зь нябыту ідэалягічна афарбаваны тэрмін «нацыянальна арыентаваныя» дзеячы.

Характэрна, што кандыдаты ў прэзыдэнты А.Мілінкевіч, С.Калякін, А.Казулін і У.Колас ніяк не адрэагавалі на палеміку. Сваю пазыцыю сфармуляваў толькі Анатоль Лябедзька, які стрымана скрытыкаваў рашэньне Нямеччыны і Эўракамісіі, падкрэсьліўшы, што беларускае вяшчаньне было б больш слушным: «Але калі мы ня можам паўплываць на разьвіцьцё падзеяў, то на расейскай мове – гэта лепш, чым нічога». Станіслаў Шушкевіч выказаўся разчэй: «Трэба, каб яны вяшчалі па-беларуску. Інакш гэта будзе дапамога тым, хто руйнуе Беларусь. Расейскамоўныя праекты паспрыяць яднаньню нацыі ня могуць».

Дзьве часткі беларускае апазыцыі — што вада з алеем. Супярэчнасьці сярод працаўнікаў сёньняшняга менскага рэжыму куды глыбейшыя і старэйшыя, чым праблема «адзінага» кандыдата.

Чаго чакала беларуская апазыцыя ад новых радыёстанцый, якія вяшчалі б на Беларусь? Па-першае, апэратыўнага інфармаваньня пра падзеі ў Беларусі штодзень. Па-другое, аналізу ўнутрыпалітычнае сытуацыі. Па-трэцяе, інфармаваньня пра эўрапейскія нормы права й палітычнае этыкі ў параўнаньні іх зь беларускай сытуацыяй. А далей — асьветы слухачоў у тых сфэрах, што недаступны ў беларускіх афіцыйных СМІ, папулярызацыі недзяржаўнай жывой беларускай культуры. Гэта былі б інвэстыцыі ў інтэлектуальны патэнцыял беларускае нацыі. Выглядае, разьлік быў марны. Сума, якую выдаткаваў Эўразьвяз на гэтае вяшчаньне — 138 тысяч эўра на год, — мізэрная. Перадусім гэтыя грошы пойдуць на тэхнічнае забесьпячэньне вяшчаньня, каналы сувязі й падаткі.

15 хвілінаў на навіны з Эўропы і яшчэ 15 на інфармацыю зь Беларусі? Дзякуй і на гэтым. Пытаньне пра паўнавартасны, незалежны ад Лукашэнкі радыёканал застаецца надзённым. У гэтай справе больш абнадзейвае рашэньне ўраду Польшчы пра выдаткаваньне 290 тыс. даляраў на стварэньне беларускамоўнае радыёстанцыі для вяшчаньня на нашу краіну.

Пытаньне ж мовы для радыё прагматычнае ня з гледзішча браку грошай (чаму ж гэта па-расейску таньней?), а з прычыны элемэнтарнае пазнавальнасьці ў этэры. Калі патэнцыйны слухач у моры расейскамоўных галасоў вылушчыць гукі роднае мовы, то гэта неймаверна спрашчае яму задачу пошуку сваёй хвалі. І гэта будзе дакладна тое, што ён хацеў бы пачуць. Пакуль жа чалавек перад **прымачом будзе разьбірацца, хто яму там расказвае па-расейску пра жыцьцё Эўропы, можа, у Беларусі адбудзецца самае галоўнае.**



## Расейскіх маракоў уратавала выцечка інфармацыі

Расейская прэса піша, што сем маракоў з батыскафа АС-28 на Камчатцы ня выжылі б, калі б ня ўцечка інфармацыі ў СМІ. Армія не зьбіралася зьвяртацца па дапамогу да замежнікаў, хоць ня мела сродкаў для ўратаваньня маракоў.

«Российская газета» сьцьвярджае, што армія акружыла здарэньне покрывам вялікай тайны, бо батыскаф «Прыз» зачапіўся аб антэну пэленгацыйнай сыстэмы «Агам», якая «засякае» чужыя падводныя караблі.

Хоць «Прыз» заграз на дне Бэрынгавага мора ў чацьвер, справа выплыла на публіку толькі ў пятніцу, дзякуючы ананімнаму званку на мясцовую радыёстанцыю «Радыё-3». Патэлефанавала жанчына, якая адрэкамэндавалася «жонкай падводніка» і расказала пра здарэньне з батыскафам, пішуць газэты.

На званок адказала Гюзэль Латыпава, якая супрацоўнічае таксама з агенцтвам «Інтэрфакс». Разам з карэспандэнткай агенцтва «РІА «Навіны» ў Петрапаўлаўску-Камчацкім Аксанай Гусевай Латыпава вырашыла праверыць сыгнал. Калі ў вайсковым штабе са злосьцю адмовіліся ад усялякіх камэнтароў, журналісткі зразумелі, што інфармацыя праўдзівая, і далі ёй ход.

— Мяркую, бяз гэтай уцечкі армія папросту паставіла б крыж на гэтых людзях, бо ў Расеі не было абсталяваньня, каб іх выратаваць. А прасіць аб дапамозе замежныя краіны — не ў традыцыях Расеі. Тая жанчына ўратавала маракоў. Ну, і СМІ, асабліва замежныя, а гэта было вырашальным.

Усяго праз некалькі гадзін пасьля таго, як інфармацыя аб «Прызе» трапіла ў СМІ, яе пацьвердзіла камандаваньне арміі ў Маскве і Ўладзівастоку. Штаб ваенна-марскога флёту Петрапаўлаўску-Камчацкага афіцыйнае паведамленьне апублікаваў толькі ў аўторак, праз два дні пасьля выратаваньня батыскафа.

Армія катэгарычна абвергла ў аўторак апублікаваную «Коммерсантом» інфармацыю пра тое, што маракі на «Прызе» ўжо пісалі перадсьмяротныя лісты. Паводле газэты, яны былі ўпэўнены ў непазьбежнасьці сваёй сьмерці, бо пачулі ад ратавальнікаў, што падчас апэрацыі ні ў якім разе нельга пашкодзіць капітойнай антэны, аб якую зачапіўся АС-28.

Расейская прэса паведамляе пра размову ўратаваных зь міністрам абароны Сяргеем Івановым, у якую безь перастанку ўмешваўся камандуючы паўночна-ўсходняй групоўкай войск Віктар Гаўрыкаў. Ён «выпраўляў» расказы маракоў, пярэчачы іх словам. Абвяргаў інфармацыю пра загад захаваць антэну. Не зважаючы на пярэчаньні маракоў, сьцьвярджаў, што «Прыз» пасьпелі падняць на некалькі дзясяткаў мэтраў, перш чым да апэрацыі падключыўся брытанскі робат «Скорпіё», які перарэзаў ліні.

Прадстаўнік Ціхаакіянскага флёту падаў журналістам вэрсію падзей, што зусім не стасавалася з аповедамі членаў сямей маракоў.

Алена Мілашэўская, жонка камандзіра «Прызу», якая спачатку ахвотна размаўляла з прэсай, крытыкуючы расейскае камандаваньне, пазьней стала адмаўляцца ад камэнтароў. «Адміралы глядзяць на мяне зь нянавісьцю, і я баюся, што ў мужа будуць праблемы», — сказала яна «Коммерсанту».

**Мікола Бугай**

**На фота: раніца 7 жніўня. Камандзір батыскафа Вячаслаў Мілашэўскі (зьлева) да апошняга верыў у ратунак.**

# Іншым разам яны вяртаюцца

Праз чатырнаццаць гадоў пасьля скону СССР кіраўніцтва Беларусі ўсё яшчэ ажыўляе прывіды мінулага. Піша **Віталь Тарас**.

Герману Герынгу, чалавеку нумар два ў гітлераўскім Райху, які сярод іншых быў асуджаны трыбуналам у Нюрнбэргу да павешаньня і скончыў самагубствам у камэры, біёграфы прыпісваюць вясёлы нораў і пачуцьцё гумару. Вядома, напрыклад, што Герынгавым намесьнікам быў генэрал-фэльдмаршал люфтвафэ Эргард Мільх. Ягоная маці была габрэйкай, і таму фармальна Мільх ня мог займаць ніякіх пасад у нацысцкай Нямеччыне. Калі ж ворагі кіраўніка люфтвафэ сталі абвінавачваць Герынга ў тым, што той пакрывае габрэя, ён нібыта публічна заявіў: «У маім ведамстве я буду вырашаць, хто габрэй, а хто не!»

### Хто габрэй?

Гэтая фраза набыла анэкдатычную вядомасьць. Але сэнс анэкдоту насамрэч ня ў тым, што Герынг дапамагаў сваім падначаленым, якія прыносілі карысьць справе, а ў тым, што кіраўнікі Райху сапраўды маглі вырашаць і вырашалі, каго лічыць габрэем, а каго не. Вядома іншая фраза, якую прыпісваюць Гітлеру: «Калі б габрэяў не было, іх давялося б выдумаць». Сказанае не азначае, зразумела, што Гітлер і Герынг не былі антысэмітамі (хоць Герынг, магчыма, ня быў ідэйным антысэмітам). Антысэмітызм быў падмуркам ідэалёгіі трэцяга Райху, ажыцьцяўленьне якой на практыцы азначала зьнішчэньне мільёнаў людзей. Мы памятаем, аднак, што, паводле расавай тэорыі гітлераўцаў, быў народ, які займаў яшчэ больш нізкае за габрэяў месца ў расавай гіерархіі, — цыганы. Крыху вышэй за габрэяў ставіліся нэгры й славяне (асобы славянскай нацыянальнасьці?). Такім чынам, практычныя немцы як бы пакідалі сабе «поле дзейнасьці» на той выпадак, калі б «габрэйскае пытаньне» было сапраўды «канчаткова вырашана» ў тым сэнсе, як гэта разумелі нацысты.

Але хіба толькі немцы вызначаліся падобнай прагматычнасьцю? Напрыклад, «савецкі інтэрнацыяналізм» пры Сталіну пасьля вайны мірна спалучаўся з барацьбой супраць «бязроднага касмапалітызму» — г.зн. дзяржаўным антысэмітызмам. Да вайны Сталін пасьлядоўна «прызначаў габрэямі» трацкістаў-зіноўеўцаў, беларускіх і ўкраінскіх сялян, а падчас і пасьля вайны ў ролі габрэяў-выгнаньнікаў па чарзе апынуліся немцы Паволжа, крымскія татары, калмыкі, чачэнцы ды іншыя народы і народнасьці. Потым знайшліся й лекары-забойцы з габрэйскімі прозьвішчамі. У той самы час Ільля Эрэнбург мог атрымаць Сталінскую прэмію, а акадэмік Мінц — загадваць марксісцка-ленінскай навукай. Сталін сам вызначаў, хто ёсьць хто.

Працяг на старонцы 4.

## СЬЦІСЛА

### Забарона на піва

Міністэрства аховы здароўя падрыхтавала зьмены ў Адміністрацыйны Кодэкс, у тым ліку — забарону на расьпіцьцё піва ў грамадзкіх месцах. Зьмены тычацца слабаалькагольных (ад 0,5% да 7%) напояў. Мэдыкі лічаць, што гэта дапаможа спыніць падлеткавы алькагалізм.

### «Планета» Янчэўскага

Зьявіўся новы грамадзка-палітычны часопіс «Планета», рэдактарам якога выступае былы кіраўнік БПСМ У.Янчэўскі.

У раду часопісу ўвайшлі заснавальнікі — кіраўнікі «Белтрансгазу», супрацоўнікі Адміністрацыі прэзыдэнта, Інстытуту сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў пры Адміністрацыі, журналістка БелТА. Курыруе выданьне намесьнік кіраўніка Адміністрацыі А.Пралясkоўскі. Бальшыня публікацыяў у часопісе ананімная. Самыя характэрныя загалоўкі матэрыялаў: «ЗША абралі новую ахвяру. Ірану абяшчаны шах!», «Эўратупік», «Памаранчавая рэвалюцыя: як падманулі ўкраінцаў», «Рэвалюцыя адмяняецца. У наступным годзе ў Беларусі амэрыканскіх паліттэхнолягаў чакае грандыёзны скандал».

### Наркотыкі ад міліцыі

Пракуратура Беларусі перадала ў суд матэрыялы сьледзтва па справе міліцыянтаў, якія распаўсюджвалі наркотыкі. Абвінавачаньне выстаўленае былому начальніку ўправы па супрацьдзеяньні незаконнаму абарачэньню наркотыкаў і злачынствам у сфэры маралі УУС Менаблвыканкаму палкоўніку А.Ціхамірaву, былому начальніку Барысаўскага міжрайаддзелу па супрацьдзеяньні незаконнаму абарачэньню наркотыкаў і злачынствам у сфэры маралі маёру С.Шнедэру і былому апэрупаўнаважанаму гэтага ж міжрайаддзелу лейтэнанту А.Лябедку. Пракуратура даказвае, што дастаўкай і распаўсюдам наркотыкаў яны займаліся з сакавіка па кастрычнік 2004 г.

**АШ, svaboda.org**

# Іншым разам яны вяртаюцца

Працяг са старонкі 3.

Ня ён, зразумела, і ня немцы выдумалі антысэмітызм. Да пачатку мінулага стагодзьдзя габрэйскія пагромы рэгулярна адбываліся ў Расейскай імпэрыі па ўсёй так званай мяжы аселасьці. Палякі, вядома, таксама ўнесьлі свой «уклад» у гісторыю перасьледу габрэяў. Апошняя хваля габрэйскай эміграцыі з Польшчы была інсьпіраваная кіраўніцтвам ПАРП і органамі дзяржбясьпекі ў 1968 годзе.

Ня так даўно польская грамадзкасьць успамінала трагедыю Ядвабнага — мястэчка, у зьнішчэньні габрэйскага насельніцтва якога падчас вайны ўдзельнічалі палякі. Сучаснае кіраўніцтва Польшчы знайшло ў сабе мужнасьць прызнаць і ўвекавечыць гэты факт, папрасіць дараваньня ў нашчадкаў ахвяраў.

## Чаравікам па трыбуне

Як бы парадаксальна гэта ні гучала, самі палякі, у сваю чаргу, не аднойчы ператвараліся ў, так бы мовіць, «бязродных касмапалітаў» — у вачах расейцаў, прынамсі. Слова «пшэк» нярэдка гучала ў іхніх вуснах амаль гэтак жа зьняважліва, як слова «жыд» (дарэчы, ні ў польскай, ні ў беларускай мове, у адрозьненьне ад расейскай, гэтае слова ніколі ня мела зьняважлівага сэнсу).

Не ў XIX стагодзьдзі ў царскай Расеі, не ў 20-я гады стагодзьдзя мінулага, калі Чырвоная Армія была ўшчэнт разьбітая пад Варшавай, але ўжо ў наш час па расейскім тэлебачаньні з вуснаў расейскіх інтэлектуалаў ізноў гучаць зьняважлівыя выказваньні накшталт таго, што дзяржаўнасьць Польшчы вымяраецца апошнімі шасьцюдзесяцьцю гадамі, у крайнім выпадку — васьмюдзесяцьцю… Разам з польскай дзяржаўнасьцю закрэсьліваецца, зразумела, і ўся гісторыя ВКЛ, якога нібыта і не было. Прэзыдэнт Расеі дэманстратыўна адмаўляецца сустракацца з сваім польскім калегам, дазваляе сабе кпіны ў яго бок. А кіраўнік суседняй дзяржавы, карыстаючыся слэнгам правадыра сацыялістычнай рэвалюцыі, які той ужываў у адносінах да свайго канкурэнта Лява Троцкага, называе Польшчу «палітычнай прастытуткай».

Гэтак некалі Мікіта Хрушчоў стукаў па трыбуне ААН сваім чаравікам, абяцаючы «закапаць» капіталістычны сьвет. Пры гэтым генсек лаяўся ды пагражаў прадстаўніку Гішпаніі, які не спадабаўся савецкаму кіраўніку. Праз яго Хрушчоў як бы апэляваў тады да ЗША ды астатніх заходніх дзяржаў. Кажуць, што трагедыя паўтараецца ў гісторыі ў выглядзе фарсу. А што калі паўтараецца фарс? Сьмяяцца ці плакаць? Калі не пускаюць у Эўропу, адмаўляюцца сустракацца на вышэйшым узроўні, не прызнаюць ня тое што за дэмакратычную — за цывілізаваную дзяржаву, значыць, трэба ўзьняць гістэрыку на самым высокім узроўні і тым самым прыцягнуць увагу да сябе і на Ўсходзе, і на Захадзе? Прымусіць лічыцца з сабой хаця б такой цаной. Абсурд?

## Грошы ад польскага консула

Абвінавачаньні прадстаўнікоў Саюзу палякаў у Беларусі, а таксама польскіх дыпляматаў і ўвогуле Польшчы як дзяржавы ў спробах дэстабілізацыі грамадзтва, расколу краіны, шпіянажы, правакацыях і г.д. сапраўды сёньня гучаць абсурдна.

У паэта Міколы Хведаровіча, якога ў 1937-м абвінавацілі ў шпіянажы на карысьць панскай Польшчы, сьледчы патрабаваў прызнацца ў злачынстве і расказаць, як яно адбывалася. Хведаровіч на допыце вырашыў «расказлоцца»: маўляў, ён сустракаўся з польскім консулам… у сквэрыку ў самым цэнтры Менску, на лавачцы, і той кожнага разу ўручаў яму пэўную суму злотых у абмен на сакрэтную інфармацыю. Паэту здавалася, што сьледчы толькі пасьмяецца з такіх паказаньняў. Але той не зразумеў жарту, і Хведаровіч адседзеў у лягерах амаль 20 гадоў…

Калі прыблізна ў той самы час арыштавалі ксяндза касьцёлу на Залатой Горцы, па Менску папаўзьлі чуткі: ксёндз хаваў у касьцёле золата ды зброю, якія перапраўляліся праз падземны ход проста з польскага консульства. Тады ў гэта верылі. Сёньня беларускі абывацель таксама ахвотна верыць ва ўсё, што гавораць з экранаў тэлебачаньня пра палякаў. Тым, хто ўзгадаваны на расейскай мане, псэўдагісторыі й шавіністычнай папсе, прыемна, калі «гэтых палякаў» ставяць на месца. Тое, што Польшча больш як дзесяць апошніх гадоў давала магчымасьць тысячам беларускіх чаўнакоў зарабіць грошай на дробным гандлі, — ня важна. Важна, што ёсьць тыя, хто за ўсё адказвае, праз каго ўсё кепска. З каго можна спытаць за нявыкананыя абяцаньні. Вядома ж, не з кіраўніцтва Беларусі. Не, да польскіх пагромаў або закрыцьця касьцёлаў, дзякаваць Богу, яшчэ не заклікаюць, але глеба, без таго добра ўгноеная, узмоцнена паліваецца жыжай у дзяржаўных СМІ.

## «Прыйшоў час вайны»

Адна зь дзяржаўных газэт, напрыклад, напісала, што польскі ўрад падрыхтаваў і зьдзейсьніў у Беларусі правакацыю накшталт Гляйвіцкага інцыдэнту, які выкарыстала Нямеччына для разьвязваньня Другой сусьветнай вайны. Газэта, праўда, забылася нагадаць чытачам, што адбылося ў Гляйвіцы на пачатку жніўня 1939 году. Гэта была апэрацыя нямецкіх спэцслужбаў, якія выкарысталі некалькіх крымінальнікаў для нападу на радыёстанцыю, што месьцілася на тагачаснай польска-нямецкай мяжы. Нападнікі былі апранутыя ў польскую вайсковую форму. У этэры прагучаў заклік на польскай мове: «Грамадзяне Польшчы! Прыйшоў час вайны паміж Польшчай і Нямеччынай! Яднайцеся ды забівайце ўсіх немцаў!» Наступным днём Гітлер заявіў, што Польшча напала на нямецкую тэрыторыю і што Нямеччына знаходзіцца ў стане вайны з Польшчай.

Такім чынам, спроба Саюзу палякаў у Беларусі зьмяніць кіраўніцтва шляхам выбараў параўноўваецца з захопам спэцслужбамі радыёстанцыі! Асаблівую пікантнасьць параўнаньню надае той факт, што менавіта Польшча сталася першай ахвярай вайны і што менавіта на яе тэрыторыю ў верасьні 1939 году ўвайшлі нямецкія войскі з Захаду і савецкія часьці з Усходу. У Берасьці за некалькі месяцаў да пачатку вайны паміж СССР і Германіяй адбыўся сумесны парад нямецкіх і савецкіх войскаў. Такая была лінія Сталіна…

Але вернемся ў нашы дні. Арышты некалькіх лідэраў СПБ, высылка польскіх дыпляматаў, дэпартацыя журналістаў, пікеты ля будынку СПБ у Горадні і ля амбасады Беларусі ў Варшаве, трэба разумець, таксама ёсьць сумежнай правакацыяй з мэтай… пачаць вайну паміж Польшчай і Беларусяй? У магчымасьць такога варыянту ня вераць, мабыць, ня толькі ў Варшаве, але, відавочна, і ў Менску. У чым жа сэнс такога сцэнару, напампоўваньня антыпольскай гістэрыі?

## Сон Брэжнева

На гэтае быццам бы рытарычнае пытаньне можна даць два адказы. Першы — гістэрыя патрэбная дзеля самой гістэрыі, бо атмасфэра страху стварае тую самую ілюзію стабільнасьці ў краіне. Гэта стабільнасьць, заснаваная на маўчаньні.

Другі адказ палягае ў тым, што афіцыйны Менск усяго толькі выконвае спэцзаказ Масквы — выпрабоўвае ня толькі Варшаву, але і Эўразьвяз у цэлым на ўменьне «трымаць удар». Надзвычай рэзкая рэакцыя на зьбіцьцё дзяцей расейскіх дыпляматаў у Варшаве хуліганамі гаворыць аб магчымасьці скаардынаванай палітыкі.

Такую вэрсію вылучаюць цяпер большасьць польскіх масмэдыя. Некаторыя зь іх робяць выснову, што ўдару ні Польшча, ні Захад ня вытрымалі, яны сагнуліся ў жаху ад нахабства з боку беларускага кіраўніцтва й цяпер чакаюць цяпер наступных удараў. Іх дэвіз — кепскі мір лепшы за добрую сварку. Аднак для такіх высноў усё-такі, відаць, час яшчэ не насьпеў.

Урэшце, хто і што будзе рабіць там, за Бугам, і тут, у Беларусі — не галоўнае.

Бо справа тычыцца не палякаў. У ролі палякаў заўтра могуць апынуцца літоўцы, латышы, украінцы, чэхі. Справа тычыцца не гісторыі. Узаемадачыненьні беларусаў і палякаў ніколі ня былі, мякка кажучы, бясхмарнымі. Але ж і падымаліся на барацьбу з прыгнятальнікамі яны часьцей за ўсё разам.

Справа тычыцца ня толькі нядаўняга мінулага. Хаця варта памятаць, што сярод тысяч ахвяр Катыні ёсьць, без сумневу, нараджэнцы Беларусі, а ў Курапатах ляжаць і палякі.

Справа тычыцца нас саміх. Ці ёсьць мы ўжо сёньня кімсьці, а ня тым, што з нас хочуць зрабіць, — нейкім фарпостам Масквы на Захадзе, савецкім электаратам ці проста ўгнаеньнем на палях гісторыі? Сёньняшняя рэчаіснасьць не дае падстаў для аптымізму, але часам гісторыя падносіць неспадзяванкі. Хто б мог падумаць у 1980 годзе, што ПНР хутка зьнікне, а сьледам зьнікне й камунізм?

Тады быў папулярны анэкдот. Брэжнеў бачыць жудасны сон. На Краснай плошчы сядзіць чэх, есьць кітайскімі палачкамі габрэйскую мацу й сьпявае «Ешчэ Польска не згінэла…». Іншым разам сны вяртаюцца.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Кіраўнік «Маладога фронту» Зьміцер Дашкевіч быў асуджаны на 10 сутак за пікет салідарнасьці зь беларускімі палякамі. Рэпартаж на старонцы 6.

# Суцэльны штрых з 2006 году

4 жніўня Рада Міністраў нарэшце прыняла пастанову, пра якую даўно гаварылі ў кулюарах. З 1 ліпеня наступнага году ў краіне ўводзіцца абавязковае маркіраваньне тавараў штрыхавымі ідэнтыфікацыйнымі кодамі. Піша **Уладзіслаў Белавусаў**.

Пастанова пашыраецца на ўсе тавары — вытворцамі якіх зьяўляюцца як юрыдычныя асобы, так і індывідуальныя прадпрымальнікі, — на якія могуць быць нанесеныя гэткія коды.

У якасьці прычыны называецца неабходнасьць пашырэньня тавараў нумарацыі ды штрыхавога кадаваньня ў Міжнароднай сыстэме тавараў нумарацыі. Як паведамляецца на сайце Нацыянальнага прававога парталу, у мэтах павышэньня якасьці нанясеньня кодаў на базе Нацыянальнага цэнтру інфармацыйных рэсурсаў ды тэхналёгій Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі да 1 студзеня 2006 году будзе створаны цэнтар вэрыфікацыі міжнародных штрыхавых кодаў. Цэнтар сумесна зь міністэрствамі гандлю й прамысловасьці мусіць да 1 студзеня 2006 году ўнесьці на разгляд Рады Міністраў Беларусі прапановы аб пераходзе на маркіраваньне тавараў з прымяненьнем радыёчастотнай ідэнтыфікацыі прадукцыі (RFID-тэхналёгіі) ды аб арганізацыі навукова-мэтадычнага забесьпячэньня стварэньня аўтаматызаваных інфармацыйных сыстэмаў з выкарыстаньнем гэтых тэхналёгій. Плянуецца таксама стварыць адмысловую арганізацыю, якая б адказвала за тавараў нумарацыю.

Цяжка ўявіць, каб усе беларускія вытворцы бестурботна перайшлі на новую сыстэму на працягу году. Няясны пакуль і мэханізм адсочваньня падробак. Але Асацыяцыі тавараў нумэрацыі да 1 лістапада 2005 году даручана распрацаваць ды распаўсюдзіць сярод гандлёвых арганізацый мэтадычныя рэкамэндацыі па выкарыстаньні тавараў нумароў ды штрыхкадаваньня ў гандлі.

У любым разе, апошняя навацыя радыкальна зьмяняе ўласна панятак дагавору куплі-продажу, бо цяпер штрыхавы ідэнтыфікацыйны код на тавары (прадукцыі) — адна з істотных (!) умоваў дагавору куплі-продажу (пастаўкі) тавараў (прадукцыі). Пастанова пашыраецца як на гуртовы гандаль, так і на гандаль уразДроб.

От жа, паспаліты беларус мусіць хутка навучыцца зважаць ня толькі на тэрмін прыдатнасьці, але й на мудрагелістыя рысачкі. Купляйма штрыхаванае!

# Куды падзеліся шчучынскія дзеці

Дзяржаўныя мас-мэдыя распаўсюдзілі інфармацыю пра польскіх дзяцей са Шчучына, пацярпелых ад канфлікту вакол Саюзу палякаў. (Што дзіўна, колькасьць дзяцей падаюць па-рознаму: спачатку пра 50, «СБ — Беларусь сегодня» ў аўторкавым нумары гаворыць ужо пра «амаль 100».) Маўляў, палякі з гораду Алецка сьпярша запрасілі групу на адпачынак, а потым адмовілі, бо кіраўнік шчучынскай філіі Віктар Богдан падтрымаў Тадэвуша Кручкоўскага (у тым ліку і ў выступе на БТ). Вінаватым ва ўсім назвалі Генэральнае консульства Польшчы ў Горадні: яно, маўляў, ня выдала візы дзецям. Газэта «СБ — Беларусь сегодня» зазначыла з гонарам, што «адпачынак школьнікаў не сапсаваны. Іх з задавальненьнем прыняў дзіцячы аздараўленчы летнік «Купалінка» прадпрыемства «Горадня-Азот».

Кіраўнік гарадзенскай філіі ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Павал Мажэйка ўзяўся праверыць інфармацыю. Што ж аказалася? «Кожнага з бацькоў гэтых дзяцей абзванілі пэрсанальна і афармілі ім візы. Ужо каля тыдня таму яны выехалі ў Польшчу. Што за дзеці цяпер адпачываюць у «Купалінцы»? Ня ведаю. Магчыма, там і ёсьць дзеці этнічных палякаў. Але дакладна, што гэта ня тая група, якая падавала заяўкі на візы ў Польшчу».

Тым часам найбуйнейшая польская арганізацыя «Вспульнота польска», аналяг нашай «Бацькаўшчыны», сапраўды адракласа кантактаў з Шчучынскай філіяй СПБ, бо В.Богдан з уласнай ахвоты выступіў у фільме «Хто замовіў Саюз палякаў», які, на думку «Вспульноты», ня проста антыпольскі, але і адкрыта распальвае нацыянальную варожасьць. Адзін з кіраўнікоў «Польскай садружнасьці» Анджэй Хадкевіч заявіў: «Нельга супрацоўнічаць зь людзьмі, якія супрацоўнічаюць зь беларускім КДБ. Яны бэсьцяць Польшчу і хочуць адначасова накіроўваць у Польшчу дзяцей».

Што да дачкі Віктара Богдана, якую, паводле беларускага амбасадара ў Польшчы Паўла Латушкі, «выкінулі з адной з польскіх ВНУ», дык аказалася, што ёй папросту… не хапіла балаў, каб паступіць у Гданьскі ўнівэрсытэт.

**АШ**

Справу зьнішчэньня помніка дойлідства XVII ст. у Глыбокім можна лічыць вырашанай. Яго напаткаў лёс менскага дому Купалавай сям'і.


УЛАДЗІМЕР СКРАБАТУН

**Усё, што застаецца ад фальварку Радзівілаў.**

# Знайдзіце экспэрта!

Нягледзячы на адчайныя захады славутага тамтэйшага краязнаўца, архітэктара сп.Скрабатуна, спыніць вандалізм ня ўдасца. Справа ўперлася ў бяздушнасьць тых, ад каго дапамога ў справе захаваньня помнікаў была б натуральнаю. Але зварот ва Ўправу аховы спадчыны й рэстаўрацыі Міністэрства культуры аказаўся безвыніковым. Як кажа спадар Скрабатун, там яму прапанавалі спачатку правесьці экспэртызу, а пасьля ўжо біць у званы. «А дзе ж я знайду таго экспэрта ў Глыбокім? Помнік жа трушчаць на вачах!» — гаворыць глыбоцкі краязнавец.

Напэўна, чыноўнікам зь Міністэрства культуры прыносіць асалоду назіраньне за бездапаможнымі высілкамі тых, каму насамрэч справа захаваньня спадчыны баліць. Так, гэты навазноўдзены помнік ня ўнесены ні ў якія сьпісы й рэестры. Як не было ў тых сьпісах дому Купалавай сям'і на вуліцы Румянцава ў Менску, будынку пошты першае паловы XIX стагодзьдзя на вуліцы Кірава ці соцень іншых дамоў па ўсёй Беларусі. Няма тамака й Курапатаў. Значыць, можна зьнішчыць з спакойным сэрцам. І зьнішчаюць. Ужо ў гэтым стагодзьдзі былі зьнішчаны сотні помнікаў нашае старасьвеччыны. Гэтак, у Бялынічах дабілі рэшткі кармэліцкага кляштару й сынагогу, у Слуцку к «Дажынкам» зьнесьлі капітальны будынак былое земскае лякарні, што верна служыў сьлуччакам да апошняга дня.

Будынак, што гэтымі днямі руйнуюць у Глыбокім, насамрэч можа быць адной з пабудоваў фальварку пры замку Радзівілаў, які паўстаў тут у другой палове XVII стагодзьдзя. Інвэнтар яго, складзены ў 1702 годзе, адзначаў і вялікі аднапавярховы палац, і лямус, і флігелі, і стайні, і багата чаго яшчэ… Пазьней, у XIX стагодзьдзі, гэтая сядзіба адышла да тагачасных можнаўладцаў Вітгенштайнаў.

І гэты помнік цяпер нішчаць. Нягледзячы нават на жаданьне тамтэйшага начальства й архітэктараў яго захаваць. Няма дакумэнту, што пацьвярджаў бы яго ахоўны статус. Рэч у тым, што ахоўныя сьпісы на помнікі дойлідства складаліся яшчэ за часамі СССР. Натуральна, што тады ўлады былі зацікаўлены ў мінімізацыі гэтых сьпісаў, каб ня браць сабе на галаву лішні клопат. Бо калі нейкі аб'ект знаходзіўся на балянсе як помнік, то зь ім трэба было нешта рабіць, то бок «ахоўваць дзяржаваю». І таму няўхільна з году ў год тых помнікаў станавілася ўсё меней. Тая практыка ані на каліва не зьмянілася за Лукашэнкам.

Як на цяпер, то, паводле заканадаўства, помнікі ў Беларусі адсартаваныя па трох сьпісах. У найніжэйшым па статусе — помнікі мясцовага значэньня. Сюды якраз аднесьлі, напрыклад, і будынак былое земскае бальніцы, зруйнаванай днямі ў Слуцку. Як бачым, і факт уключэньня аб'ектаў у сьпісы ніякае аховы ім не гарантуе. Так, толькі ў адным Менску былі зьнішчаныя за апошнія дзесяць гадоў дзясяткі помнікаў, часам цэлымі вуліцамі (Замкавая, Дзімітрава) або кварталамі (Камсамольская).

Таму прапанова чынушаў з Управы аховы спадчыны й рэстаўрацыі Міністэрства культуры шукаць экспэртаў выглядае цынічна. Калі па-добраму, яны самі павінны былі зьявіцца ў Глыбокім пасьля першага ж сыгналу.

Аднак жа шукаць экспэртаў усё ж варта. Для будучых судовых працэсаў. Бо хто ж паверыць, што дазволы на зьнішчэньне дому Луцэвічаў на Румянцава ці будынку ў Глыбокім, месца якога куплена бізнэсоўцам з Рыгі, выдаюцца проста так. Як і іншыя дазволы на будаўнічую самадзейнасьць у каштоўных гістарычных месцах.

**Сяргей Харэўскі**

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### «Джэм-банк» падлічыў страты

Нацбанк адмяніў дзейнасьць часовай адміністрацыі ў «Джэм-банку». Праўда, у самім банку гэтым не задаволены: цяпер ліцэнзія «Джэм-банку» значна абмежаваная. Яму не дазволена рабіць практычна ніякіх апэрацый, якія прыносяць прыбытак. Можна толькі абслугоўваць старых кліентаў, не заводзячы новых рахункаў. «Джэм-банк» ацэньвае страты ад апошніх дзеяньняў кантрольных органаў у 42 млрд рублёў.

### Забароненыя грузавікі

Савет Міністраў падоўжыў да 5 траўня 2006 г. дзеяньне павышанай мытнай пошліны на патрыманыя грузавыя аўтамабілі, аўтобусы і прычэпы. Яна дзейнічае ўжо з 23 сакавіка 2003 г. і фактычна зьяўляецца забаронай на імпарт — пошліна складае 50% (але ня менш за 2,2 эўра за 1 см³ аб'ёму рухавіка) мытнага кошту аўтамабіля. Гэтак дзяржава імкнецца падтрымаць айчынных вытворцаў аналягічнай тэхнікі.

### Электрычнасьць з Казахстану

Беларусь пачала вывучаць магчымасьць паставак электраэнэргіі з Казахстану. Электрычнасьць будзе ісьці транзытам праз Расею. Кошт транзыту і самой электраэнэргіі пакуль невядомы. Аб'ём паставак можа скласьці 2,2—2,5 млрд кВт/гадз у год. Апошнім часам таксама досыць актыўна вядзецца прапрацоўка варыянтаў пастаўкі электраэнэргіі з Украіны без патрэбы плаціць за транзыт праз трэцюю краіну.

**АК, АФН**

## ЗАЛАТАЯ СЭРЫЯ



**Францішак Аляхновіч. Выбраныя творы.**

32-я кніга праекту «Беларускі Кнігазбор».

Пытайцеся ў кнігарнях.

# Канфлікт на тартаку

Сумеснае пікетаваньне польскага пасольства «Маладым фронтам» і БРСМ скончылася арыштамі. Пікетаваць у Беларусі можна толькі «за». Піша **Алесь Кудрыцкі.**

Як звычайна, 5 жніўня калёна БРСМ сабралася ў раёне Дому літаратара ды павoлі пачала падымацца на пагорак, кіруючыся да польскай амбасады. Наперадзе разлапіста крочыў хлопец у камуфляжы, трымаючы на плячы бервяно, нібы «стынгер». Аднак гэтым разам шоў пайшло па незацьверджаным сцэнары — месца ля пасольства ўжо было занятае маладафронтаўцамі. Калёна БРСМ спынілася ў нерашучасьці, пазіраючы на натоўп рэпарцёраў і фотакарэспандэнтаў, якія шчыльна атачылі пікетоўшчыкаў.

«Пазыцыя двух ці трох дзясяткаў халуёў рэжыму Лукашэнкі трактуецца як пазыцыя ўсяго беларускага грамадзтва, — заявіў журналістам кіраўнік «Маладога фронту» Зьміцер Дашкевіч. — Няхай улады Польшчы ня лічаць пазыцыю аўтарытарнага кіраўніка беларускай дзяржавы пазыцыяй усяго беларускага народу».

«Ну што стаіце, станавіцеся побач, няхай яны робяць сваю справу, а вы рабіце сваю», — раздражнёна раўкнуў дзядзька-важак, указваючы дзецям з БРСМ пальцам, каб станавіліся побач з маладафронтаўцамі. Тыя безь пярэчаньняў выканалі загад. Праз нейкі час неабазнанае вока ўжо б і не адрозьніла, хто тут з «МФ», хто з БРСМ, — хіба што па мове, на якой былі напісаны плякаты. Спачатку дзьве групы не ўступалі ў кантакт адна з адной, але потым моладзевыя лідэры бээрэсэмаўцаў (сваіх прозьвішчаў яны назваць не пагадзіліся) падышлі да «канкурэнтаў» для «разборкі».

«У нас ёсьць афіцыйны дазвол, а вы што тут робіце? У вас ёсьць дазвол?» — запытаўся хлопец у камуфляжы. «У нас дазвол ёсьць. Маральны», — адказаў Артур Фінькевіч. «Чаму вы да нас прыйшлі? Вы ёсьць у сьпісах?» — не сьціхаў «валадар бервяна». «Вам што, гарвыканкам па прозьвішчах дазваляе сюды прыходзіць? Выказваць сваю думку дазволена беларускаму народу. Ці вы народ беларускі, а мы не народ?» — падключыўся да размовы Зьміцер Дашкевіч, не даючы бээрэсэмаўцам уставіць слова. «Вы прыйшлі, каб разладзіць тут становішча, — зрабіў высноўу камуфляж. — Дэстабілізаваць». «А якія ў вас прэтэнзіі?» — спыталіся ў яго журналісты. «Вы не разумееце. У нас акцыя ня супраць чагосьці, а за мір, — адказаў актывіст БРСМ. — Вы не разумееце, што такое бервяно». — «Але нашто вы яго пілуеце?» — «Гэта ня мы пілуем. Увасабленьне польскай палітыкі — гэта ўвасабленьне пілы».

Праз нейкі час маладафронтаўцаў атачылі амапаўцы і пачалі выцясьняць да аўтобуса. Нязвычныя да такога відовішча бээрэсэмаўцы пагледалі крыху зьніякавела: пару-тройку тых, хто ня ў час адышоў, таксама павялі былі да аўтобуса, але хутка адпусьцілі.

Пасьля таго як ля пасольства застаўся толькі БРСМ, тартак запрацаваў у звычайным рэжыме. Пасьля адпілаваньня чарговага кавалка актывістка БРСМ зачытала з паперкі стандартны «плач па агульным бервяне».

«Я не зусім упэўнены ў тым, ці была гэтая акцыя санкцыянаваная зьверху, так што не магу ахарактарызаваць дзеяньні ўладаў, — сказаў Аляксандар, які, хоць і не зьяўляецца сябрам БРСМ, прыйшоў на пікет з салідарнасьці. — Дзіўна выглядала тое, што арыштавалі менавіта тых маладых людзей, а ўсе астатнія засталіся тут удзельнічаць у акцыі. Мне здаецца, што гэта ня вельмі правільна. Бо павінны быць два пункты гледжаньня на любое пытаньне».

Зьміцеру Дашкевічу ды Артуру Фінькевічу далі па дзесяць сутак арышту за «дробнае хуліганства». Дарэчы, гэта быў не апошні пікет у той дзень. Увечары, калі ўжо ладна сьцямнела, 5 жніўня на Кастрычніцкай плошчы прайшла акцыя салідарнасьці з закрытымі ўладай навучальнымі ўстановамі **(на фота)**. Студэнты паселі на брук, запаліўшы сьвечкі, якія вельмі хутка расьціснуў ботамі АМАП. «Хаўтуры будзеце ў сябе дома спраўляць», — заявілі ахоўнікі парадку, выцiскаючы пікетоўшчыкаў з плошчы.



**5 жніўня на Кастрычніцкай плошчы прайшла акцыя салідарнасьці з закрытымі ўладай навучальнымі ўстановамі. Студэнты паселі на брук, запаліўшы сьвечкі, якія вельмі хутка расьціснуў ботамі АМАП.**

## СЬЦІСЛА

### Звольнілі выкладчыка БДУІР

Выкладчыку Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі й радыёэлектронікі **Юрасю Бачышчу** 20 ліпеня адмовілі ў працягу кантракту. Загадчык катэдры гуманітарных дысцыплін Я.Новік вытлумачыў гэта «кепскімі паводзінамі выкладчыка й нежаданьнем выпраўляцца». Увесну 2004 г. Бачышча адмовіўся браць удзел у рэцэнзаваньні II тому «гісторыі Беларусі» Якава Трашчанка. На палітінфармацыях цытаваў недзяржаўныя выданьні, выступіў у абарону студэнтаў, якіх заганялі галасаваць на рэфэрэндум. У «палітызацыі й ідэалягізацыі навучальнага працэсу» Бачышчу зьвінавацілі, калі ён расказаў пра забойства Пятром I у Полацкім Сафійскім саборы сьвятара ды спаленьне шэрагу беларускіх гарадоў.

### КДБ адказаў у Магілёве...

Магілёўскае абласное ўпраўленьне КДБ 2 жніўня адказала на зварот **грамадзкіх актывістаў**: яны зьвярталі ўвагу праваахоўнікаў на актывізацыю прафашысцкай арганізацыі РНА ў рэгіёне. У адказе КДБ гаворыцца, што зварот «прыняты да ведама».

### ...і паслухаў у Сьветлагорску

2 жніўня ў сьветлагорскі КДБ па тэлефоне выклікалі на размову актывіста ТБМ **Аляксандра Раўценку**. Супрацоўнік КДБ цікавіўся паездкай Раўценкі ў Чэхію ў складзе групы прадстаўнікоў грамадзкіх аб’яднаньняў.

### Машыніст супраць адміністрацыі мэтрапалітэну

Машыніст менскага мэтро **Алег Шчэрба** 3 жніўня падаў пазоў у Маскоўскі суд Менску на адміністрацыю мэтрапалітэну. Ён адпрацаваў у мэтро 22 гады й быў звольнены пасьля таго, як даў сьведчаньні камісіі ў пытаньнях дазнаньня Міжнароднай арганізацыі працы (МАП). Адміністрацыя заяўляе, што Шчэрбу звольнілі, бо той на станцыі адчыніў у вагоне дзьверы не на той бок.

### Польскі супраціў

Старшыня мастоўскага філіялу Саюзу палякаў **Яніна Пянькоўская** 2 жніўня адмовілася падтрымаць Тадэвуша Кручкоўскага і ўзяць удзел у арганізацыі паўторнага VI зьезду. У Горадні 4 жніўня на сход гарадзкога філіялу, дзе меліся выбіраць дэлегатаў на зьезд, удзельнікаў пускалі толькі па адмысловых сьпісах і не дапусьцілі ніводнага журналіста.

4 жніўня старшыню СПБ **Анжаліку Борыс** выклікалі ў Ленінскі РАУС Горадні. Напярэдадні ёй вынесьлі афіцыйнае папярэджаньне ў пракуратуры: яе абвінавацілі, што яна распаўсюджвала няпраўдзівыя зьвесткі пра парушэньне правоў грамадзян польскай нацыянальнасьці, выступала з заклікам не выконваць загадаў супрацоўнікаў міліцыі й заклікала да ўдзелу ў несанкцыянаваных мерапрыемствах.

### Пісальніка засудзілі

Журналіста **Анджэя Пісальніка** 4 жніўня асудзілі на 10 сутак арышту. Яго абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага вулічнага сходу ў Шчучыне 3 ліпеня: тады Саюз палякаў ладзіў там канцэрт. Перад судом Пісальнік трымаў трохдзённую галадоўку ў знак пратэсту супраць незаконнага ўтрыманьня пад вартай да суду.

У гэты ж дзень зранку машыне здымачнай групы польскага тэлебачаньня **«TVP-1»**, што мелася прыехаць на суд, у Горадні прабілі колы.

### Паслы — у палітвязьняў

Пасол Вялікабрытаніі Браян Бэнэт і выканаўца абавязкаў старшыні Офісу АБСЭ Ваграм Абаджан наведалі 4 жніўня **Міхаіла Марыніча**. 5 жніўня яны наведалі **Валер’я Леванеўскага** ў Івацэвічах.

### Гомельская позва

Актывіста АГП **Алеся Карніенку** з Гомелю выклікалі ў міліцыю 4 жніўня. Позва была аформленая не на бланку, безь пячаткі, без указаньня, па якой справе і ў якасьці каго выклікаецца Карніенка. Таму выклік ён праігнараваў.

### Летнік пад Кіевам

Першы беларускі **летнік па правах чалавека** для студэнтаў-юрыстаў пачаў працу 4 жніўня пад Кіевам. Ён меўся адбыцца ў Беларусі ў сярэдзіне ліпеня, але быў сарваны ўладамі.

### Затрымалі маладафронтаўцаў

Каля польскага пасольства ў Менску 5 жніўня амапаўцы затрымалі актывістаў незарэгістраванага «Маладога фронту» **Зьмітра Дашкевіча**, **Артура Фінькевіча**, **Змітра Рапчыка** і непаўнагадовых **Антаніну Вежнявец** і **Настасьсю Палажанку**. Моладзь ладзіла акцыю салідарнасьці з Польшчай і Саюзам палякаў. Дашкевіча й Фінькевіча засудзілі на 10 сутак арышту.

Антыпольскі пікет, зладжаны Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі каля пасольства, адбываецца штодня безь перашкодаў. Актывісты **АГП** 5 жніўня зьвярнуліся ў пракуратуру Партызанскага раёну Менску, каб прыцягнуць актывістаў БРСМ да крымінальнай адказнасьці за распальваньне міжнацыянальнай варожасьці.

### Скрабец сустрэўся з сваякамі

**Сяргея Скрабца** перавялі з каранціну ў СІЗА па вул.Валадарскага й 5 жніўня дазволілі сустрэцца са сваякамі — жонкай і сынам.

### Польскіх журналістаў не пускаюць

6 жніўня ў Горадні затрыманы й выдалены за мяжу польскі фотарэпарцёр **Адам Тухліньскі**: яму на 5 гадоў забаронена прыяжджаць у Беларусь. Тухліньскага затрымалі, калі ён у цягніку ўжо меўся выехаць у Польшчу. Яго абвінавацілі ў працы без акрэдытацыі, хаця ён прыехаў як прыватная асоба й рабіў здымкі ў агульнадаступных месцах.

Журналіста **Марціна Сьмялоўскага** не пусьцілі ў Беларусь, хаця ён меў і візу, і акрэдытацыю.

### Статкевіча вінавацяць у мітынгу

Адміністрацыя спэцкамэндатуры ў Баранавічах палічыла несанкцыянаваным мітынгам сустрэчу, якую зладзілі 29 ліпеня паплечнікі **Міколы Статкевіча** з нагоды ягонага прыезду.

### Геніюш забаранілі

Зэльвенскі райвыканкам не дазволіў адсьвяткаваць 5 жніўня 95-я ўгодкі з дня нараджэньня паэткі **Ларысы Геніюш** і зрабіць прэзэнтацыю кнігі ейных лістоў «Эпісталярная спадчына» ў зэльвенскай школе мастацтваў. Сьвята адбылося пад адкрытым небам 6 жніўня. Сьвята здымалі на відэа людзі ў цывільным.

### Кангрэсу не далі месца

6 жніўня стала вядома, што вялікая частка заявак на арэнду памяшканьня для арганізацыі **Кангрэсу дэмсілаў** не задаволеная: адмовілі 10 выканкамаў з 21 і 17 палацаў культуры з 51. Аргкамітэт абвясьціў збор ахвяраваньняў на яго правядзеньне й не выключае, што Кангрэс пройдзе па-за межамі Беларусі.

### У Барысаве

5 жніўня спынена адміністрацыйная справа супраць 4 удзельнікаў футбольнага **«Кубку Незалежнасьці»**, што адбыўся 30 ліпеня ў Барысаве. Юнакоў затрымалі міліцыянты, калі яны несьлі на турнір бел-чырвона-белыя сьцяжкі для кутніх метак.

### Дэпутаты Эўрапарлямэнту нон-грата

Дэпутатаў Эўрапарлямэнту **Богдана Кліха**, **Барбару Кудрыцку**, **Багуслава Соніка** і віцэ-сьпікера **Яцка Сарыюш-Вольскага** 8 жніўня беларускія памежнікі не пусьцілі на тэрыторыю краіны. Дэпутаты меліся наведаць Горадню й выказаць падтрымку дэмакратычна выбранаму кіраўніцтву Саюзу палякаў.

### Букаса выклікалі ў пракуратуру

Рэдактара «Барысаўскіх навін» **Анатоля Букаса** 8 жніўня выклікалі ў пракуратуру ў сувязі з публікацыяй у газэце артыкулу пра судовы працэс над ім. Букаса вінавацяць у парушэньні арт.5 Закону аб друку, што апублікаваў матэрыялы крымінальнай справы безь пісьмовага дазволу судзьдзі й да разгляду крымінальнай справы.

**АШ**

# Саюз палякаў? — Маёр Кузьміч слухае!

**Працяг са старонкі 1.**

«паколькі зьезд ня выбраў новага кіраўніцтва і гэтую ролю ўзурпавала групоўка на чале з Т.Гавіным, у якую ўваходзіць А.Борыс», Мінюст мусіў распачаць супраць іх дзеяньні і зноўку прызначыць кіраўніком СПБ былога старшыню Т.Кручкоўскага. Карацей, дэлегаты два дні спрачаліся ды разьехаліся безь ніякіх вынікаў…

«Мы не займаемся палітыкай!» — абураюцца сябры СПБ: яны мусяць абвяргаць сьцьверджаньне, якое раней безапэляцыйна прагучала зь дзяржаўных рупараў, — а менавіта што беларускія палякі «займаюцца палітыкай». Яны мусяць аспрэчваць, бо «займацца палітыкай» у гэтай краіне гучыць амаль як прысуд, прынамсі як пракурорскае папярэджаньне. Бо палітыкай, як вынікае, можна займацца дзе хочаш — у Расеі, Польшчы, Украіне — паўсюль навокал, толькі не ў «сінявокай рэспубліцы», якая нібыта зжыла такую загану, пазбылася яе. Тут, маўляў, людзі жывуць шчасьліва, бо не займаюцца палітыкай. Як любіў публічна паўтараць адзін вялікі гарадзенскі начальнік і «сэнатар», у краіне павінен быць толькі адзін палітык, а мы так, мы толькі дапамагаем яму, як можам.

Вось такая фантастычная вэрсія выдаецца за неабвержную праўду. Маўляў, чытачы «лапухі», усё адно нічога не зразумеюць, тым больш апрацоўку іхнюю ў патрэбным кірунку мэтадычна вядзе «артылерыя буйнога калібру» — БТ ды іншыя «беларускія каналы», а таксама ўся моц дзяржаўнай прэсы кінута на дапамогу — пачынаючы ад слаўтэтнай «Советской Белоруссии» ды «Во славу родины» да пагалоўна ўсіх абласных і раённых газэтак. Але гэта, маўляў, ніякая не палітыка, гэта — асьветная работа сродкаў масавай агітацыі і прапаганды (і часам дэзінфармацыі). Карацей, гэта — дзяржаўная работа. Наступным крокам «Głosu» можа стаць… ну ня ведаю, нават сьцьверджаньне, што ніякага зьезду ўвогуле не было, а ўсё прыдумаў Гавін, каб насаліць Кручкоўскаму, а разам зь ім — уладам і спэцслужбам. Ну, а там, можа, недалёка і да такіх высноў: тыя, хто атрымаў адукацыю ў Польшчы, тая ж Борыс, ня могуць не выклікаць падазрэньняў. Вось Кручкоўскі вучыўся ў Маскве — тут усё ў парадку. І далей: тыя, хто езьдзіць у Польшчу, працягваюць «займацца палітыкай», бо, напрыклад, сустракаюцца з тамтэйшымі палітыкамі. А вось Кручкоўскаму ды паплечнікам уезд туды забаронены.



**Беларускія памежнікі не прапусьцілі ў Беларусь дэпутатаў Эўрапарлямэнту, якія хацелі наведаць Саюз палякаў.**

У вядомым францускім фільме «Цудоўны», герой якога ў выкананьні Бэльмандо працуе на «фабрыцы раманаў», ёсьць выдатная сцэна: сьмяротна паранены, скажам так, тэрарыст размаўляе на мове, якую ведае толькі перакладчык, які валодае яшчэ толькі адной мовай, здаецца румынскай. І таму давялося ствараць ланцужок перакладчыкаў, зь якіх кожны ведаў толькі нейкія дзьве мовы. У выніку допыт адбываўся па ланцужку — да параненага, затым назад — да тых, хто яго дапытваў. Наколькі можна было зразумець, вынік — у сэнсе дакладнасьці перакладу — атрымаўся бездакорны.

У выпадку з Саюзам палякаў усё намнога горш, нават фатальна кепска. Каб сустрэцца з выгнанымі са свайго будынку сябрамі Саюзу палякаў, у Горадню прыяжджае вядомы польскі палітык, чалавек з значнай пасадай у парлямэнце суседняй краіны. Размаўляць спакойна яму не даюць, міліцэйскі апэратар літаральна лезе ў твар са сваёй відэакамэрай, навокал шныраць міліцыянты, сустрэча адбываецца на вольным паветры. Госьць гаворыць, што няма гаворкі «ні пра які польска-беларускі канфлікт», а гаворка ідзе пра дзеяньні ўлады, якая не паважае ні правы польскай меншасьці, ні правы ўсіх беларускіх грамадзян, калі яны пачынаюць дамагацца дэмакратычных зьменаў. Варшаўскі палітык гаворыць, што яму вядома: да будынку СПБ прыходзяць таксама беларусы, якія сымпатызуюць палякам, каб быць зь імі разам. Ён зазначае, што стала сустракаецца зь беларускімі апазыцыйнымі палітыкамі, каб лепей ведаць сытуацыю.

І што назаўтра я чытаю ў дзяржаўных рупарах? Літаральна — што прыяжджаў «замежны эмісар», які прагне распаліць «міжнацыянальны канфлікт». І гэта тыя самыя «брахалаўкі», якія вылузваюцца, спрабуючы беларусаў варожа настроіць супраць палякаў і Польшчы ўвогуле. Ну добра, міліцыянты могуць часам быць тупымі, ня ведаць замежных моваў, але заявы такія робяцца з падачы важных дзяржаўных установаў. Вядома, там, як правіла, апроч расейскай, іншых моваў не разумеюць, нават беларускай ведаць ня хочуць, грэбуюць. Брэх і брахня ў адрас Польшчы, калі ставіцца да іх спакайней, пачынаюць фарсам нагадваць колішні «наш адказ Керзану».

Так, усё гэта фарс, але фарс злавесны. Журналіста Саюзу палякаў Анджэя Пісальніка схапілі на вуліцы, з Горадні завезьлі ў Шчучын, пасадзілі за краты, потым павезьлі на суд у Ліду. Маўляў, ён арганізаваў і праўрў сьвята польскай песьні ў Шчучыне, што зьяўляецца несанкцыянаванай акцыяй… У судовай залі было сем міліцыянтаў, зь якіх два маёры. Праўда, тры зь іх прыехалі не каб ахоўваць яго, нібы небясьпечнага злачынцу, а каб сьведчыць супраць яго. Як вядома, наша міліцыя ніколі ня мае іншых сьведкаў супраць арыштаваных, апроч самой сябе. Зразумела, таксама фарс, але такі, да якога за 11 год усе прызвычаіліся.

А ў лідзкім судзе адбылося яшчэ цікавей. «Чым вы можаце даказаць, што А.Пісальнік сапраўды праводзіў сход у Шчучыне каля Польскага дому, куды не пусьцілі сяброў СПБ?» — пытаецца адвакат. Маёр: «Яны вялі размовы, патрабаваньні пэўныя — хай Богдан (дырэктар Дому) прыйдзе растлумачыць». Адвакат: «Якія патрабаваньні выстаўляў сам Пісальнік?» Маёр: «Выклікаць дырэктара, каб растлумачыў». Адвакат: «Ён аддаваў нейкія загады, распаўсюджваў улёткі, выступаў са сцэны?» Маёр: «Не».

Наступны «сьведка» — супрацоўнік крымінальнага вышуку: «Уся размова там была на польскай мове, я фактычна нічога не зразумеў (што датычыць ролі Пісальніка)». Апошні сьведка таксама з крымінальнага вышуку: «Там была вялікая колькасьць грамадзян, напачатку чалавек 15, уся размова была на польскай мове, я польскай мовы не разумею». Судзьдзя: «Па пашпарце вы хто?» — «Паляк». — «А што, польскае тэлебачаньне ў вас ня цягне? Вось вы расьпісаліся, што Пісальнік праводзіў сход і не падпарадкоўваўся». Міліцыянт: «Яны выказвалі нездавальненьне, што Польскі дом зачынены. А Пісальнік пахаджаў па пляцоўцы, падыходзіў да людзей…» Адвакат: «Што такое «арганізацыя масавага мерапрыемства»?» Міліцыянт: «Яны выказвалі нездавальненьне па-расейску — што прыехалі і не пускаюць. Пасьля сыходу Пісальніка людзі размаўлялі паміж сабой з гэтай нагоды…»

Выснова судзьдзі: «А.Пісальнік стаў арганізатарам несанкцыянаванага сходу таму, што прывёз з Горадні ў Шчучын людзей на аўтобусе Саюзу палякаў і сам там знаходзіўся. За гэта яму належацца 10 сутак арышту». Дарэчы, сам А.Пісальнік сказаў у судзе, што часова адсутнічаў, бо зьяжджаў, каб дапамагчы музыку зь мясцовага народнага гурту забраць з хаты баян. Выходзіць, што гэтае прызнаньне таксама было не на карысьць журналіста. Праўда, судзьдзя баян да справы падшываць ня стаў, яму й так хапіла з каптуром «неабвержных доказаў»… «Алё, гэта Саюз палякаў?» — «Так точна! Маёр Кузьміч пры тэлефоне». Як вядома, пасьля захопу АМАПам будынку СПБ у Горадні яго стала ахоўвае міліцыя, людзей усярэдзіну пускае толькі некаторых — паводле нейкага сьпісу — і абавязкова потым замыкае дзьверы на ключ. «Зь Леніным у галаве, з маўзэрам у руцэ»?

# Магілёў праваліўся

Правал глыбінёй 20—30 мэтраў і памерам зь легкавы аўтамабіль адкрыўся пасярэдзіне пешаходнай дарожкі ў цэнтральным сквэры Магілёва ў мінулыя выходныя. Піша **Аляксей Бацюкоў**.

У ноч з суботы на нядзелю каля другой гадзіны па гэтай пешаходнай дарожцы ў магілёўскім сквэры Вілербана якраз гуляла моладзь. Толькі-толькі скончыўся дождж, і раптам адна з лужын правалілася ўніз — так прыгадваюць падзеі сьведкі, якія маглі стаць і ахвярамі. Супрацоўнікі МНС правялі замеры правалу і ўзялі спробы грунту і вады. Глыбінёй ён атрымаўся больш за дваццаць мэтраў — цагліна, кінутая ў дзірку, ляцела чатыры з паловай сэкунды, перш чым хлюпнуць вадой унізе. Як магло выйсьці такое — камэнтары пакуль асьцярожныя. Хутчэй за ўсё, у 50-я гады мінулага стагодзьдзя, калі гэтую частку гораду забудоўвалі цаглянымі дамамі, гэты «калодзеж» проста накрылі дошкамі і прысыпалі зямлёй. Цяпер дошкі згнілі.

Сквэр Вілербана прысьвечаны француcкаму гораду-пабрацiму і месьціцца на скрыжаваньні цэнтральнай магілёўскай вуліцы і пешаходнай зоны. Да гістарычнага цэнтру Магілёва кілямэтра паўтара. Гісторыкі і археолягі — яны дасьледавалі правал ужо ў панядзелак раніцай — заўважылі, што тэрыторыя сквэру забудоўвалася бліжэй да XIX стагодзьдзя драўлянымі дамамі. Цяпер яны сыходзяцца на меркаваньні, што гэта мог быць старажытны калодзеж або каналізацыя. Пра гэта сьведчыць і драўляны зруб, які часткова захаваўся ў грунце пад правалам. У любым выпадку месца правалу пакуль пакінута для дасьледаваньняў навукоўцаў.

Між тым недалёка ад гэтага «калодзежу» спэцыялісты заўважылі яшчэ пару месцаў, дзе заўважна прасела тратуарная пліткa, таму ўвесь сквэр на ўсякі выпадак пакуль закрыты для наведваньня.

# Кансьпіратыўны сход у Слуцку

Хваля выбараў дэлегатаў на кангрэс дэмакратычных сіл дакацілася нарэшце да Слуцку. Навучаныя папярэднімі падзеямі, удзельнікі сходу праводзілі яго ва ўмовах павышанай кансьпірацыі, амаль як партызаны. Больш за паўтары гадзіны заняло перамяшчэньне ад першапачатковага пункту збору да канчатковага, пакуль арганізатары звазілі людзей «на прыроду», правяраючы наяўнасьць хваста.

Не абышлося без кур'ёзнага выпадку. Першая група людзей пасьля нявеліччага блуканьня нарэшце знайшла месца збору. Там ужо былі падрыхтаваны стол і лавы. Неўзабаве зьявілася яшчэ адна легкавушка, але кіроўца, мусіць, не заўважыў месца збору (яно знаходзілася ў высокай траве, амаль у чалавечы рост), пачаў разварочвацца. Каб паказаць месца збору, да машыны пабег хлопец, махаючы рукамі, каб прыцягнуць увагу. А ў гэты час непадалёку ў кустах сядзеў вартавы, перад якім паўстала такая карціна: ад месца збору ад'яжджае машына, а за ёй нехта ганіцца, размахваючы рукамі. Вартавы адразу па мабільніку зьвязаўся з гасьцямі, якія ўжо былі на падыходзе: ня едзьце, тут засада. У хуткім часе разабраліся.

У чаканьні сходу людзі размаўлялі, абмяркоўвалі сваё жыцьцё, прыгадвалі падзеі геройчай мінуўшчыны Случчыны ад Случкага збройнага чыну да спаленьня суду за савецкім часам. Людзі, абмяркоўваючы палітычнае становішча, чакаючы пачатку, стараліся размаўляць менавіта па-беларуску, нават калі ў штодзённым жыцьці беларускім словам не карысталіся. Таму трохі прыкра, што сход вёўся па-расейску. Разнастайнасьць у павальную русіфікацыю ўнесьлі выступы Лябедзькі да Вячоркі, якія свае прамовы прачыталі на цудоўнай беларускай мове. Прычым першы выступаў Лябедзька.

Ня ўсе, хто прысутнічаў, наважыліся зарэгістравацца. У душах людзей пануе страх. З сумам успаміналіся часы, калі БНФ у Слуцку налічваў больш за 100 чалавек. У галасаваньні ўзяло ўдзел 47 чалавек.

Выбралі прадстаўнікоў на кангрэс: адзін ад КХП-БНФ, другі — прадпрымальнік зь вельмі актыўнай жыцьцёвай пазіцыяй. Але, як заўважыу адзін з удзельнікаў сходу, «адна справа прыйсьці на сход, а зусім іншая — хадзіць па кватэрах і зьбіраць подпісы за адзінага дэ вельмі актыўнай…»

**Сяржук Кут, Слуцак**

# Цнатлівая сьціпласьць рок-дыназаўраў



Лявон Вольскі і Юрась Ляўкоў перад войскам. У менскім кафэтэрыі «Рамонак» (цяпер зруйнаваны)

Працяг са старонкі 2.

В.Дзятлікові «падсыпае перцу» шляхам цытаваньня крытычных артыкулаў. У тым ліку таго ж Падбярэскага ранейшага разьліву. Але «перац» выходзіць на вострыя. Калі выкінуць з кніжкі адно мацернае слова, ужытае Сямашкам, «Іх МРОЯ. Іх N.R.M.» можа быць сямейнай чытанкай.

Праўда, восьмы разьдзел, адмыслова прысьвечаны дарослым забавам, завецца «Garelka, drugs & samagon». (Дарэчы, стыльрэдактар у выходных зьвестках не пазначаны. Таму, напэўна, у кніжцы знаходзяцца garelka і samagon замест harelka і samahon, Гародня і Бярэсьце, замест Горадня, Берасьце, «я адчуваў сябе правым» замест «я адчуваў, што маю рацыю», арыгінальная сумесь тарашкевіцы і наркамаўкі, і, урэшце, пастаяннае «загінуўшы» замест «загінулы»). «Пра сэкс спытайце ў майго суседа... А я лепш пра drugs & samagon», — гаворыць аўтар на старонцы 114.

Калі пра drugs «мроеўцаў» сапраўды асабліва няма чаго распавядаць, дык пра алькаголь яны маюць багата прыкольных фрашак. (Напрыклад, як увесь гурт аднойчы патрапіў у выцьвярэзьнік :)), але ў гісторыях фігуруе ў асноўным адзін бубнач Алезіс, дый ён вельмі ашчадна. «Мроеўцы» кажуць, што цьмяна памятаюць акалічнасьці таго, як Алезіс кінуў піць. А гэта ж вялікая драматычная гісторыя, поўная сьмеху і сьлёзаў! Поўныя жарсьцяў гісторыі мае ў сваёй біяграфіі кожны з герояў, але не выносіць на шырокую публіку.

«Гэтая кніга, бадай, першая спроба біяграфіі беларускага гурту... Гэта тое, што ў нас прынята называць легендай», — «сьціпла» (:)) піша Лявон Вольскі ў прадмове да кніжкі.

Легенды сусьветнага року ўжо пры жыцьці раскладаюцца журналюгамі «на атамы». І нікому няма ратунку. Публіка хоча ведаць: хто з кім спаў, хто што калоў, паліў, бухаў... Хто з кім сварыўся, з кім мірыўся. Я ўжо не кажу пра тое, што цікава дазнацца пра бацькоў, пра асяродак дзяцінства, пра першае каханьне (церазь піянэрскі гальштук і ня толькі)...

Але.

«Віця (аўтар гэтае кнігі) — наш добры сябар... Віктар нас добра ведае і нямала з намі паезьдзіў», — піша Вольскі ў прамове.

Віця напісаў добрую, вельмі цёплую кнігу пра сваіх сяброў.

Пісаць пра сяброў шматкроць складаней, бо ты ведаеш пра іх шмат-шмат, у тым ліку прыватнага, інтымнага, таго, што не прынята выстаўляць на публіку. Складанасьць — адшукаць мяжу шчырасьці.

У адным з інтэрвію на выхадзе «Іх МРОЯ. Іх N.R.M.» В.Дзятлікові распавёў, што даваў на вычытку сваім героям ня ўсю кніжку, а толькі пэрсанальныя кавалкі. Маўляў, адзін хоча гаварыць пра такую і такую гісторыю, а іншы ня хоча...

Бяз жартаў, я цудоўна ведаю, наколькі тытанічная гэтая праца — пісаць пра сяброў. «Ай, ну навошта варушыць былое, гэта ж так даўно было!» — «Але ж як бяз гэтага?! Гэта ж вялікі пэрыяд твайго жыцьця». — «Ай, ня трэба... Ну, калі хочаш, пішы сам». — «Не, гэта ты мусіш распавесьці». — «Тады не пішы»...

Ну ня хоча чалавек, вядомы чалавек, займацца эксгібіцыянізмам.

Можа, таму ў кнізе сямігадовы пэрыяд творчасьці «мроеўцаў» у «Новым Небе» пазначаны адно некалькімі няўцямнымі радкамі: «Лявон і Кася на той час ужо даўно жылі ў грамадзянскім шлюбе. Хутка наладзіўся і «творчы саюз» (чамусьці ў двукосьсях. — **СК**) — амаль увесь склад «Мроі» пачаў «падпрацоўваць» (вось тут двукосьсі апраўданыя, бо пачалі яны працаваць з імпэтам) і ў «Новым Небе». Альбо: «Кася толькі адыходзіла ад бардаўскай песьні, шмат эксьпэрымэнтавала з стылямі, інструмэнтамі».

Усе, хто быў у той час побач з «Мрояй» і «Новым Небам», цудоўна ведаюць, што мроеўцы не «падпрацоўвалі», а тварылі экспэрымэнтальнае рознастылёвае рокавае гучаньне «Новага Неба». Гэта маё пэрсанальнае цьверджаньне.

Падобная ці адрозная характарыстыка была б ужо аўтарскім «я» стваральніка кнігі: я бачыў, я чуў, я казаў, я адчуваў, я перекананы... Але аўтара ў кнізе амаль няма. Няма сьвядома. Як няма партрэту «мроеўцаў». А ёсьць супольны аўтапартрэт, які В.Дзятлікові даў магчымасьць стварыць сваім сябрам.

Назва «Іх МРОЯ. Іх N.R.M.» — ключ да разгадкі формы і зьместу кніжкі. Назва тлумачыць, чаму на шырокую публіку не выносяцца жарсныя гісторыі герояў, поўныя інтымных падрабязнасьцяў: каханьня, нянавісьці, эротыкі і бруталу. Пэўна, калі б кніжку пісаў ня «сябар Віця», а проста «журналіст Дзятлікові», ён бы даў назву «Мая Мроя. Мой N.R.M.» альбо «Наша Мроя. Наш N.R.M.».

А цяпер мы чытаем толькі тое, што ашчадзілі самі «мроеўцы». Чаму яны вырашылі рэпрэзэнтаваць «прычасаны» варыянт гісторыі свайго жыцьця і творчасьці? Магчыма, таму, як самі кажуць у кнізе, што ўвесь час былі на грэбні змаганьня: што за часам «Мроі», што цяпер — у энэрмаўскім варыянце. Магчыма, таму, што сёньня падлеткам — галоўнай аўдыторыі гурту — патрэбныя чыстыя і радужныя сымбалі, без «дарослых» замарочак: простыя, узьнёслыя, часам патасныя — як песьні «N.R.M.».



**Севярын Квяткоўскі** — журналіст, працуе на радыё «Свабода».

# Віктар Дзятлікові: Кожная легенда мусіць мець біяграфію



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Зь Віктарам Дзятліковічам, аўтарам кнігі «Іх Мроя. Іх N.R.M.», гутарыць Сяргей Будкін.

**«НН»: Вы вынесьлі ў назву кнігі займеньнік «іх». Чаму не «своя» ці «наша»?**

**Віктар Дзятлікові:** Апавядальнікамі выступаюць самі музыкі. Гэта кніга пра іх уяўленьне пра ўласную творчасьць. Ёсьць аўтарскія моманты, даюць сваю ацэнку тагачасным падзеям і сьведкі станаўленьня і разьвіцьця «Мроі». Але асноўная ўвага нададзена словам Давыдоўскага, Вольскага, Дземідовіча, Ляўкова, Паўлава.

**«НН»: У кнізе ўсё праўда ці ёсьць і выдумка?**

**ВД:** Кніга дакумэнтальная. Галоўнае, што хацелася, гэта аднавіць факты, якія ўжо амаль сьцерліся з памяці. На некаторыя моманты музыкі забыліся, у гэтым выпадку ўратоўвалі газэтныя публікацыі, хатнія архівы.

Габлюючы архівы, знайшоў шмат цікавых здымкаў, якія раней не публікаваліся, чарнавікі песень. У кнізе можна ўбачыць некалькі варыянтаў «Трох чарапах» ці праўкі Алезіса ў песьні «Мітусьня». Уладзя Давыдоўскі пагадзіўся пагаварыць, хоць у свой час сышоў з «Мроі» з скандалам і доўга для яго гэта было балючай тэмай. Расповед сьведкаў — Віктара Сямашкі, Зьмітра Падбярэскага, Віктара Івашкевіча — таксама мае вялікае значэньне. Калі ўжо была напісана кніга, зразумеў, што не стае ўспамінаў некаторых людзей. Напрыклад, Касі Камоцкай. Падчас напісаньня падавалася, што можна абысьціся і бязь іх. Некаторыя самі адмовіліся гутарыць, як гітарыст «Мроі» Венедыкт Конеў-Петушковіч.

**«НН»: Вольскі ня лічыць «N.R.M.» працягам «Мроі», але Вы аб'ядналі гісторыі груп у адной кнізе.**

**ВД:** Але параляляў між дзьвюма камандамі шукаць не намагаўся. Самі музыкі ўпэўнены, што яны гралі ў абсалютна розных гуртах. Таму «N.R.M.» не выконвае песень «Мроі».

**«НН»: Гісторыя «Мроі» нададзена вычарпальна. Але гісторыя «N.R.M.» абрываецца на «Трох чарапахах».**

**ВД:** Не хацелася ператвараць кнігу ў падручнік у найноўшай гісторыі. Пройдзе час, і зноў насьпее патрэба занясьца графаманствам. Перавыданьне чакае свайго часу. Як чакаюць часу кнігі пра творчасьць «Крамы», «Уліса», «Новага неба», наваполацкі рок... Кожная легенда мусіць мець сваю біяграфію.

**«НН»: Вас можна лічыць афіцыйным біёграфам «N.R.M.»?**

**ВД:** Я напісаў пра іх кнігу, бо быў зь імі знаёмы і хацеў аддаць даніну павагі. Іх творчасьць жывіць і натхняе. Я шмат ежджу па сьвеце, і калі ў мяне няма дыску зь іх песьнямі, пачуваюся няўтульна. Песьні Вольскага дапамагаюць знайсьці душэўны балянс і павысіць настрой. І ў знак падзякі я зрабіў гэтую працу.

**Аўтар першай кнігі пра беларускую рок-каманду Віктар Дзятлікові** жыве паміж Менскам і Масквой. Пасьля гісторыі з арыштам Шарамета і Завадзкага (Віктар тады працаваў у іх камандзе) вырашыў зьехаць у Расею. Стаў карэспандэнтам РТР. Аднак сувязі зь Беларусьсю не губляў, рэдагаваў сайт «N.R.M.», зрабіў інтэрнэт-праект «Беларуская Масква». Паўтара году таму задумаў напісаць кнігу пра «Мрою» — «N.R.M.», дзеля чаго неаднойчы езьдзіў у Менск. Апошнія разьдзелы кнігі аўтар пісаў у львоўскім гатэлі падчас памаранчавай рэвалюцыі. Сёе-тое напісалася ў камандзіроўках у Аўганістан, Чачэнію, на Таймыр. Выйшаў аповед ня толькі пра гісторыю гурту, але й кніга пра супярэчлівыя 1980-я і 1990-я — эпоху Мроі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Сьвета насуперак

Выйшаў дэбютнік рок-гурту «Тарпач», пераможцы «Басовішча»-2004.
Піша **Сяргей Будкін.**

Ёсьць такія людзі, якія зацята робяць тое, што ім падабаецца. Насуперак усяму і не зважаючы на перашкоды. Вакалістка групы «Тарпач» Сьвятлана Сугака (на фота) — якраз з такіх. Нават назва групы кажа сама пра сябе. «Мы як той корч, што ляжыць на прыбраным агародзе. Таму і абралі такую назву — невядома адкуль узяліся, ляжым тут насуперак усім правілам», — так тлумачыць выбар назвы Сьвета.

Некалькі год таму яна напісала першыя свае беларускамоўныя песьні — дзеля цікавасьці. Як зайгралі, адчулі, што гэта іхняе.

На першым сваім «Басовішчы» ў іх нешта не заладзілася, і сябры журы маладой каманды нават не заўважылі. Але налета «Тарпач» падрыхтаваўся як след і атрымаў права на запіс альбому — той самы прыз, пра які марыць кожны канкурсант «Басовішча».

«Тарпач» на сцэне трэба бачыць. Нават калі вы не зьяўляецеся прыхільнікам падобнай музыкі, «тарпачоўская» віхура вас усё роўна падхопіць. «Хутчэй! Забяры мяне адсюль, пакуль яшчэ дыхаю я», — запальвае Сьвета, самы экпрэсіўны вакал у нашай рок-музыцы.

У жніўні ў дыскарнях нарэшце зьявіўся дэбютнік гэтай каманды пад назвай «Усё будзе…». З гэтым альбомам выйшла непрыемная гісторыя. Прадстаўнік польскай фірмы, што мелася аплаціць запіс альбому, нечакана зьнік пасьля таго, як усе песьні былі запісаны. Музыкі ўжо пачалі зьбіраць грошы, каб выкупіць уласныя песьні, але тут знайшоўся польскі анёл-заступнік беларускіх музыкаў Ігар Знык. Дзякуючы яму мы можам пачуць першы альбом «Тарпача».




### Корч на агародзе

«Нам шмат чаго не падабаецца ў гэтым сьвеце, — кажа Сьвета, — але мы гэтаму не скарымся». На альбоме ў адной зь песень рэфрэнам гучаць словы «Ўсё будзе дрэнна», але ў апошняй песьні Сьвятлана сьцьвярджае адваротнае. «Усё будзе добра!» — сьпявае яна. «Кожны сам вырашае, як у яго ўсё будзе, у залежнасьці ад таго, ці прыкладае ён якія-небудзь намаганьні. Кожны чалавек, калі будзе намагацца, можа зьмяніць свой лёс і сытуацыю вакол сябе». Сьвятлана называе сябе аптымісткай, бо па-іншаму ў сёньняшніх варунках ня выжыць. Хоць па праслухоўваньні дыску гэтага ня скажаш — надта ўжо жорстка і нярадасна месцамі ён гучыць. Сьвета з гэтым пагаджаецца: «Магчыма, большую частку нашых песень нельга назваць аптымістычнымі, але ўся праграма жыцьцёвая, і там ёсьць надзея, што ня ўсё так безвыходна».

### Сэкс, наркотыкі і палітыка

Сярод асноўных тэм, што гучаць у песьнях, — палітыка. «Не хацела б сьпяваць пра гэта. Але задаюся пытаньнем: «Хто, калі ня я?» Я выказваю сваё стаўленьне да жыцьця, і палітычныя справы таксама не даюць мне спакою. Хацелася б, каб сытуацыя ў краіне нармалізавалася, каб гэтае пытаньне само па сабе адпала. «Наш прэзыдэнт — супэр», — сказала б я са сцэны і сьпявала б пра іншыя рэчы. «Іншыя рэчы» — адносіны паміж людзьмі, сэкс і наркотыкі. Перадапошняе лепшае за апошняе, пра гэта пяецца ў песьні «Шышкі ганджубасу».

Сьвету часта называюць фэміністкай, але яна з гэтым не пагаджаецца: «Шмат чаго мне не падабаецца ў мужчынах, пра што я адкрыта выказваюся, але я не настолькі катэгарычная ў гэтым пытаньні».

### Агрэсіўная на сцэне і мяккая па жыцьці

Сьвета — агрэсіўная на сцэне, але мяккі і ветлівы чалавек па жыцьці. «Агрэсія назапашваецца ў кожнага чалавека, трэба ж яе кудысьці выкідаць: хтосьці забівае, а хтосьці сьпявае. Спадзяюся, слухачы на нашых канцэртах таксама скідваюць сваю энэргію. Часам дзіву даюся, што ўсе жывыя, — так танчаць!»

Яна вучыцца ў пэдунівэрсытэце, будзе выкладаць музыку і харэаграфію ў дзіцячым садку. Хоць і ня надта ўпэўнена, што будзе працаваць па спэцыяльнасьці. Рок-музыка для яе ўсё, хоць знаходзіцца час на працу (тэхрэдактар у «Экспресс-новостях»), скачкі на батуце, вясёлыя кампаніі і размовы ўначы. Яе вабіць Піцер зь яго Нявой, мастамі, дахамі і лёгкім паветрам, але зьбяджаць нікуды не зьбіраецца і хоча тут нарадзіць свайго сына. Іграць тут, праўда, не заўсёды ўдаецца. «Тарпач» часта выступае ў Польшчы, бо ў Менску (а тым больш у іншых гарадах) складана зладзіць выступ. Але Сьвета не наракае: «У нас ёсьць магчымасьць іграць, паказваць свае песьні людзям, даносіць сваю ідэю».

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Усё будзе…

**«Тарпач». — «БМА-груп», 2005**

Яркі прадстаўнік генэрацыі XXI ст., «Тарпач» мае ў сваёй праграме вострасацыяльныя песьні зь бескампрамісным падыходам («Усім ціха»), правакацыйныя («Шышкі ганджубасу»), паранаідальныя («Не ўратуеш»). Цікавасьць выклікае трэк №3 «Радыяцыя» — ня так часта зьвяртаюцца беларускія рокеры да гэтай тэмы. Як для старту — выдатна. Але не знайшоў пакуль «Тарпач» пэрсанальнай музычнай «разынкі». Некаторыя свой фірмовы саўнд знаходзяць адразу (згадайма «Краму», «J-Морс» ці «B:N»), некаторыя б'юцца, але і з другім, і з трэцім альбомам выдаюць шэрую музычную карціну.

Пажадаем «Тарпачу» большай разнастайнасьці і больш старannай працы з вакалам.

Акрамя дзевяці песень, на дыску разьмешчана багата фатаздымкаў групы.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Варабей, Ірына. Там, дзе сэрца маё.** — Менск: Бел. кнігазбор, 2005. — 124 с.

У кнізе сабраны артыкулы, эсэ й аповеды аўтаркі, што ў 1999 г. пакінула Беларусь і пасялілася ў Канадзе. Менавіта ў Таронта, удалечыні ад Беларусі, спн.Ірына стала пісаць па-беларуску. «Былая спартоўка, яна робіцца выдатнай вышывальніцай і стварае мастацкія творы высокага кшталту… напрыклад, партрэт першаярарха БАПЦ уладыкі Мікалая», — напісала ў прадмове да кнігі Вольга Іпатава. У кнізе надрукаваны ўзоры і схемы вышыванак спн.Ірыны.

**Гістарычны альманах.** Т. 10, 2004. — Горадня, 2004. — 256 с.

Том альманаху цалкам складаюць матэрыялы навуковай канфэрэнцыі «Беларуская гістарыяграфія часоў БССР». Канфэрэнцыя была зладжана ў 2004 г. Беларускім гістарычным таварыствам.

**Жавускі, Генрык. Успаміны Сапліцы** / Пер. з пол. і камэнтар М.Кенькі; Прадмова А.Фядуты. — Менск: Лімарыюс, 2006. — 368 с.

Першае поўнае выданьне на беларускай мове вядомага твору пісьменьніка-рамантыка — сучасьніка і сябра Адама Міцкевіча. Кожная старонка аповедаў пана Севярына Сапліцы (Генрыка Жавускага) прасякнута непрыхаваным захапленьнем несьмяротным сармацкім духам даўняй беларуска-літоўскай шляхты.

**Запісы БІНІМ.** №29. — Нью-Ёрк—Менск, 2005. — 260 с.

У чарговым нумары супольнага нью-ёрска-менскага праекту — артыкулы Л.Юрэвіча «Гісторыя заснаваньня Беларускага інстытуту навукі й мастацтва ў дакумэнтах і паведамленьнях» і «Шматгалосы эпісталярыюм», В.Кіпеля «З архіўных тэчак БІНіМу», С.Запрудзкага «Станіслаў Станкевіч як літаратурны крытык», «Трышчан ды Іжота» Ж.Бэдзье ў перакладзе Лявона Галяка.

У разьдзеле «Архіваліі» — «Жыцьцяпіс» пралата Пётры Татарыновіча, апісаньне архіву Н.Арсеньневай, зробленае Я.Запруднікам, ды бібліяграфія перакладаў беларускіх твораў на нямецкую мову, зробленая Гундулай і Ўладзімерам Чапегамі.

**Кісялёў, Генадзь. Жылі-былі клясыкі: Хто напісаў паэмы «Энэіда навыварат» і «Тарас на Парнасе».** — Менск: Беларуская навука, 2005. — 549 с.

Найбольш поўны выклад аргумэнтаў на карысьць вэрсіі аўтарства знакамітых ананімных паэм, выкладзенай дасьледчыкам ужо раней.

**Міндаў, кароль Літовіі, у дакумэнтах і сьведчаньнях** = Mindowe, rex Lithowiae, in litteris et testimoniis / НАН Беларусі, Інстытут гісторыі; Укладаньне, пераклад на беларускую мову, камэнтар Алеся Жлуткі. — Менск: Тэхналёгія, 2005. — 135 с., [16] арк. іл.

**Metriciana: Дасьледаваньні і матэрыялы Мэтрыкі Вялікага Княства Літоўскага.** Том III. — Менск: Athenaeum, 2004. — 298 с.

Выйшаў у сьвет трэці том альманаху «Metriciana», які працягвае запачатkaваную ў 2001 годзе традыцыю навуковага выданьня, прысьвечанага ўнікальнаму корпусу крыніц з гісторыі нашага рэгіёну Эўропы — Мэтрыцы ВКЛ. Сярод адметнасьцяў гэтага тому — працяг беларуска-літоўскай дыскусіі па моўна-гістарычных пытаньнях.

**Орлов, Владимир. Их портрет с обречённым императором.** — Менск: Харвест, 2005. — 496 с.

Кніга пра напалеонаўскую эпоху аўтарства беларускага Арлова, але «іншага». На першых старонках У.Арлоў складае словы павагі свайму цёзку Арлову-палачаніну.

**ADz, АГ**

# Добрая кніга добрых вершаў

На сьвет зьявілася яшчэ адна беларуская кніга. Кніга ў самым сапраўдным сэнсе слова: пульхная, шматколернага друку, у цьвёрдай вокладцы, у арыгінальным мастацкім аздабленьні. І вельмі патрэбная. Патрэбная сотням тысячаў беларускіх дзяцей. Гэта паэтычны зборнік «Побач з намі на Зямлі».

Укладальнік гэтае кнігі, паэт Алег Мінкін, рыхтаваў адмысловую анталёгію беларускае паэзіі для дзяцей цягам апошніх пятнаццаці гадоў. Ідэя прыйшла яму да галавы, калі абедзьве ягоныя дачкі былі зусім маленькімі й паэту Мінкіну бракавала ўласных вершаў, каб пацяшаць іх.



Першыя вынікі Мінкінава зьбіральніцтва друкаваліся ў «Нашай Ніве» 1991—1992 гадоў. З таго часу багата сьцякло вады ў Вяльлі ды Сьвіслачы, але ён ня кінуў сваёй задумы. Анталёгія разрасталася й ахапіла ўрэшце вялізарную колькасьць літаратурнага матэрыялу ад XIX да XXI стагодзьдзя. Тутака ёсьць вершы і клясыкаў, і зусім малавядомых, а часам і невядомых аўтараў.

Мінкін, па-першае, ад пачатку праігнараваў савецкія падыходы ў фармаваньні хрэстаматыяў. Анталёгія пад ягонай рэдакцыяй скіраваная найперш на рэальную практыку выхаваньня дзяцей у жывой беларускай мове. Па-другое, складальнік абмінуў ідэалягічныя забабоны й таму ў выданьне ўключаныя аўтары ня



толькі розных эпохаў, але й розных палітычных поглядаў. Па-трэцяе, сам Мінкін выступае ў новай кнізе й як суаўтар, дадаючы ўласных вершаў там, дзе яму бракуе матэрыялу для поўнае рэалізацыі сваёй канцэпцыі. А менавіта гукапісаньня, прызначанага для моўнае гульні:

У сасьняку, на скразьняку,  
Сядзіць на зломаным суку  
Пануры згорблены пугач  
З маркотнай думкаю пра харч.

«Побач з намі на Зямлі» — гэта першы том анталёгіі для дзяцей «Добрыя вершы». Ён цалкам прысьвечаны беларускім вершам пра зьвяроў і птушак. Наступныя два тамы, каторыя маюць гэтаксама зьявіцца сёлета, будуць прысьвечаныя зьявам прыроды, а таксама самім дзецям.

Гэтае выданьне мае цалкам практычную скіраванасьць. Вершы, што зьмешчаныя ў ім, прызначаныя для латвага запамінаньня й дэкламацыі самімі дзецьмі. Надзвычайнае багацьце лексыкі робіць гэту анталёгію ці ня лепшым у беларускай гісторыі дапаможнікам для навучаньня роднае мове. Зрэшты, сам Мінкін здолеў спраўдзіць плён сваёй працы на практыцы. Назаўсёды застанецца ў памяці ягонае:

З прамоклых зарасьцяў ажыны  
Пасьля абложнае імжы  
Павыпаўзалі на сьцяжыны  
Дасьпехі прасушыць смажы.



Анталёгія Мінкіна — найбольш значная падзея ў жанры літаратуры для дзяцей часоў незалежнае Беларусі. Што праўда, з новае кнігі ў выдатнай аздобе скарыстаюцца цяпер ужо ягоныя ўнукі. Як унукі й дзеці беларусаў трэцяга тысячагодзьдзя па ўсім сьвеце.

**СХ**

Укладальнік кніжкі **Алег Мінкін** нарадзіўся ў 1952 на Хоцімшчыне. Паэт, казачнік і перакладчык. Пераклаў на беларускую мову вершы Цыпрыяна Норвіда, Баляслава Лесьмяна, Леапольда Стафа. Жыве ў Вільні.

**Добрыя вершы.** Беларуская вершаванка–запамінанка для дзяцей. — Менск: «Тэхналёгія», 2005.



### ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

Шаноўнае спадарства!

Стваральнікі і выдаўцы запрашаюць Вас на прэзэнтацыю кнігі «Побач з намі на Зямлі» – першага тому беларускай вершаванкі–запамінанкі «Добрыя вершы», якая адбудзецца **11 жніўня а 16-й гадзіне** ў Музэі гісторыі беларускай літаратуры па вул. Багдановіча, 13. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць праз тэл. 325 24 23 (Марыя Кавальчук), 773 55 17 (Валянціна Трыгубовіч).

# Пасьля імпэрыі

Што такое імпэрыя? Армія, улада, калёніі. А яшчэ — вобразы, кадры й культурніцкія тэхналёгіі. Пра сёлетнія кінаюбілеі, так ці інакш зьвязаныя з шматаблічнай імпэрскай традыцыяй, піша **Андрэй Расінскі**.

### Дакумэнты сучаснай імпэрыі

**У 1905 г.** французкая імпэрыя братоў Патэ знаходзілася ў сваім росквіце. Кінакампанія Эміля і Шарля Патэ мела чатыры студыі ў Парыжы, філію ў Ніцы, аддзяленьні ў Італіі, Нямеччыне, Расеі і ЗША. Праз кіналябараторыі праходзілі мільёны мэтраў плёнкі, а браты забаўлялі ў кінатэатры першымі спробамі каляровага кіно.

Гэта была сапраўдная фабрыка, толькі замест тонаў чыгуну і цэнтнэраў збожжа — забаўляльная інфармацыя. Патэ ўвялі сыстэму пракату: дагэтуль фільмы прадаваліся ў кінатэатры як тканіна — на мэтры.

Браты аплялі зямную кулю сеткай карэспандэнцкіх пунктаў. «Усё бачым, усё ведаем!» — лёзунг першых «тэлевізійных» навінаў. Хранікальныя кінačасопісы Патэ распачыналіся палітычнымі навінамі, працягваліся пажарамі й землятрусамі і завяршаліся спартовымі падзеямі. Дабраліся браты Патэ й да Беларусі, адлюстраваўшы ў кінахроніцы гаспадара лесу — зубра. Аднак самаўпэўненасьць і няўвага да нацыянальных рынкаў загубілі кінакампанію, якая занепала пасьля Першай сусьветнай вайны і ледзь ліпела за кошт хранікальных здымак.

### Зямля паглынула савецкую ўладу

**75 гадоў таму** ўбачыла сьвет карціна, якую называюць антыгуманным шэдэўрам і геніяльнай кінаваражбой, сонечным сьвятам нараджэньня і народнаю мудрасьцю.

«Зямля» ведамага ўкраінца Аляксандра Даўжэнкі мусіла апраўдаць савецкую ўладу, якая з імпэрскаю непасрэднасьцю ўзялася за сялянаў, нявечачы іх калгасамі. Сюжэт карціны банальны: вясковы камсамолец піша нататку ў газэту, якая выкрывае мясцовых кулакоў, ворагі забіваюць яго. Сяляне ў адказ масава ўступаюць у калгас.

Але шалупіньне клясавых канфліктаў паглынаецца ўкраінскай народнай стыхіяй, мудрай плоднасьцю прыроды і паганскім кругазваротам жывога ды неўміручага. Яблыні лашчаць памерлага, круглая, як яблык, зямля, сланечнікі, нараджэньне й сьмерць ідуць разам. Аголеная нявеста зрывае ў шале абразы і суцяшаецца ў абдымках мужчыны, які нагадвае ёй памерлага.

Імпэрыя была спакушаная мацярынскай, плоднай і бясчалавечнай стыхіяй — і гэтага спакушэньня ня вытрымала. Шчасьлівыя жонкі на фасадах супэрмаркету «Цэнтральны» ў Менску —



WWW.MUNDOFREE.COM

адбіткі гэтага спакушэньня.

Фільм Даўжэнкі быў і ўкраінскім нацыяналістычным выклікам, які спарадзіў у 1960-я зусім ужо не савецкае паэтычнае кіно.

### Сьведчаньні імпэрыі духу

Карл Тэадор Дрэер, які жыў у Даніі, да савецкага ладу ставіўся без пашаны. Яшчэ ў карціне «Старонкі з кнігі Сатаны» дасталося СССР, які імкнуўся зьдзейсьніць сваё памкненьні ў Фінляндыі, але беларускім гледачам Дрэер вядомы нямой стужкай «Пакуты Жанны д'Арк», якую можна паглядзець у Музэі беларускага кіно.

Карціна «Слова» — адзін з самых малавядомых (і адзін з самых геніяльных) фільмаў за ўсю гісторыю кіно — убачыла сьвет **50 гадоў таму**.

Сюжэт карціны — цуд, які зьдзяйсьняецца над памерлаю маладой парадзіхай: Слова ажыўляе й дае жыцьцё. Карціна «Слова», што атрымала галоўны прыз кінафэстывалю ў Вэнэцыі, — пробліск звышнатуральнага Валадарства на празрыстай кінастужцы.

Ларс фон Трыер паспрабаваў паўтарыць суворыя высновы Дрэера на свой лад (у фільме «Расьсякаючы хвалі»). Выйшла ня так пераканаўча — але Дрэерава духоўная спадчына жыве, і нават скандальны праект «Догма-95» — у нечым працяг пошукаў. Негалівудзкая праўда паводле жорсткіх правілаў — гэта сучасная імпэрыя маленькай Даніі.

### Пасьля памежнікаў застаўся раманс

Беларуская культура перабывае яшчэ ў палоне іншай імпэрыі, якая ніяк ня сыдзе з арэны. Тэлевізійны фільм «Дзяржаўная мяжа» пачаў ствараца на студыі «Беларусьфільм» у **1980 годзе**. Празь некалькі год разрасліся да шматсэрыйнага, адзначаны дыплёмам КГБ Армянскай ССР і ўхвальнымі водгукамі, фільм сьцьвярджае мяжу ўжо неіснуючай дзяржавы.

Шматсэрыйная «Дзяржаўная мяжа» паказвае перавыхаваных афіцэраў, абавязковых бальшавікоў і правільных прадстаўнікоў народу, але галоўнае ў гэтай карціне — рамансы, якія прарастуць потым плачам сьпевака Аляксандра Малініна. «Гусарскія рулеткі» і песьні пра «Інстытутку — дачку камэргера», якія адразу сталі шлягерамі, — гэта ня стогны «антысавецкага руху», а прадвяшчэньне скону савецкай імпэрыі.

Пасьля краху рэжыму Беларусь ня мае чаго пазычаць з загiблых парэшткаў, бо сёньня мала каго хвалюе абарона савецка-кітайскай мяжы, а песьні — зусім чужыя.

Што засталося пасьля імпэрыі? Зубр, зямля і раманс. Зацёртыя кадры і забытыя тэхнікі. Калі пасьля паганскіх імпэрый застаюцца парэшткі, пасьля духоўных ёсьць надзея і будучыня.

# Беларуская Прага

**АРЦЁМ ЛЯВА**

**У 20-я гады XX стагодзьдзя ў праскіх Вінаградах на Брусэльскай, 1 жыў старшыня Рады БНР Пётра Крэчаўскі.**






**Помнік Францішку Скарыну, усталяваны ў парку дыпляматычнага раёну Прагі Градчаны.**




**Пэрыядычна ў клюбе «Jeleni» ладзяцца вечарыны беларускай культуры.**



**Беларускае пасольства на вуліцы Садкі.**



**Будынак радыё «Свабода». Разам зь беларускай радыё вяшчае яшчэ на 30 мовах.**




**Шыльда, усталяваная на муры галоўнай праскай бібліятэкі Клемэнцінум у гонар 480-годзьдзя выданьня Бібліі Скарынам.**




**Вэнцыгава, 4 — будынак, у якім у 1920-х гадах месьціліся Беларуская Рада, а таксама рэдакцыя выданьня «Беларускі студэнт».**

# Дрэвапад

68 раздушаных аўтамабіляў у адным Менску! Безь сьвятла сядзела чвэрць краіны. Але па загадзе прэзыдэнта ўраган будзе канчаткова перапаможаны да вечару чацьвярга.
Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага**.

Сьвятло электрычнай лямпачкі набыло чырванаватае адценьне, сьцямнела і ўрэшце згасла. Чорныя абрысы навакольных шматпавярховак ледзь праступілі на тле неба, па якім, нібы звар'яцелыя, несьліся нізкія хмары. Раптам праз выцьцё ветру данёсься рыпучы гук — адно з дрэваў хруснула і пачало імкліва хіліцца да зямлі, скрыгочучы галінамі аб бальконы. Запішчэлі тармазы машыны, якой яно загарадзіла дарогу. Гэткую карціну можна было назіраць у двары аднаго з дамоў па вуліцы Пуліхава. Штосьці падобнае адбывалася па ўсім Менску, па ўсёй краіне.

«Можа, рэвалюцыя пачалася?» — міжволі думалася пры выглядзе адключаных тэлеканалаў. У дадатак да гэтага, у радыёпрымачы дзеля перашкодаў упэўнена лавілася адно «Аўтарадыё», па якім цэлы вечар упарта круцілі «N.R.M.». Аднак «радыёкропка», якая, як вядома, не залежыць ад ніякіх катаклізмаў уключна зь перабоямі з электрычнасьцю, упэўнена вяшчала пра штармавое папярэджаньне.

У ноч з аўторка на сераду «адрубіла» палову Менску, а таксама 4 тысячы гарадоў, мястэчкаў ды вёсак па ўсёй Беларусі. Безь сьвятла сядзела чвэрць краіны. Цікава, што вокны ў «дэпутацкім» доме на вуліцы Лодачнай запаліліся нашмат раней за навакольныя дамы, а падача сьвятла ў Літоўскае пасольства не перапынялася нават тады, калі вуліца Захарава патанала ў цемры.

Раніцай у сераду Менск выглядаў, нібы пасьля шабасу вядзьмарак. Двары заваленыя дрэвамі і засыпаныя вецьцем. Дарогі — таксама відовішча не для слабых на нэрвы. На Партызанскім праспэкце кіроўца «гольфу» ня справіўся з кіраваньнем, выляцеў на ўзбочыну ды проста расьцісну ўся ў дрэва. На вуліцы Казлова зялёны «БМВ» разламаў ліпу, як запалку, напалам. Міліцыянт і ўладальнік машыны складаюць пратакол: аўто скралі ды ганялі па горадзе, пакуль стыхія ня ўнесла сваіх карэктываў у маршрут згоншчыкаў.

У гэтую ноч ня шэнціла ня толькі аўтамабілістам, але і тым, хто прынцыпова не сядае за руль. У аэрапорце затрымалі вылеты рэйсаў на Варшаву ды Парыж. Што да цягнікоў, дык дрэвы падалі паўсюль, і саставы затрымлівалі ва ўсіх кірунках, найчасьцей — на маскоўскім. Чатыры кліенты фірмы «Тусон-Вояж» з прычыны ўрагану патрапяць у Эгіпет з спазьненьнем, калі, вядома, іхны адпачынак увогуле не сарвецца. Справа ў тым, што яны набылі авіябілеты на вылет у Шарм-эль-Шэйх з Масквы, але цягнік выправіўся ў шлях нашмат пазьней. «Ня думайце, што мы ў носе калупаемся, — адказалі «НН» у кампаніі «Тусон-Вояж». — Мы ўжо тэлефанавалі генэральнаму дырэктару расейскай авіякампаніі «ВІМ-Авія» з просьбай адкласьці вылет. Але гэта зробяць толькі тады, калі будзе хаця б 10 чалавек, якія спазьніліся». Супрацоўнікі фірмы абтэлефаноўваюць калегаў, шукаючы іншых турыстаў, якія трапіліся ў такую ж сытуацыю, каб наскрэсьці тых 10 чалавек. Калі кліенты фірмы не пасьпеюць на вылет, дык мусяць за свае грошы набываць квіткі на самалёт да Эгіпту — расейская кампанія, якая прадае тыя туры, патрабуе ад кліентаў «штраф» у памеры 100% кошту нескарыстанай пуцёўкі. Але ж і вылецець у Эгіпет саматугам складана: усе білеты на бліжэйшыя дні прададзеныя.

Якой лёгікай карыстаецца вецер, сказаць цяжка. Шмат дрэваў паваліла ў дварах, а ў парку Горкага выдзертыя зь зямлі камлі не адразу й адшукаеш.

Паводле афіцыйных зьвестак, у краіне разбураныя 50 дамоў, пашкоджаныя каля 200 трансфарматарных падстанцыяў і больш за 500 км лініяў электраперадачы. У населеных пунктах упала ня менш за 1500 вялікіх дрэваў. Самы трагічны выпадак здарыўся каля вёскі Краснапольле на Расоншчыне: апоўначы там забіла сасною грамадзяніна Расеі, які хаваўся ў намёце.

Прэзыдэнт паставіў задачу справіцца з наступствамі стыхіі ўжо да вечару ў чацьвер. Працы па расчыстцы завалаў зьбольшага пачаліся, але асаблівага аўралу не назіраецца. Апэратыўна камунальныя службы пашчыравалі ў раёне вуліцы Якубоўскага, дзе кампактна пражываюць людзі з паслабленым зрокам, для якіх паваленыя дрэвы складаюць сур'ёзную перашкоду на звыклым шляху на працу. Рэзаць паваленыя дрэвы там скончылі ўжо ў сераду з раніцы. А вось дрэва, якое павалілася на Рэспубліканскую пэдагагічную бібліятэку, выбіўшы некалькі шыбаў, уранку прыбіраць ніхто не сьпяшаўся.

«Ніводзін чалавек у гэтыя дні не павінен сказаць, што ён ня будзе рабіць тую ці іншую працу», — заявіў Аляксандар Лукашэнка. Між тым, раніцай у сераду БРСМаўцы-пікетоўшчыкі ля польскага пасольства, як заўсёды, пілавалі нікому не патрэбнае бервяно, у той час як навокал ляжалі паваленыя дрэвы, якія ніхто не прыбіраў. Нейк не па-цімураўску выйшла.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На вуліцы Казлова зялёны «БМВ» разламаў ліпу, як запалку.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Сарваны ветрам білборд на праспэкце Машэрава.

# У калысцы Фарэнгейта

*Там, быццам мачты дзівоснага карабля,акрэсьліліся званіцы, сьпічастыя дахі,вежы, акрэсьліўся горад — які я шукаю па ўсёй зямлі, горад, што выплыў зь людзкой надзеі…*
*Алесь Разанаў, «Вандроўны горад»*

Гданьск — гэта горад-музэй, у якім цяжка не ператварыцца ў экспанат. Гданьск — горад-фотамадэль. Але таксама места, дзе можна ўсмак пакаштаваць «рдзэнна польскего» ладу жыцьця. Нататкі **Анатоля Івашчанкі з падарожжа ў Труймяста.**



WWW.BAKGRUNDSBILDER.SE

«Што незвычайнага ў сьценах гэтага гораду, якая таемная сіла, што кожны візыт у Гданьск пакідае ў нас надоўга непазбыўныя пачуцьці і мы марым вярнуцца сюды і пабыць яшчэ нямнога?» Цалкам у адпаведнасьці са словамі з падарожнага даведніка па Гданьску, пасьля таго як я трапіў аднойчы на тры гадзіны ў старажытную сталіцу Паморскага ваяводзтва Польшчы, моцна карцела спазнаць яе бліжэй. Сёлета ўдалося прабавіць тут тыдзень.

## Фэст

Да гораду мы ехалі не наўпрост — паводле турыстычных мапаў, адлегласьць ад Менску да Гданьску 760 км, — а з заездам у Беласток. Прычына кола ў тым, што час нашае выправы супадаў з другім днём фэсту «Басовішча». На «Басовішчы» ж, у Гарадку, мы спаткаліся зь мясцовым беларусам — спадаром В., які гасьцінна прытуліў у сябе на ноч.

Мая жонка, якая дагэтуль ня бачыла такое колькасьці беларускамоўных людзей і беларускіх сьцягаў у адным лесе, уражвалася: «Дзеля таго каб адчуць сябе беларусамі, ім трэба выяжджаць за мяжу».

Шыкоўны гук відовішча азмрочыўся хіба што асобнымі прамоўцамі — як з маладых каманд, так і мэтраў, — калі паміж песьнямі зь іх не заўжды цьвярозых вуснаў хоцькі-няхоцькі зрывалася расейская лексыка. Часам лепш сьпяваць, чым прамаўляць.

За дзьве гадзіны ночы, пераступаючы ў цемры цераз нерухомыя целы палеглых у лесе суайчыньнікаў, прабіраемся да аўто. «Гэта ўжо «Бясовішча», — заўважае нехта. Гэтак жа асьцярожна абмінаем пастку дарожнае паліцыі, якая, паводле слоў нашага дабрадзея, на памежнай тэрыторыі выконвае пляны «з дапамогай» машын зь беларускімі нумарамі.



**Анатоль Івашчанка** — сакратар Саюзу пісьменьнікаў.

Ва ўтульнай беластоцкай кухні пад пляшку «Крамбамбулі» гамонім з гаспадаром пра літаратуру і лёс дыяспары. «На думку палякаў, нас тут быць не павінна», — з сумам падсумоўвае спадар В.

## «Кантар», або Своечасова здавайце валюту

Пры пад’езьдзе да Гданьску выявілася, што ў гатэлі і на аўтазапраўках адмаўляюцца абслугоўваць за эўра ці даляры (40 літраў гарадзенскага 92-га аказаліся ня вечнымі — далей трэба было заліваца «эўрапалівам», даражэйшым на 50 цэнтаў за літар). На пытаньне, дзе тут найбліжэйшы абменьнік — «кантар», — пачулі лянанічнае: у дворцы. Гэта ня значыць — у суседнім дворыку. Па-польску «дворэц» — гэта вакзал. Там месьцяцца прывакзальныя касы, «Макдональдз», адзіная дзяжурная аптэка (у такі «позьні» час цэны ў ёй падскокваюць адсоткаў на 30) і адзіны ж кантар, што працуе ўвечары. Здавалася неспасьцігальным, чаму ў паўмільённым горадзе «кантары», як і большасьць крамаў (апроч алькагольных), працуюць да 17-й гадзіны ў суботы і да 19-й у працоўныя дні. Але нашто эўрапейцу тыя кантары, калі ёсьць кругласутачныя банкаматы? І ці дасьць ён веры, што ў адной суседняй краіне набыццё аўто і кватэр дагэтуль адбываецца за наяўныя?

Сёй-той задасца пытаньнем: як гэта які-небудзь прыватнік не дацяміць адчыніць начны «кантар» альбо харчовую краму? Але тое наўрад ці мажліва, бо яно будзе сур’ёзным парушэньнем польскага *ладу жыцьця*.

## Лад жыцьця

Яму падпарадкоўваюцца ўсё і ўсе, рыхтык націскі на перадапошні склад у польскай. Ад яго павявае здаровай патрыярхальнасьцю: палякі рана ўстаюць і рана кладуцца, іх дамкі па-хобіцку дагледжаныя, іх дворыкі стракацяць кветкамі і ўсімі магчымымі бусьлікамі, млынкамі, фантанчыкамі і да т.п. Вечарамі жанчыны вышываюць крыжыкам, а мужчыны вырашаюць за куфлем глябальныя праблемы.

Уікэнды — «ад прыбіральшчыцы да банкаўскага службоўца» — ашчаджаюцца выключна на сябе і на свой адпачынак (ясна, не на градках). У выходныя нясьпешныя калёны машын з роварамі ці дошкамі для сэрфінгу на дахах цягнуцца да «можа» ці «гураў».

Урэшце вобраз паляка супаў з маім стэрэатыпным уяўленьнем пра ангельцаў. Ці гэта рысы ўсялякага «абывацельскага» грамадзтва? І як сымбаль гэтаму — грандыёзны сьметнік амаль у цэнтры Гданьску…

Але, перапрашаю, я захапіўся. Здаўшы-такі валюту, мы выправіліся на пошукі жытла. Даволі хутка высьветлілася, што жаданы «агратурызм» нам ня сьвеціць. Гаспадары сымпатычных хатак, на якія мы разьлічвалі (так-так, з бусьлікамі і млынкамі), пакрыўджана скіроўвалі нас да шматпавярховікаў з шыльдамі «танныя начлегі»: маўляў, у нас пакоі ніхто не здае. У такім гатэлі (непадалёк ад порту й гарадзкое звалкі) з графіці на сьцяне «Польшча для палякаў» мы й спыніліся. Зранку нас чакала першая выправа ў Горад.

## Горад

Гданьск — гэта горад-музэй, у якім цяжка не ператварыцца ў экспанат. У ім зблытваюцца ўсе стылі да такой ступені, што гэта ўжо няможна назваць эклектыкай. Непадрыхтаваны будзе загіпнатызаваны, працяты готыкай, сьціснуты ў абдоймах рэнэсансавымі камяніцамі й раструшчаны дахоўкавым ракако. Гданьск гіпнатызуе, заклікаючы да «зьдзяйсьненьня нематываваных актаў хараства» (БГ).

Гданьск — горад-фотамадэль. Індзейцы ўпэўненыя, што кожнае фота адбірае ў чалавека кавалак душы. Зафотканае места траціць сваю самасьць. Мастакі, што вымалёўваюць яго па частках, сьціраюць яго сапраўдныя рысы, размываюць яго аблічча…

Няма сэнсу пераказваць гісторыю тысячагадовага Гданьску. Словаў з падарожнага даведніка пра шматпакутны і слаўны горад будзе замала. Гораду, які пабыў і Гданьскам, і Данчыгам, і зьведаў першыя атакі Другой сусьветнай з далейшым вызваленьнем-рабаваньнем Саветаў, і быў калыскай Фарэнгейта і Шапэнгаўэра, насамрэч не патрэбен ніякі «гістарычны кантэкст». Ён стаіць як помнік сваім жыхарам, якія заўжды былі яго закладнікамі.

## Месьцічы

Мусіць, як і месьцічы ўсіх гарадоў-музэяў, жыхары Гданьску падчас несупынных вакацыйных сьвятаў («ярмаркаў») імкнуцца зьехаць з гораду. Мясцовы тыднёвік «Echo miasta. Tryjmiasto» (Гданьск разам з суседнімі прыморскімі Гдыняй і Сопатам утвараюць адзіны канглямэрат «Tryjmiasto», «Трыгарад») загадзя папярэджвае пра перакрытыя вуліцы і мажлівасьці аб’ездаў. Тут жа прыводзіцца статыстыка — «Кірмаш у лічбах»: 3500 выканаўцаў было задзейнічана цягам трох апошніх тыдняў, падрыхтавана 500 конкурсаў для дзяцей, 150 фолькавых ці рокавых канцэртаў, 2,7 млн чалавек наведалі гданьскія сьвяты летась…

> На польскіх дарогах ня можаш прызвычаіцца да таго, што варта паказаць паварот, як табе адразу саступаюць.

Калі ўцячы не ўдаецца, сталыя месьцічы пахмурна жлукцяць піва ў засені шматлікіх сквэраў Труймяста. Маладзёны скейтбордамі, роварамі й ролікамі выпрабоўваюць трываласьць бардзюраў. Альбо расьпісваюцца графіці на старажытных сьценах. Шмат разоў даводзілася чуць ад мірнага выгляду дзяўчат расейскую лаянкавую лексыку. Ніякавата паціскаюць плячыма, калі, крый божа, няправільна ставіш націск у слове. Гандляры, прымаючы нас то за чэхаў, то за расейцаў, на наша «дзякуй» адказваюць «спасіба».

На Каралеўскім тракце — галоўнай вуліцы гораду, што лучыць Зялёную і Залатую брамы, — безьліч папрашаек. Тынэйджэрка просіць грошай на экспэдыцыю ў Гімалаі, сталая кабета — для «хворых гданьскіх дзяцей», абшморганы дуэт зацягвае тэнарамбасам «Очи черные»… Першага папрашайку ў Польшчы мы сустрэлі ў Грудку, на «Басовішчы». Хлопец гадоў 18 артыстычна канькаў на піва «для беднага панка». Убачыўшы на каўнеры бел-чырвона-белы значок, ён зароў: «Здушым дыктатуру!»

## Пра дыктатуру

Першыя тры дні нашае вандроўкі ўсе радыёнавіны пачынаюцца з асьвятленьня дыпляматычнага скандалу. Як другасныя ідуць паведамленьні пра забастоўку гарнякоў і адтэрміноўку старту шатла «Дыскавэры». З рэпартажаў даведваемся пра 12-хвілінны сюжэт па БТ пра «шпегаў-дыпляматаў». Польскія аналітыкі разьбіраюць артыкул у «Советской Белоруссии». Гучаць фразы накшталт «апошні дыктатар Эўропы», «антыдэмакратычны рэжым» і да т.п.

Да нашых, яшчэ бел-чырвона-белых, нумароў — невыказны інтарэс: некалькі разоў са спадарожных машын нам прывітальна выкідаюць «victory».

## Польскія дарогі

Яны, як выявілася, бываюць ня толькі добрыя. А часам — і вельмі нядобрыя. Што праўда, акрамя асфальтавага, іншага пакрыцьця не сустракаў.

Міт і тое, што для падарожжа па Польшчы ня трэба мапаў. Указальнікаў сапраўды да халеры, але праз тое й нявыкрутка: яны паказваюць не аптымальныя, а ўсе мажлівыя шляхі. Найлепш зьвярацца з нумарам шашы і зь месьцічамі (каб хоць два ўказалі адзін напрамак — яны таксама могуць блытацца ў паказаньнях). Ні ў якім разе нельга збочваць з буйных магістраляў. Тое, што на мапе выглядае як нармальная і карацейшая дарога, насамрэч можа аказацца сэрпанціністай вузкакалейкай.

За ўвесь час бачыў адно дробнае дарожнае здарэньне. Было тое выходным днём у велізарным заторы на Варшаўскай трасе. Палякі кажуць, што мінімум парушэньняў на іх дарогах вынікае зь велізарных сумаў штрафаў (напрыклад, за няправільны паварот плаціцьмеш 250 злотых — каля 75 даляраў). Адпаведна — кіроўцы не «эканомяць» на сыгналах павароту й блізкім сьвятле. На польскіх дарогах сьпярша ня можаш прызвычаіцца да таго, што варта паказаць паварот, як табе адразу саступаюць. А па вяртаньні пэўны час мусіш звыкацца з нашай «добразычлівай атмасфэрай».

## Дым Айчыны

Да Кузьніцкае мытні пад’яжджаем апоўначы пад беларускамоўны кавэр на матыў песьні «Лёнданскі дождж», што трансьлююць па радыё «Беласток». Санлівыя мытнікі амаль без нагляду прапускаюць уцекачоў з «абывацельскага грамадзтва». Расчыніўшы форткі, расчулена ўдыхаем салодкі дым гарадзенскіх заводаў. Ды ну яе, снобскую й прадказальную Эўропу!..

На чэзла асьветленай аўтазапраўцы, чакаючы хвілін зь дзесяць касірку («Што, чэлавек у туалет сходзіць не можэт?»), назіраю, як чатыры пацаны пад заахвочвальны дзявочы візгат мяцеляць нейкага таксіста. Вэлкам хоўм.

# Дзе пахаваны наш першы сьвяты


ІЛЮСТРАЦЫЯ СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Торвальд Вандроўнік быў першым хрысьціянскім місіянэрам у Беларусі. Магчыма, гэта ён адпяваў Рагнеду і Ізяслава. «Там ён пахаваны ў адной гары каля Полацку, і называюць палачане яго сьвятым», — пішуць сагі. Магіла сьвятога — у Полацку на Востраве? Піша Алесь Аркуш.

Прачынаюся. Нават з заплюшчанымі вачыма адчуваецца, што раніца лагодная. Узыход ліпеньскага сонца ў такія хвіліны можна адчуць — асабліва ў зацішным кутку ў драўляным прыватным доме. Калясьніца Ярылы на крутым пад'ёме нябеснага шляху грукоча як мае быць. Прыслухаешся і выразна чуеш адмысловы гуд — гэтак жа дае аб сабе знаць далёкая аўтастрада.

Устаю з ложка і іду да акна. З другога паверху можна гадзінамі глядзець на прыдзьвінскі краявід. Паверхня магутнай ракі гладкая, і ты проста фізічна адчуваеш тую волатаўскую моц, зь якой яна коціць у Балтыку свае воды. У ёй адбіваецца глыбокі блакіт неба, цені кірляў, якія нястомна кружляюць у насычаным сонечнымі прамянямі паветры, і дрэвы закінутага парку на супрацьлеглым беразе. Адтуль у мой сад прылятаюць уначы совы.

На старажытных мапах Полацку супрацьлеглы бераг пазначаўся як Востраў. Тут у даўнія часы знаходзіўся манастыр Іаана Прадцечы (Хрысьціцеля). Водны рукаў, што агінаў Востраў з паўднёвага боку, колькі стагодзьдзяў таму занесла пяском. Абарончае значэньне прыроднай фартыфікацыйнай перашкоды зьнікла яшчэ ў сярэднявеччы, ніхто і не падтрымліваў яе ў спраўным стане. Вядомы археоляг Сяргей Тарасаў, аўтар кнігі «Полацак IX—XVII. Гісторыя і тапаграфія», сьцьвярджае, што Востраў па-ранейшаму застаецца самай маладасьледаванай археолягамі тэрыторыяй гораду.

Раным-рана тысячу гадоў таму на супрацьлеглым беразе ракі прачынаўся легендарны Торвальд Вандроўнік. Ён любаваўся тымі ж краявідамі — хуткабежнымі водамі Дзьвіны, нястомнымі кірлямі над ракой, блакітам неба. Торвальд быў стары і мудры. Ён вырашыў застацца тут і адысьці ў лепшы сьвет менавіта тут, на Полаччыне. Ён палюбіў гэтых людзей, якім прынёс веды пра сьвет і хрысьціянскую веру, распаведы пра міласьцівага Госпада і таямніцы сьвету.

Ісьляндзкі місіянэр бачыў безьліч розных краявідаў — роднае ісьляндзкае акіянічнае ўзьбярэжжа, фіёрды Скандынаўскай паўвыспы, Ерусалім і Канстантынопаль, стэпы Падняпроўя. Але абраў Полацак.

Старажытная скандынаўская «Сага пра Хрост» апавядае: «Торвальд памёр у Русі непадалёка ад Палтэск'і (Полацку). Там ён пахаваны ў адной гары ў царкве Яна Хрысьціцеля, і называюць палачане яго сьвятым».

Торвальд — наш першы сьвяты? Супольны, да падзелу на праваслаўных і каталікоў.

Месца пахаваньня Торвальда Вандроўніка застаецца загадкай для гісторыкаў.

Некаторыя гісторыкі трымаюцца вэрсіі, што Торвальд жыў і быў пахаваны ля ракі Друя (Дроўны): так напісана ў скандынаўскай сазе. Але цяжка ўявіць, каб у тыя даўнія часы хрысьціянскі місіянэр мог пасяліцца, ды яшчэ збудаваць царкву, у такіх паганскіх нетрах. Торвальд мог весьці місіянэрскую дзейнасьць на Падзьвіньні толькі з дазволу полацкага князя Ізяслава і пад яго асабістай апекай. Магчыма, Ізяслаў з Рагнедай, каб распачаць хрысьціянізацыю Полацкага краю, зьвярнуліся да бізантыйскага імпэратара па дапамогу, а той і паслаў у Полацак Торвальда або некалькі місіянэраў на чале з Торвальдам, якія заснавалі ў крыўскай сталіцы манастыр.

Лепшага месца, чым Востраў, для пасяленьня Торвальда ў ваколіцах Полацку няма. Сяліць хрысьціянскага місіянэра нават на Гарадзішчы, побач з княжацкімі палатамі, было небясьпечна. Усё магло здарыцца — не дапільнуешся. А вось на Востраве, пры невялікай ахове, можна было больш-менш спакойна жыць і будаваць манастыр. Побач з манастыром, магчыма, і быў пахаваны адзін зь першых сьвятых нашай зямлі — Торвальд Вандроўнік. Калі нават ад яго магільнага кургану не засталося і знаку, дык усё адно парэшткі Торвальда ляжаць у зямлі Вострава. Там і трэба будаваць капліцу-пахавальню. Засталося толькі знайсьці месца, дзе стаяў манастыр Іаана Прадцечы. Кажуць, месца пахаваньня сьвятога часам можа зьзяць…

Пайшлі з жыцьця гэтыя неканізаваныя — пакуль — сьвятыя беларускай зямлі амаль адначасова: Рагнеда — у 1000 годзе, Ізяслаў — у 1001, Торвальд — у 1002. Напэўна, Торвальд адпяваў Рагнеду і Ізяслава. І ці не пахаваны Торвальд і Ізяслаў побач?

### Крывіцка-скандынаўскія сувязі

1. **Біскупства ў XI ст.** у швэдзкай Сыгтуне ўладыкі Асмунда, які да гэтага быў арцыбіскупам Полацку.
2. **Знаходкі ў Швэцыі** крыжоў старабеларускай вытворчасьці і велікодных гліняных яек з Палесься.
3. **Шанаваньне праваслаўнай царквой Беларусі** двух скандынаўскіх сьвятых Кнута і Магнуса, невядомых расейскай царкве.
4. **Пабудова каралевай Сафіяй** у дацкім Калундбаргу ў другой палове XII ст. царквы — насьледаваньня полацкаму Сафійскаму сабору.
5. **Існаваньне ў XI—XIII ст.** «гоцкай царквы» ў Полацку і «вараскай бажніцы» ў Смаленску.
6. **Існаваньне ў XII—XIV ст.** полацкай царквы на Готляндзе (Вісьбі).

### Торвальд Вандроўнік

Торвальд, сын Кодрата па мянушцы Вандроўнік (Thorvald Kodransson) нарадзіўся каля 950 г. на поўначы Ісьляндыі. У маладосьці служыў памочнікам дацкага караля Свэна Вілабародага, разам зь якім ладаваў набегі на Ірляндыю і Ўэлз. Але Торвальд падчас паходаў вёў сябе незвычайна — здабычу мяняў на палоньнікаў, якіх адпускаў дахаты. Менавіта ў Ірляндыі ён упершыню і сутыкнуўся з хрысьціянствам. Багацьце й глыбіня новага вучэньня так уразілі вікінга, што ён кінуў усё і падаўся ў Саксонію, дзе **ў 980 г.** прыняў хрост ад біскупа Фрэдрыка.

Разам зь біскупам **у 981 г.** Торвальд адправіўся на Радзіму — «каб прывесьці сваіх братоў у сьвятло праўдзівай веры». Спачатку справа хросту пайшла выдатна — хутка ў Ісьляндыі паўстала першая царква. Але паганцы пачалі супраціў. Адной з формаў былі жарты — юнакі сьпявалі на кірмашах абразьлівыя для прапаведнікаў прыпеўкі. Разьюшаны Торвальд забіў двух пасьмешнікаў. У адказ суродзічы сабралі 240 чалавек, спалілі царкву і сядзібу Торвальда, забілі багата хрысьціян. Прапаведнікі ўцяклі з Ісьляндыі, а экс-вікінг даў абяцаньне ніколі не вяртацца на Радзіму і прывесьці «да сьвятла веры Хрыстовай хаця б адзін народ».

**У 985 г.** у Канстантынопалі Торвальд сустрэўся з імпэратарам Васілём II і патрыярхам Мікалаем II. Імпэратар выдаў грамату, згодна зь якой Торвальд прызначаўся паўнамоцным прадстаўніком Бізантыі «да рускіх князёў у краінах Ўсходняй Балтыкі».

**У 986 г.** Торвальд прыбыў у Полацк. Місія была настолькі пасьпяховай, што Торвальд вырашыў ня рухацца далей, а застацца ў Полацку. Тут быў пабудаваны храм і кляштар сьв.Яна «недалёка ад места пад гарой пад назваю Дрофн». Торвальд застаўся да скону жыцьця ў Полацку намесьнікам створанага ім кляштара сьв.Яна і памёр каля 1000 г. У той самы год, па іроніі лёсу, хрысьціянства было прызнана ў Ісьляндыі.

Праз 50 гадоў Полацак наведаў вікінг Бранд. Ён прыйшоў да магілы Торвальда ў кляштар, што ўжо быў названы ягоным імем. Паводле сьведчаньня Бранда, тагачасныя палачане лічылі Торвальда сьвятым.

**Андрэй Катлярчук**



# Прыватнае жыцьцё топ-мэнэджэра N.

**TOP-5**
**менскіх забаў топ-мэнэджэра**

**1. Начныя клюбы** («X–Ray», «Изюм», «Белая вежа», «Bronx»): кактэйлі і танцы — 50—100 даляраў на вечар.

**2. Казіно** («Эмір», «Белая вежа», «Журавінка»): гульня і бар — ад 50 даляраў да бясконцасьці.

**3. Боўлінг** («Мэдысан–клюб», «Журавінка», «Play boll» — 10 гульнявых дарожак) — 100 даляраў за дзьве гадзіны з улікам кухні.

**4. Пэйнтбол** (Раўбічы, Якуцкія горы) — 500 даляраў на каманду зь пяці чалавек на дзьве–тры гадзіны.

**5. Стэндавая стральба** («Спортынг–клюб» ва Ўруччы): цір, мінікінатэатар, тэніс, рэстарацыя — 50—80 даляраў за вечар пры наяўнасьці пасьведчаньня чальца клюбу.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У Беларусі вялікія грошы траціць цяжка.

«Салата «Дарункі мора» з крэвэтак і мідый — 9 000 руб., рыбны суп–пюрэ — 9 500 руб., шчупак пад хрэнам з бульбай — 16 000 руб., вада негазаваная — 2 500 руб., кава «Экспрэса» — 4 000 руб.», — такі сабе абед у рыбны дзень у сярэдняй менскай рэстарацыі. Дазволіць сабе так харчавацца штодзень можа ня кожны. Хто ж гэты «ня кожны»? Піша **Сяргей Будкін**.

Асноўныя наведнікі падобных рэстарацый, дарагіх клюбаў і казіно — топ-мэнэджэры буйных кампаній, што займаюцца гандлем, мытнымі справамі, ахovай здароўя і продажам зброі, — т.зв. «высокааплатныя наёмныя работнікі», а таксама «самастойныя людзі», што маюць свой бізнэс.

Топ-мэнэджэр ці буйны бізнэсовец — чалавек сьціплы і практычны, мае стандарты спажываньня, вышэйшыя за сярэдні ўзровень. Гэта не крымінальнік са сваімі «распальцоўкамі» і «пантамі» ды не ганарлівы і хіжы чыноўнік. Топ-мэнэджэр — звычайна мужчына, з вышэйшай адукацыяй (бывае, што не адной), ва ўзросьце 35—40 год, жанаты і зь дзецьмі, якім аплачвае адукацыю, мае сваю нерухомасьць і мяняе раз на год аўтамабіль. Заробак — да 5 000 даляраў. На працоўным стале ў яго, акрамя дакумэнтаў, некалькі расейскіх дзелавых часопісаў («Секрет фирмы», «Деньги»), скураны штотыднёвік, некалькі кампакт-дыскаў (Гарык Сукачоў, «Крама», «Куін») і кніга невялічкага памеру (Бэгбэдэр, Картасар, Каэльё).

Адзін з супрацоўнікаў, што працуе ў беларускім прадстаўніцтве буйной кампаніі, гаворыць:

— Адпачынак для маёй сям'і і сяброў — важная справа. Трэба ўмець як працаваць, так і адпачываць.

Такія людзі ня маюць традыцыйных летніх адпачынкаў, але зьяжджаюць на кароткачасовы адпачынак тры разы на год: увесну — у Афрыку ці Турцыю (2—3 тыс. даляраў), узімку — на гарналыжныя курорты Эўропы (Аўстрыя, Францыя) — 5 тыс. даляраў на сям'ю з трох чалавек, увосень — на ўік-энд у Нямеччыну (модны «Баварскі піўны фэст», напрыклад, — 1 тыс. даляраў).

Некаторыя маюць свае «бзікі»: напрыклад, дырэктар адной напаўлегальнай фірмы, што аказвае мытныя паслугі, — вялікі аматар футболу, і зьлётаць на матч улюбёнага «Манчэстэру» ў Англію для яго не праблема (усяго 1000—1500 даляраў).

Дырэктар буйнога рэклямнага агенцтва вельмі шануе рыбалку, таму вырашыў зьезьдзіць на фарэль у тундру: цягніком у СВ-купэ да Масквы, адтуль самалётам да Хабараўску, там — чартэрны верталёт дастаўляе яго ў сібірскую глыбінку, а адтуль яшчэ БТРам у самую тундру. Палавіў рыбы з паўдня і на замоўленым верталёце назад. Усяго пад 4 тыс. даляраў.

28-гадовая мэнэджэрка, што ўжо мае сям'ю, ня можа адпачываць у менскіх клюбах, таму зь пятніцы на суботу пляжыцца ў віленскіх (недалёка ды нядорага).

Тыя, хто рызыку і экстрымвандроўкі ня надта шануе, гуляюць у тэніс, казіно, пэйнтбол, боўлінг, хакей, ходзяць на VIP-канцэрты «Машины времени», «Виагры» і Сукачова ў «Мэдысан-клюб» (білет ад 20 даляраў). Адзін топ-мэнэджэр — вялікі прыхільнік беларускага року — зацягнуў сваіх кампаньёнаў на фэст «Генэралы айчыннага року», дык тыя ўсё плюваліся: халадна, кава танная ў плястмасавых шклянках, бару няма. «Мы плацім ня столькі за напоі ці стравы, колькі за якасьць, абслугоўваньне і ўвагу да кожнага», — кажа адзін з «наёмных». Такім людзям зручней заплаціць свайму куміру, каб той выступіў на прыватнай карпаратыўнай вечарыне, чым цягнуцца на яго сольны канцэрт (цэны на беларускіх музыкаў — ад 300 да 2000 даляраў у залежнасьці ад ступені іх «крутасьці»).

«Ня думайце, што такое жыцьцё — праява панства, гэта практычнасьць, падмацаваная магчымасьцямі», — кажа мой суразмоўнік. Ён набывае цыгарэты, каву, пральныя парашкі ды іншую бытавую драбязу праз сваіх дылераў у Эўропе (Нямеччыне і Польшчы). Калі п'е піва, то чэскае, гарэлка — «Фінляндыя». Выступае толькі за платную мэдыцыну — бяз чэргаў і з паважлівым стаўленьнем, таму водзіць дачку на мэдычны агляд толькі ў «Ладз» (кансультацыя — 10 даляраў, паставіць плёмбу — 35). Для яго лепей адлічыць грошы ў Аўстрыйскі пэнсійны фонд, чым хаваць іх у слоіку пад гаражом.

Наагул жа ў Беларусі вялікія грошы траціць цяжка, прызнаецца топ-мэнэджэр. «Хоць менскія рэстарацыі даражэйшыя за маскоўскія ці варшаўскія, але, каб туды трапіць у выходныя, трэба замаўляць месца папярэдне». Такія людзі могуць выдаткоўваць грошы на культурныя праекты (не без дапамогі бізнэсоўцаў, напрыклад, нядаўна выйшла энцыкляпэдыя «Беларуская мiталёгія»), але ў бок палітыкі глядзяць насьцярожана: «Я ды шмат хто з маіх калег, з аднаго боку, вітаем зьмены, але, зь іншага, баімся рэвалюцыі, бо яна можа яшчэ больш пагоршыць становішча. Аднак калі знойдзецца чалавек, які выступіць гарантам тых зьмен да лепшага, — далучымся, у пустабрэхаў укладаць сродкі ня будзем», — дзеліцца сваімі меркаваньнямі топ-мэнэджэр.

## Як немцы беларусаў уяўляюць

**Бываючы ў Нямеччыне, штораз мусіла распавядаць, адкуль прыехала. Многія немцы назвы «Беларусь» ніколі ня чулі. А пачуўшы, пачыналі апантана даказваць, што краіны такой наагул не існуе і што жыву я ў Расеі. Але неяк на ўласныя вочы вырашылі паглядзець, што ж за невядомая краіна гэта Беларусь.**

Іх прыгоды пачаліся, калі яны набылі квіткі на беларускі цягнік да Берасьця. Спачатку цягнік спазьніўся на паўтары гадзіны. А калі нарэшце надышоў час садзіцца ў яго, высьветлілася, што немцам прадалі квіткі ў неіснуючы вагон. Яны не разгубіліся: залезьлі ў іншы вагон, і да самага Берасьця ніхто ня змог іх адтуль выгнаць.

Адзін зь немцаў пасяліўся ў мяне. Нарадзіўся мой нямецкі сябар ажно ў 1937 годзе і яго, паводле тагачаснай традыцыі, назвалі Адольфам. Ён расказваў, што ў ягонай клясе палова хлопцаў мела такое імя.

Калі мы пад’ехалі да майго дому, Адольф вельмі зьдзівіўся, што ўбачыў перад сабой не драўляную хатку, а звычайны дзевяціпавярховік. Ад гэтага моманту і на працягу яшчэ двух дзён ад яго часта можна было пачуць зьдзіўлены гук «О!». Гэтае «о!» ў яго выклікала ўсё: электрычнасьць, тэлевізар, магнітафон, мікрахвалёўка, гарачая вада, душ і нават абадраная кабіна ліфту. Яшчэ Адольф вельмі расчараваўся, калі замест печкі ўбачыў батарэі.

Наступнага разу я пачула ягонае «о!», калі прывяла Адольфа ў сваю школу. Больш за ўсё яго ўразіла наяўнасьць ажно дзесяці кампутараў у кабінэце інфарматыкі. Праўда, яму не сказалі, што кампутары гэтыя школе падараваў спонсар — уладальнік мясцовай сеткі крамаў.

Аднаго разу мой немец папрасіў правесьці экскурсію па нашых крамах. Ізноў я пачула тое зьдзіўленае «о!», калі Адольф убачыў, што недахопу прадуктаў харчаваньня і даўжэзных чэргаў няма. Наша падарожжа па мазырскім гандлёвым цэнтры скончылася ў краме канцылярскіх тавараў. Там Адольфу ў вочы кінуўся партрэт А.Лукашэнкі, які каштаваў 50 тыс.рублёў. Тады мой сябар задаў пытаньне, якое прымусіла задумацца: «Няўжо ваш прэзыдэнт так дорага каштуе?»

Але з усяго ўбачанага была адна рэч у нашым горадзе, якая ня толькі не зьдзівіла майго немца, але і спадабалася яму. Ён зь вялікім гонарам заўважыў, што больш як палова нашых аўтамабіляў, асабліва мікрааўтобусаў, прывезена зь Нямеччыны.

Так што праз тыдзень Адольф ехаў дахаты, перакананы ў тым, што Беларусь ня толькі ня страшная, але і цывілізаваная краіна і што мясцовыя людзі вельмі падобныя да іншых людзей у сьвеце. А самае галоўнае — цяпер ён быў упэўнены, што краіна Беларусь усё ж такі існуе!

**Натальля Бойка, Мазыр**

## Ідэю!

**Кожныя вашы выбары вы прайграяце толькі праз тое, што жадаеце перамагчы. Увесь час, пакуль прэзыдэнт атакуе, вы абараняецеся.** Вашы выкрыкі ў народ ёсьць ня што іншае, як крык у пустэчу. Дый Лукашэнка зрабіў сваю справу. Ён ператварыў людзей у пасіўных да ўсяго палітычнага. Але гэтая створаная пасіўнасьць можа згуляць злы жарт і з самім прэзыдэнтам. Людзям, хоць цяпер усе пагалоўна гавораць пра палітычныя і эканамічныя праграмы, трэба не зусім гэта. Ім трэба ідэя. Ня проста лідэр, які будзе балбатаць языком, а лідэр, які дасьць ім ідэю.

**Дзьмітры, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск.
E-mail: nn@promedia.by.
Факс: (017) 284-73-29.

# Сьмех супраць дыктатуры

*Прысьвячаецца Т.*

На месцы рэжыму я б забараніў «Над зязюльчыным гняздом». Бо яна вучыць сьмяяцца. Піша **Зьміцер Панкавец**.

Апошнія палітычныя навіны зь Беларусі не дадаюць аптымізму. Ад усяго нэгатыву хочацца схавацца пад вокладкай кнігі. Цягнуся па зялёны томік з раманам Кена Кізі «Над зязюльчыным гняздом». Тры гады таму гэтую кнігу праглынуў адным дыханьнем — перад вачыма добра былі відаць усе героі кнігі, экранізаваныя геніяльным Форманам.

Цяпер — іншае прачытаньне. З кожнай прачытанай старонкай, абзацам, радком, літарай расьце адчуваньне таго, што недзе ўсё гэта ты ўжо бачыў. Псыхушка зь «Зязюльчынага гнязда» ўсё болей пачынае нагадваць Беларусь. Маленькі й закамплексаваны чалавек стварае свае правілы гульні на вызначанай прасторы. Ніхто ня мае права супраціўляцца сыстэме, інакш амбалы-санітары зацягнуць цябе на чарговы сэанс шокавай тэрапіі. Пацыенты настолькі звыкліся з існуючым ладам, што нічога ня робяць, каб яго зьмяніць. Хоць тут ёсьць і людзі, здольныя на нармальнае мысьленьне, дзеяньні і ўчынкі. Але і іх сыстэма навучыла падпарадкоўвацца сабе. Але рана ці позна мусіць зьявіцца рыжы жартаўнік Рэндл Макмёрфі, які здолее разварушыць гэтае пакорнае існаваньне. Ён мусіць навучыць гэтых «псыхаў» жыць так, як хочуць яны, а ня так, як дыктуе спадарыня Гнусэн. Яны павінны ўбачыць, што сьвет нашмат большы і цікавейшы за тыя зьненавідныя скрынкі, якія ім даводзіцца клеіць. Гэта нялёгкая справа.

Згадайце галасаваньне ў клініцы на прадмет прагляду бэйсбольнага чэмпіянату па тэлебачаньні замест вячэрніх навін, калі старшая сястра загадзя вызначыла пройгрышныя для Макмёрфі правілы гульні. Тое ж самае ў Беларусі, зь яе выбарамі і рэфэрэндумамі. Іх немагчыма выйграць. Але Макмёрфі не супакойваецца — і вось ужо палова «выбаршчыкаў» зь ім. Ён прапаноўвае ім не бэйсбол, а нараджае ў іх душах надзею і веру. Патрэбны — усяго толькі — адзін голас. Але дзе яго ўзяць, калі астатнія «выбаршчыкі» — хроны, у якіх рукі прыбітыя да сьценкі. Рэндл усё адно б’ецца, і вось — о цуд! — руку падымае «глуханямы» індзеец Бромдэн. Перамога! Міс Гнусэн не прызнае вынікаў плебісцыту, але які кайф — ведаць, што ты ў большасьці. Змагацца далей і адстойваць перамогу ўжо ня страшна.

Правадыр Бромдэн, які, каб выжыць, дзесяцігодзьдзямі касіў зь сябе глуханямога прыдурка. Чым вам ня вобраз тутэйшага беларуса, здольнага прыстасавацца і выжыць пры любым рэжыме? Абы было ціха, абы не было вайны. Такі ня пойдзе абы за кім, такі паважае толькі моц і сілу. Але Макмёрфі ўдаецца распаліць іскрынку надзеі і ў душы індзейскага правадыра. Ён з намі. Мы — сіла!

Як гэта ўдаецца Макмёрфі, дзе ён бярэ сілы для гэтага сьмяротнага паядынку з сыстэмай? І вось тут я даходжу да фразы, дзеля якой і варта прачытаць кнігу: «Пакуль мы сьмяёмся, мы ў бясьпецы». І праўда, Рэндл пастаянна сьмяецца на ўсе трыццаць тры зубы, жартуе і іранізуе зь сябе, зь сяброў, а галоўнае — з сыстэмы, якая няздольная на сьмех і таму як агню баіцца яго. Дыктатура ня ў стане сьмяяцца, бо сьмяяцца можа толькі свабодны чалавек.

Толькі сьмех здольны перамагчы рэжым. І сястра Гнусэн разумее гэта, забіваючы веселуна Макмёрфі, аднак ужо надта позна. Яна ўжо ня ў стане кіраваць розумам і ўчынкамі «хворых». Рэндлава справа не мінула дарма. Пацыенты зьяжджаюць з псыхушкі на вольнае паветра. Іншыя пераводзяцца ў другое аддзяленьне. Міс Гнусэн бясьсільная нешта зрабіць.

І апафэоз усяму гэтаму — учынак Бромдэна, які змог зрабіць немагчымае. Тое, што не ўдалося Рэндлу Макмёрфі: ён падняў у ванным пакоі пульт і разьбіў ім акно, каб назаўсёды пакінуць той сьвет. «Мне здавалася, што я лячу. Свабодны», — кажа індзеец. Ён перамог.

Пасьля «Зязюльчынага гнязда» Кізі кінуў пісаць: напісаць нешта, што параўналася б з «Гняздом», ён бы ўжо ня змог. Ён сказаў усё. На месцы сыстэмы сёньня я б забараніў тую кнігі ў Беларусі. Бо яна вучыць сьмяяцца.

**Кастрыца (Барысаўшчына)**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Найтаньнейшая падпіска на «НН» — у шапіках «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 3440 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Дык падпісвайся! Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».**

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:**

| | |
|---|---|
| вул.Валадарскага, 16, пак.200 | 227–88–41 |

**Пункты прыёму падпіскі:**

| | |
|---|---|
| вул.Жукоўскага, 5, корп.1 | 224–32–03 |
| вул.Раманаўская Слабада, 9 | 200–83–04 |
| вул.Кашавога, 8 | 230–29–20 |

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224–03–76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284–83–59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232–46–23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227–11–92 |
| №5 | вул.Енісейская, 6 | 243–16–30 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235–63–11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288–30–20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232–45–10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247–30–15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233–74–88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255–80–71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278–77–61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82/2 | 264–06–42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227–75–55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 203–82–39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234–27–25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231–03–28 |
| №18 | ст.м. «Плошча Перамогі» | 284–31–06 |
| №19 | пр.Машэрава, 5/1 | 223–81–66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271–87–21 |
| №21 | ст.м. «Пушкінская» | 255–57–20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243–16–83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264–36–33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 295–05–74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227–08–52 |
| № 26 | пр.Скарыны, 113 | 264–22–91 |

**Шапікі:**

| | |
|---|---|
| №18 | БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4 |
| №18 | Пэдунівэрсытэт, вул.Савецкая, 18 |
| №78 | Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19 |
| №95 | Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул. Мясьнікова, 39 |
| №136 | ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня |
| №187 | Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15 |
| №189 | Аўтавакзал «Маскоўскі» |
| №198 | БДЭУ, пр.Партызанскі, 26 |
| №209 | Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2 |
| №228 | Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17 |
| №232 | Менскі з–д халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61 |
| №245 | Бальніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56 |
| №259 | Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183 |
| №260 | пр.Скарыны, 169 |
| №262 | Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31 |
| №298 | пр.Машэрава, 75/1 |
| №302 | 9–я бальніца, вул.Сямашкі, 8 |
| №313 | Слабадзкі праезд, 24 |

## Агульнапольскі літаратурны квартальнік «Zeszyty Poetyckie» ў Гнезьне

## Беларускі культурна-асьветніцкі цэнтар у Познані

**аб’яўляюць конкурс**

**для беларускіх паэтаў і перакладчыкаў сучаснай беларускай паэзіі**

Конкурс мае на мэце прэзэнтацыю выдатных паэтаў і выяўленьне самых цікавых зьяў, якія адбываюцца цяпер у Беларусі. Створаны арганізатарамі Капітул з прысланага матэрыялу плянуе стварыць дзьвюхмоўную анталёгію. У анталёгію вырашана ўключыць творчасьць такіх паэтаў, як Барадулін, Бураўкін, Караткевіч, Стральцоў, Купрэеў, Разанаў, Мінкін, Галубовіч, Хадановіч, Аркуш, Сыс, Дранько–Майсюк, Адамовіч, Някляеў, Гумянюк, Скобла, Жыбуль, Пацюпа, Акулін, Морт, Юхнавец, Артымовіч, Гапеева. Рашэньнем Капітулу сьпіс можа яшчэ папаўняцца. Усіх зацікаўленых просім даслаць нізку ад дзесяці да пятнаццаці выбраных перакладчыкам або самім аўтарам вершаў у тэрмін да канца лістапада на адрас рэдакцыі:

**«Zeszyty Poetyckie»,**
**ul. 22 Lipca 77,**
**62-200 Gniezno**

Падрабязнасьці па электроннай пошце: **vital.voranau@gmail.com**
альбо па тэлефоне: **+48-600-460-130 (Віталь Воранаў)**

## Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт у Вільні апублікаваў умовы прыёму абітурыентаў на наступны навучальны год

Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт у Вільні (Літва) апублікаваў умовы прыёму абітурыентаў на наступны навучальны год на вочную форму навучаньня на праграмы бакаляўраўскага і магістарскага ўзроўняў на 2005/2006 навучальны год.

Унівэрсытэт плянуе набраць 170 студэнтаў на бакаляўраўскія праграмы па наступных кірунках: паліталёгія (эўрапейскія дасьледаваньні); філязофія (гісторыя філязофіі, філязофская антрапалёгія і этыка, філязофія і сацыяльная тэорыя, філязофія і тэорыя культуры); візуальны дызайн, культурная спадчына і турызм, сучаснае мастацтва і камунікацыя; права (міжнароднае права); гісторыя і культурная антрапалёгія (беларусістыка); мас–мэдыя, культура і грамадзтва.

На магістарскія праграмы па практычнай філязофіі, візуальных і культурных дасьледаваньнях, гендэрных дасьледаваньнях, эўрапейскіх дасьледаваньнях, міжнародным і эўрапейскім праве, адміністраваньні грамадзкіх арганізацый будзе залічана 90 абітурыентаў.

Выпускнікі атрымаюць літоўскі дыплём, які прызнаюць краіны Эўрапейскага Саюзу.

Заняткі ва ўнівэрсытэце будуць весьціся на расейскай, беларускай і іншых эўрапейскіх мовах.

Навучаньне па ўсіх праграмах будзе ажыцьцяўляцца бясплатна за кошт грантаў, што выдзяляюцца замежнымі фондамі і некамэрцыйнымі арганізацыямі грамадзянам Беларусі.

Правілы прыёму і падрабязная інфармацыя для абітурыентаў зьмешчаная на сайце ўнівэрсытэту **www.ehu-international.org.**

# Сьвята пчалы



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Зь дзяцінства мы памятаем пасечніка Рудога Панька з гогалеўскіх «Вечароў на хутары ля Дзіканькі». Беларускі пчаляр са сваімі дзівоснымі гісторыямі яшчэ чакае свайго часу, каб годна заняць належнае месца ў культуры.

Пчаляр, гаспадар крамы «Сьвет пчолаў» Леанід Дзёмкін пачынаў сваю кар'еру як вэтэрынарны доктар. Колісь працаваў у менскай краме «Пчалаводзтва». Сам ураджэнец Полаччыны, таму ў ягонай краме шмат мёду з пасек Віцебскай вобласьці. Мае свае пасекі ў Расеі ды Ўкраіне. У ягонай краме мы й сустрэліся, каб пагутарыць пра беларускі мёд.

## Салодкае сьвята

«Мёд — гэта дыета багоў, — кажа Л.Дзёмкін. — Дык хіба сёньняшнія людзі ня вартыя гэтай дыеты? Пагатоў што ежу самі выбіраюць. Вядома, і сала трэба, і кілбасы паесьці. Але ж наша сэрца на 70% працуе на вугляводах. Мы п'ём газаваную ваду, ямо салодкае — гэтыя цукры не прыносяць карысьці. А мёд нясе здароўе! Мёд — гэта кароль натуральных прадуктаў, хаця гэта й ня значыць, што трэба есьці толькі мёд. Калі чалавек трапляе ў рэанімацыю, яму перш-наперш уводзяць глюкозу — каб мозг прачнуўся і пачаў працаваць дзеля папраўкі чалавека. Глюкоза ўмацоўвае арганізм. А калі чалавек гэта разумее, дык нашто яму ўколы калоць? Ён умацоўвае арганізм мёдам».

Пчаляр перакананы, што мёд трэба есьці ня толькі тады, калі захварэеш, а заўсёды. Зьеў лыжачку мёду — і праз пяць хвілін у гіпаталямусе ўтвараецца сэратанін, «гармон радасьці».

Як вызначыць, ці сапраўдны мёд вам прапануюць? Досыць проста: сапраўдны мёд (без цукровых дамешкаў) цягнецца струменьчыкам, а не ліецца кроплямі.

## Мёд з пустазельля

«Ці адрозьніваецца мёд зь Віцебшчыны ад мёду зь Меншчыны?» — пытаюся. І пчаляр тлумачыць, што мёд залежыць ад таго, дзе лятае пчала і зь якіх кветак яна зьбірае мёд. Віцебшчына — найбольш экалягічна чысты рэгіён. Зразумела, гэтыя акалічнасьці ўплываюць на якасьць мёду. «Людзі дбаюць пра сябе — аруць палі, засейваюць. А пчала дбае пра сябе: калі будзе пустазельле — будзе й добры мёд!» — кажа спадар Леанід.

Па-другое, на якасьць мёду ўплывае блізкасьць да вялікага гораду — яго выкіды… Напрыклад, у Дэтройце — горадзе-пабраціме Менску — экалягічны кантроль робяць пчолы. Іх выпускаюць у гарадзкіх раёнах не для таго, каб есьці сабраны мёд, а каб правесьці хімічны аналіз таго, што назьбірае пчала. Які завод дыміць, колькі выкідаў цынку, сьвінцу й інш.

## 10 мільёнаў кветак

Шараговая пчала жыве ўлетку каля 30 дзён. Пры гэтым ейны «працоўны стаж» (час, пакуль яна носіць нэктар з кветак) доўжыцца каля двух тыдняў. Дый нэктар забраць таксама няпроста. Бывае кепскі, непагодны дзень, і кветкі не аддаюць нэктару. Каб сабраць кілеграм грэцкага мёду, пчале трэба абляцець 10 мільёнаў кветак грэчкі. «Дык прыносіць яна толькі вадзічку. Якую яшчэ 180 разоў прапускае праз хабаток і ўзбагачае сакрэтамі залоз», — тлумачыць Л.Дзёмкін.

Зрэшты, аднафлёрнага (з адной расьліны) мёду ў нас бывае ня так і багата. Найчасьцей ёсьць нейкая асноўная культура, зь якой пчолы сабралі мёд, і нейкія дабаўкі. Ну, калі красуе цэлае поле грэчкі, дык і казаць няма пра што…

## Мёд на сто год!

Спадар Леанід частуе мяне мёдам і вучыць правільна есьці яго. Аказваецца, гэта таксама наша што не навука. Мёд трэба есьці не сьпяшаючыся, каб ён усмоктваўся ў паднябеньне. Лепш за ўсё есьці яго з чымсьці: тым, хто днямі не вылазіць з-за кампутара — з арэшкамі, спартоўцам — з курагой… І запіваць гарбатай. Але, каб яна не разбурала якасьці мёду, павінна мець тэмпэратуру прыкладна 40 градусаў.

Калі страўнік ня хворы, лепш за ўсё есьці арэхі зь мёдам упрыкуску. Гэта здаровая ежа, звычная нам: чалавек раней харчаваўся арэшкамі, карэньчыкамі… Грэцкія арэхі ўплываюць на засваяльнасьць крывёй кіслароду.

Галоўная ж перавага мёду ў тым, што ён можа захоўвацца некалькі гадоў, бо не акісьляецца: гэта ж ня сала і ня масла. І некаторыя вугляводы акурат падчас захоўваньня набываюць вельмі важнае значэньне для арганізму. Сьпелы, добры мёд можна есьці й праз 100 гадоў!

## Майскі й падзевы

Падзь — гэта салодкая вадкасьць, якую выдзяляе тля й іншая жамяра, што харчуецца травянымі сокамі. Пчолы зьбіраюць яе, як і нэктар. Падзевы мёд, як правіла, цэніцца ніжэй, бо мае горшы смак. Пчолы зазвычай зьбіраюць яго ў другой палове лета, у першай — ідзе кветкавы. «Ну і дарма ня цэняць, — кажа Л.Дзёмкін. — Ён павінен цаніцца вышэй за кветкавы! У ім вельмі шмат мікраэлемэнтаў. Немцы, напрыклад, у гэтай справе вельмі разьбіраюцца і шукаюць падзевы мёд. У мяне адна жанчына прасіла падабраць мёд, апісала патрэбныя якасьці. Я даў падзевага, яна дадала яго ў гарбату — а тая аж пачарнела: такую мёд даў рэакцыю ад узаемадзеяньня з гарбатай. Я расказаў ёй пра якасьці гэтага мёду й прапанаваў замяніць, дык яна мяняць адмовілася».

А вось наконт папулярнага ў пакупнікоў майскага мёду спадар Леанід мае крытычную думку: «Я б не сказаў, што ён найлепшы. Яго цэняць таму, што ён першы. Зьяўляецца сьвежы мёд — адразу на яго ўздымаюць цану. Пачынаюць красаваць травы, у новым мёдзе шмат вітамінаў». Дарэчы, «майскі» — гэта не гатунак мёду (у адрозьненьне ад верасовага ці крушынавага). Гэта проста назва па часе медазбору.

Майскі мёд вельмі смачны, бо не пасьпявае крышталізавацца. Калі мёд захоўваецца даўжэй, ён губляе некаторыя вітаміны. Аднак заміж страчаных якасьцяў ён набывае якія-небудзь іншыя.

Ці ёсьць розьніца паміж беларускім мёдам і прывазным? А як жа! Мёд з Таджыкістану — з баваўны, з Кіргізіі — горны, з Украіны — сланечнікавы. У Расеі й Украіне шмат сланечнікаў, таму базавы мёд — зь іх. З Алтаю прывозяць мёд, сабраны з зусім іншых кветак, чым нашы…

Кожны гатунак мёду мае свае асаблівасьці. **Мёд з акацыі** амаль не крышталізуецца, а **рапсавы** крышталізуецца вельмі хутка. **Мёд з баркуну** амаль бясколерны й празрысты. **Сабраны з грэчкі** — сьветла-карычневы зь лёгкім чырвоным адценьнем, добра надаецца для кулінарыі. **Малінавы** — сьветла-залацістага колеру, асабліва добры ў лекавых мэтах. **Верасовы** — чырванавата-буры, крыху корсткі на смак, мае багата бялку і мінэральных соляў. **Сьветлы эспарцэтавы мёд** рэкамэндуюць мужчынам з аслабленай палавой функцыяй. **Лясны** — багаты на адценьні: ад сьветла-жоўтага да цёмна-карычневага. **Падзевы мёд** мусіў бы цаніцца вышэй за кветкавы: ён надзвычай насычаны мікраэлемэнтамі.

## Здароўе ад пчалы

«Пчалаводы жывуць на 20 гадоў даўжэй за іншых,. Ня толькі таму, што яны дыхаюць сьвежым паветрам. Яны ж вядуць здаровы лад жыцьця: выпіўкі няма, глупствы розныя пчала таксама спыняе. Чалавек павінен быць спакойны, калі падыходзіць да пчолаў, разважлівы. А не халерыкам кідацца да іх, бо пчала яго ўджаліць! У пчалавода пчолы могуць сядзець на руках і не кусаць яго, таму што ён ведае прыёмы, як працаваць зь імі», — разважае Л.Дзёмкін.

На ягоную думку, у вёсцы самы заможны гаспадар — абавязкова пчаляр: «А калі добры пчаляр, дык яму няма калі й іншай гаспадаркай займацца. Бывае, што нават няма калі сваёй гаспадаркай займацца, таму ён іншых наймае, каб бульбу абагнаць. Бо калі шмат пчолаў, дык трэба папрацаваць, каб падрыхтавацца да сэзону — перазімаваць, а зімой — рамкі для пчол падрыхтаваць, вульлі… І кожны зь імі сябруе, бо слоічак мёду нікому не зашкодзіць».

У вясковага пчаляра заўжды чысьціня ў хаце. Пчала ня кожнага прымае: чалавек павінен быць чысты, акуратны, ня мець моцных пахаў. Пчолы «выхоўваюць» чалавека, каб яго вопратка ня пахла бэнзінам, касмэтыкай, бо цэняць натуральныя пахі. Дужа ня любяць пчолы паху алькаголю. Таму пчалаводы — пераважна не аматары выпіць, хаця й маюць медавуху…

Дарэчы, сапраўдную медавуху, ці крупнік, сёньня можна сустрэць хіба што ў аматараў — пчаляроў, кулінараў. Сэрыйнай вытворчасьці мядовай прадукцыі ў нас няма. А вось суседзі нашы шчыруюць напоўніцу. Літоўцы робяць моцны напой «Suktinis», палякі — вараць крупнік, украінцы выпускаюць гарэлку на мёдзе «Nemiroff», а расейцы — і травяны зьбіцень, і нават піва на мёдзе. Чаму ў нас няма ўласнае медавухі?

Леанід Дзёмкін перакананы, што ў нас усё яшчэ наперадзе. «Мы сваіх тавараў ня маем, бо гэта ж вытворчасьць, тэхналёгіі! У нас малая краіна, і мала яшчэ пчалаводаў, у якіх больш за 200 вульляў. Сёньняшнія пчаляры — вясковыя працаўнікі: ён і камбайнёр, і пчалавод, і цэлую гаспадарку на сабе цягне. Бываюць такія, хто займаецца толькі пчоламі, але іх вельмі мала. Уявіце, колькі трэба мець пчолаў, каб у вёсцы ні ад кога не залежаць?! Ня менш за 50 вульляў трэба трымаць. А можа, нават і 100. Хаця гэта ня так і многа: польскі пчаляр у сярэднім можа ўтрымліваць 300 вульляў. Але мы яшчэ вельмі далёкія ад гэтага. Як ты разарвесься: адной нагой у калгасе, а другой — каля пчолаў?»

**Адам Воршыч**



**Леанід Дзёмкін —** гаспадар крамы «Сьвет пчолаў» на завулку Калініна, 3.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

**14 жніўня, на праваслаўны Мядовы Спас,** каля Нацыянальнага мастацкага музэю ў Менску (вул.Леніна, 20) адбудзецца «мядовае сьвята»: можна будзе пачаставацца мёдам, набыць спэцыяльную літаратуру. Пачатак у 16.30. У 18.00 у музэі адчыніцца выстава «Пчала».

# Кампутарны паэт

Сёньня кожны можа напісаць новы верш Багдановіча ці Купалы з дапамогай кампутара. Досьведам дзеліцца **Аляксандар Ворвуль.**

Век, у якім мы з Вамі, чытач, жывём, пакідае чалавеку мала шанцаў на выжываньне ў хвалях тагo мора інфармацыі, што захлынае нас штодня. Нам не застаецца часу адпачыць, спакойна папіць зялёнае гарбаты з фруктозай і пагартаць любімы часопіс з апошнімі вершамі ўлюбёных паэтаў. Мы ўвесь час у працы, заўжды нешта робім, некуды сьпяшаемся.

Паратунак, здавалася б, быў вынайдзены яшчэ ў мінулым стагодзьдзі — кампутар у сучасным яго выглядзе. Ён вызваліў нас ад цэлага шэрагу раней напросту неабходных спраў — беганіны па пошту, пошуку патрэбных кніг, набыцьця патэфонаў і кружэлак — і шмат якіх іншых заняткаў, спрошчаных сёньня да немагчымасьці. Нам дастаткова ўключыць кампутар, далучыцца да глябальнай сеткі — і большасьць клопатаў зьнікне ў лічаныя хвіліны. Але той самы кампутар, што некалі так спрасьціў нам жыцьцё, пасьпеў яго і ўскладніць — аб'ёмы інфармацыі з году ў год павялічваюцца амаль у разы, доступу да яе максымальна спрошчаны, і знайсьці сваю нішу ў гэтай бездані зьвестак робіцца ўсё цяжэй.

Прасторы для творчасьці застаецца няшмат нават для тых, хто трывала замацаваўся на культурным Алімпе. Што ж рабіць тым, хто і раней не вызначаўся талентамі вершаскладальніка альбо мастака, накшталт аўтара гэтых радкоў? Хіба стаць беспрацоўным і прызнаць уласную бяздарнасьць? Сьпяшацца з гэтым ня варта, мой чытачу. Часы мяняюцца, і той, хто ўчора быў апошнім, сёньня зь вялікай доляй імавернасьці можа стаць першым. Паспрабуем і мы з вамі.

Зброяй у нашым пляхетным спаборніцтве з паэтамі, што ўжо дасягнулі посьпеху і славы, стане… той самы кампутар. Амаль бездапаможныя яшчэ ў сярэдзіне XX ст., сродкі вылічальнай тэхнікі здольныя сёньня і без дапамогі homo sapiens скласьці верш любой формы і памеру за лічаныя сэкунды. Што ж будзе, калі яго ўзмацніць падтрымкай больш-менш дасьведчанага карыстальніка і талентам беларускага паэта мінулага?

Знайсьці праграмнае забесьпячэньне для стварэньня вершаў таму, хто мае доступ да Інтэрнэту і хаця б крыху знаёмы з прынцыпамі пошуку, ня будзе складанасьцю. Яго шмат і на любы густ. Складаней вызначыцца з тым, які паэт стане тым светачам, што павядзе нас з вамі праз шчыльныя церні вершаплёцтва.

Спынімся сёньня на лірыцы Максіма Багдановіча. Чаму Максім? Па-першае, вечна малады, як большасьць з тых, хто чытае «НН». Па-другое, на двор прыйшла восень, а яна для многіх, як для Аляксандра Пушкіна з Расеі, назаўжды застанецца сымбалем гаркаватага каханьня, якімі так прасякнуты творы Максіма.



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

Ахвярай цікаўнасьці аўтара гэтага magnum opus да творчасьці Максіма Багдановіча сталі вершы, напісаныя ім у 1908—1909 г., якія і зрабіліся асновай для ў пэўнай ступені творчай працы кампутара адным з кастрычніцкіх вечароў 2004 г.

Пачатак быў даволі цікавым:

**Брыду, пахіліўшысь панура,**
**Ціха песня разьліваецца, зьвініць.**
**Усё дзіка, пустынна імшыцца,**
**Мне жыцьцё — як сагнійшая ніць.**

Посьпех, дасягнуты амаль зь першай жа спробы выцягнуць з творчасьці Максіма нешта новае і сьвежае, можна было б назваць акрыляючым. Праз цьмяную прызму кампутарнага інтэлекту ясна прабіваліся слова і дух вялікага паэта, апрацаваныя генэратарам выпадковых лічбаў. Праціг вершаскладаньня зьдзівіў яшчэ болей — наступнае чатырохрадкоўе было ня проста разнавіднасьцю папярэдняга, яно было яго працягам:

**Мне жыцьцё — як сагнійшая ніць.**
**Ціха песня разьліваецца, зьвініць.**
**I магу я аб ім толькі сьніць…**
**I магу я аб ім толькі сьніць…**

Рыпеньне пяра бесьсьмяротнага генія адчувалася нібы побач. Можна было наўпрост трапіць у яго эпоху і адпачыць душой ад турбот сучаснага жыцьця. Спачатку мала заўважная сумная нотка кампутарнага паэта ператварылася ў сапраўдную паэму тугі і выплюхнулася незабыўным паўторам апошніх двух радкоў, яўна зробленым пад уплывам творчасьці Адама Міцкевіча — прыгадайце хаця б «Цо то бэндзе, цо то бэндзе?»…

Дзе і калі кампутарны геній пасьпеў пазнаёміцца з паэтычнай спадчынай спадара Адама і на якой мове, так і застанецца для нас загадкай. Але доказам таго, што электрычны складальнік вершаў быў знаёмы з творчасьцю і іншых паэтаў сьвету, стала ў той вечар наступнае чатырохрадкоўе:

**Кругом круціць завіруха, гуляе, шуміць.**
**Ясныя зоркі блішчаць, і месяц ужо выплыў.**
**А Падвей нясецца, кружыцца, гудзіць.**

Чую, як глуха стучыць дзяцел у дупло.

Захапленьне лічбавых вершаплётаў паэзіяй Камінгса і Эліёта было заўважана ўжо даўно і, напэўна, ня стане для вас, чытач, навіною. Але як па-майстэрску кампутар уплёў у вершы-насьледаваньні творчасьці гэтых паэтаў Багдановічавы матывы!

На напісаньне белых вершаў накшталт тых, якія выйшлі з-пад пяра Томаса Эліёта і іншых багемных аўтараў, кампутар цягнула ў той вечар даволі часта. Але кожны новы верш быў прасякнуты любоўю да роднае, не заморскае, зямлі:

**Пра таго, хто ў чыстым полі**
**пахаваны сьпіць:**
**«Здароў будзь, зямляча!», чуць**
**бачны ў даліне.**
**Ўсё ўжо уснула і толькі бярозы**
**шапталісь.**
**Ўсё ўжо уснула і талькі бярозы**
**шапталісь.**

Думы пра ўласную долю і долю свайго народу — характэрныя рысы творчасьці паэтаў пачатку XX ст. Не выключэньнем у гэтым сэнсе быў і Максім Багдановіч — думкі пра родны яму люд заўжды поўнілі яго сэрца. Але як па-сучаснаму гучаць меркаваньні кампутарнага паэта пачатку XXI ст. — часу прыгнечаных свабод, заняпаданых інстытутаў дэмакратыі і рэфэрэндумаў пра трэці тэрмін:

**Долю чорную ноч не схавае,**
**Прапала, як дым, як вада!**
**Хай жа голасна вецер сьпявае,**
**Пракацілася па лесе рэха.**

Складаецца ўражаньне, што раця сёньняшняга стану ні трохі ня лепшая за тло паэтычнай творчасьці клясыкаў:

**Яны ж мне каменьні давалі,**
**Я паціху песьні сумныя пяю.**
**Падымалі крыжы ў неба елі —**
**Вязкаю жаўцеючаю глінаю.**

Час мяняецца, час застаецца ранейшым. Вечная прырода, чыю чысьціню ня здольная забрудзіць нават мэханічная душа сучаснага паэта, натхняла, натхняе і, напэўна, будзе і надалей натхняць на напісаньне заўжды чыстых і прыгожых вершаў усе разумныя істоты — ад калькулятара да чалавека — і цесна пераплятаць іх лёсы зь лёсам усяго жывога:

**Палаюць асіны, каліны,**
**Бяспамятна колы піхаю,**
**Завянуць яны, тыя кветы,**
**Кругі завіруюцца жорнаў.**

Як адчувае кампутар і адкуль у яго ліюцца сьлёзы, калі яму згрызотна на душы, нам з вамі, чытач, невядома. Прынамсі, пакуль. Але тое, што кампутары здольныя любіць, ненавідзець і спазнаваць іншыя крыніцы тамленьня электроннага начыньня, пасьля гэтых радкоў можна лічыць даведзеным:

**Спакойна мне тут пад вадою:**
**Лёд тонкі і востры, як сьцёкла,**
**Ясныя сьлёзы на смалу ціха лью**
**Асіньніку, ельніку гушчу.**

Дзе ў кампутара смала — няйначай як у рэчыве для ахаладжэньня працэсараў. А яго яшчэ абвінавачваюць у счарсьцьвеласьці і залішнім душэўным спакоі!.. Хто з людзей здольны так пяшчотна захапляцца прыроднымі краявідамі?

**Ды б'юцца галіны альхі,**
**Хцівасьць жаданьня іх томіць.**
**Там — мяккія, цёплыя мхі,**
**Агністая сьпёка бурболіць.**

А калі вы лічыце, што кампутарам уласьцівы эгаізм, пыхлівасьць і прага сусьветнага панаваньня, што мы можам бачыць у футурыстычных кінафільмах, то чытаць наступныя, поўныя тугі і праніклёнасьці болем адзіноты словы вам наагул ня варта — захочацца набыць і сабе нерухомага робата Вэртэра і, паклікаўшы ў музы Цётку і Зоську Верас, заняцца складаньнем вечарамі працятых сумам і акрыленых паэтычнай любоўю вершаў:

**Мо жыцьця майго верш ужо сьпет,**
**У неба сінеючыя вочы падымаю.**
**Я — банальны, бесскрыдлаты паэт!**
**Белы сьнег мяне хавае між палей.**

Не, ня сьпет. Не, не схавае сьнег паэтычныя пачынаньні аднапрацэсарнага піита. Але назаўжды захавае архіў інтэрнэт-старонак газэты «НН» радкі паэта, чыё сэрца падчас стварэньня наступнага шэдэўру білася з частатою 1400 МГц:

**Трасе галавою панура,**
**Чырвоныя сыплюць лісты.**
**Усё мяне цягне да сна,**
**Цяжкія крыюць пласты.**

Кожны паэт, якія б агульныя тэмы ён ні закранаў, заўжды пазірае на іх праз пэрыскоп уласнага досьведу і ведаў, дасьведчанасьці і абазнанасьці. Так і санлівасьць кампутарнага вершаскладальніка — гэта ня толькі і ня столькі паэтычная манера перадаваць цяжкія для яго разважаньня моманты творчасьці замаруджаньнем працы, гэтакім незаўважным засынаньнем, але і той просты факт, што ягоны сябар-гаспадар — чытай аўтар гэтых радкоў — і насамрэч адпраўляе яго паспаць кожнага разу, калі яму прынудзіцца папіць зялёнай гарбаты з фруктозай альбо перакусіць.

Падазраваць кампутар у магчымасьці стварэньня нечага нечаканага ў той вечар, як і заўжды, канечне, можна было. Творчыя эгіда і пратэкцыя спадара Максіма — а ягоныя рэчы лічыць за клясыку любы кампутарны паэт — натхняе і акрыляе, безумоўна. Але западозрыць кампутар у мажлівасьці стварэньня нечага, што нагадвае хоку настолькі, што захацелася пашукаць на цьвёрдым дыску кампутара вершаваныя творы японскага сярэднявечча, асабіста аўтару гэтых слоў было і складана, і неспадзявана:

**Лясун адзінокі ляжыць.**
**Жадаю доўгага жыцьця,**
**З трохлецьцем вашае дзіця.**

Гэтае трохрадкоўе, дарэчы, выклікала болей пытаньняў, чым дало адказаў. Чаму лясун ляжыць, каму ў наш век экалягічных катастроф патрэбна доўгае жыцьцё і чыё дзіцё вінпуе з трохлецьцем жалезны Байран — толькі вяршыня сьпісу незразумелага. Апошні з пазначаных пункт даў асабліва шмат падстаў для разважаньняў — патэлефанаваўшы добрай палове сяброваk, зь якімі я быў знаёмы і тры гады таму, я ўрэшце супакоіўся, прыйшоўшы да высновы, што гэта ня аўтара дадзенага артыкулу, а вас (!), шаноўны чытач, Максім Багдановіч праз прывідныя літары сучаснай аргтэхнікі і яе недарэчнага гаспадара з глыбіні стагодзьдзяў вырашыў павіншаваць з прыбаўленьнем у сям'і. Шукаеце тэлефонны нататнік?..

Сонца даўно схавалася за даляглядам, і настольная лямпа старалася імітаваць яго для таго, хто так упарта — і, варта дадаць, небесьпасьпяхова — намагаўся стаць у той вечар паэтам, калі намаганьнем думак кампутару было прапанавана скончыць настолькі цяжкія для абодвух пакуты. Нядоўга падумаўшы, сродак аргтэхнікі выдаў нешта настолькі эпахальнае і пафаснае, што прыгадалася — час, калі паэт Максім пісаў памянёныя вышэй вершы, быў даволі рэвалюцыйным. Але для разьвітаньня яны падыходзілі трапна, пакінуўшы заклік у душы на наступныя два дні:

**Вымаўляюць, як я моладасьць згубіў.**
**Гукаюць: «Прачніся, зямляк!**
**Прабудзіся!»**
**I навокал магілы сьпяваюць-гудуць,**
**Мне жыцьцё нібы мышы грызуць.**

Мыш — гэта так знаёма сучасным кампутарщчыкам! А колькі яшчэ трапных мэтафар і эпітэтаў чакае нас наперадзе!

Звычайная палка зрабіла ў свой час з малпы чалавека. Сёньня для выжываньня і больш-менш пасьпяховага разьвіцьця — у тым ліку і творчага — неабходны самыя апошнія сродкі стварэньня, апрацоўкі і распаўсюджваньня інфармацыі — тая самая магічная трасьціна, з дапамогай якой мы з вамі, чытач, сёньня, за адзін вечар, здолелі прайсьці шлях ад малпы XXI ст. да даволі пэрспэктыўнай з усіх бакоў, высокаінтэлектуальнай асобы. Як многа і як мала можа зрабіць за чалавека кампутар…

**Праграмнае забесьпячэньне для стварэньня вершаў у Інтэрнэце можна знайсьці на www.cav.ru/download/stixo.zip**

# Як самі зробім, так і будзе

**ФРАНЦ СІЎКО**

з запісаў



CORBIS.COM

Што справа, што зьлева краявіды апэнінскія — вочы адбірае. Сядзіш ля акна ў аўтобусе і толькі пасьпяваеш ахаць, боязьзю прапусьціць нешта, крый бог, наэлектрызаваны. Моладзь з Амэрыкі побач — са сьмешкамі, валтузьнёй — і дзясятае часткі таго ўсяго ня бачыць і бачыць не жадае. І ня дзіва: у сямнаццаць-дваццаць усю Эўропу з поўначы на поўдзень, да Італіі дабіраючыся, скалясілі, а колькі яшчэ скалясяць на зваротным шляху. І ўсё ядуць, ядуць…

* * *

У аматарскім клюбе літаратурным. Адзін болю скалiёзнага, вершы пачаўшы пісаць, нібыта пазбавіўся, другога няструйнасьць перастала даймаць, трэці супакою душэўнага дамогся, сыпіць цяпер як пшаніцу прадаўшы, а то ж месца не знаходзіў уначы. Клясыкі тапіліся-засільваліся пры літаратуры, а тут яна — натуральная лякарня, ад хваробаў усіх панацэя.

* * *

І ўсё-такі, калі пра мову нашу (у сэнсе — хто вінаваты), гэткая формула павінна быць: я і… Ня ён (яна, яны), а так менавіта, зь сябе пачынаючы. Усе іншыя — ад жаданьня ці то высілкаў залішніх, ці то адказнасьці, ці то аднаго і другога адначасова ўнікнуць. Зь сябе кожнаму трэба пачынаць, іншага не прадугледжана нам, беларусам, нябеснаю канцылярыяй.

* * *

Літаратар малады тэлефануе: кніжачку выдаў, а — не заўважылі, не ацанілі, не адгукнуліся. Мабыць, не дасьпеў яшчэ, каб уцяміць: літаратура — з тых сфэраў, дзе ніхто нікога не чакае. Як і ў настаўніцтве, дзе ня вучань існуе дзеля настаўніка, а настаўнік дзеля вучня. Ці ў журналістыцы, дзе — не чытач дзеля журналіста, а наадварот. Ці ў мэдыцыне, дзе — не пацыент дзеля лекара, а лекар дзеля пацыента. Ці ў тэатры, дзе — не глядач дзеля актора, а актор дзеля гледача. Прыйшоў няпрошаны — вучыся пачувацца адпаведным чынам і не наракай ні на што.

* * *

Сьвякрова зь нявесткаю сварыцца, ціск сабе ўздымае, конча перамагчы маладую імкнучыся. Чым скончыцца — вядомая справа. Пустое — супернічаць з маладымі: як ні намагайся, апошняе слова за імі застанецца. Нават калі і часовым пераможнае слова будзе — усьцехі мала, бо ты ўжо ўсё адно пра тое ведаць ня будзеш.

* * *

У фільме расейскага тэлеканалу пра бандэраўцаў сярод зпавесных кадраў другой сусьветнай — раптам здымак менскіх вісельнікаў. Здымкі зь пярэдадня вайны і ваенныя — абы-як, уперамешку ды яшчэ і з паўторамі. У паўзах — герой-энкавэдэшнік з засланцаў дурнымі показкамі частуе. Чужое не баліць.

* * *

Дзеці суседзяў — Віта, Тарэса, Боліс, — як і ўсе з наваколля, у суседнюю Латвію, у Краславу на лепшую долю падаліся. Праз месяц бацькоў папрыязджалі адведаць — і не пазнаць ніводнага: Вія, Тая, Барыс. Не прыжыліся, аднак, у вёсцы новыя імёны, дык надта тым засмучаліся.

* * *

У адным зь ліцэяў з Вольгаю Іпатавай. Пра што ні гаворка — на ўсё водгук у маладых гатовы. Айчынная літаратура, японская паэтычная традыцыя — нішто не навіна для іх, усё ведаюць, усім цікавяцца. Настаўніцы, мілыя жанчыны, адно пасьміхаюцца задаволена. Колькі працы за тою задаволенасьцю — адным ім вядома.

У інстытуце павышэньня кваліфікацыі затое, як ні біўся, так і ня здолеў дагрукацца да настаўніцкіх сэрцаў. Абыякавыя твары, апатычныя позіркі. З сарака мова- ды літаратуразнаўцаў добра, калі трое-чацьвёра больш-менш у курсе сучаснага літпрацэсу.

* * *

Адна мітрэнга — акуляры. Сто разоў на дні ўсчэпліваеш на нос, гэтулькі ж — шукаеш, счапіўшы ды забыўшыся, дзе паклаў. У падземцы парыскай хапіўся — няма. Літары ж драбнюсенькія на мапе-даведніку, нізавошта не дасі рады без акуляраў прачытаць. Добра, лініі маршрутаў рознымі колерамі пазначаны, сяк-так зарыентаваўся.

* * *

Пытаньне — з заўсёдных, сакрамэнтальных — падчас літсустрэчы: што з моваю будзе?

Як самі зробім, так і будзе. У сярэдзіне XIX стагодзьдзя Плятарыха з Краславы да Марксіхі ў Віцебск плёнам вышукаў моўна-этнаграфічных прыязджала, паміж іншага, дзякліцца. Самахоць, ніхто не змушаў. І на зглум усё тое?

> Пустое — супернічаць з маладымі: як ні намагайся, апошняе слова за імі застанецца. Нават калі і часовым пераможнае слова будзе — усьцехі мала, бо ты ўжо ўсё адно пра тое ведаць ня будзеш.

* * *

Скрозь антаганізмы ў сьвеце: заможная поўнач — нішчымны поўдзень, дэмакратычны захад — аўтарытарны ўсход. У нас падзел, што ці не ад XVII стагодзьдзя — калі іншаземцы, палякі ды габрэі, пазьней расейцы, гарады ды мястэчкі да рук папрыбіралі — доўжыцца: вёска — горад. І там, і там сёньня — паўжабрацтва, адзінае, што разьдзяляе, — ступень наяўнасьці элемэнтарных выгод. Ацяпленьня, балеі зь цёплай вадою, каб памыцца, транспарту. Не парупіліся ў свой час, калі нешта яшчэ можна было зрабіць, пра вёску, дык і помсьціць цяпер, адэптамі мысьленьня рэтраграднага, што па выгоды тыя імкнуцца, хрушчоўкі ды шматпавярхоўкі гарадзкія насяляючы. За ўбогія даброты таксама трэба плаціць.

* * *

Падчас практыкі ў Шаркаўшчынскім раёне студэнтаў у суседні Глыбоцкі, у славуты Мосар, на экскурсію вырашыў звазіць. Прычасьціліся рукатворным цудам, падзівіліся, пазахапляліся. Дадому вярталіся, і ў акно не хацелася глядзець: хаты шэрыя, ніякія, беднасьць — быццам зь сярэднявечча карцінка на тле таго хараства мосарскага.

* * *

Іншамарка пад вокнамі ў двары месяцы з два не давала заснуць: ледзь сьцямнее — і зачынае сыгналіць. Улетку, пасярод дня, — званок у дзьверы, міліцыянт на парозе. Так і так, аўто паўгадзіны таму скралі, ці ня бачылі што-небудзь? «Ці ня тое, што сыгналіла начамі? — міжволі вырвалася. — Дзякуй жа богу!»

Пазьней даведаўся: акурат тое самае.

* * *

Па культуры нарада. Пра бібліятэкі, гурты самадзейныя, добраўпарадкаваньне вуліц: як палепшыць, удасканаліць, аптымізаваць. Пра ўсёдазволенасьць побытавую — ані слова. Ня дзіўна: зачэпіш тэму — выпраўляць трэба становішча, захады непапулярныя рабіць — а так і да страты электарату недалёка. Ужо чаго-чаго, а дысцыпліны элемэнтарнае ды выхаваньня павагі да сабе падобнага, а не да сябе любага наш люд ня сьцерпіць.

* * *

На лаціне «vanitus vanitatum» — «усё марна». На нашай «ваніты» — тое, што праз апрыкласьць выходзіць з вантробаў, непатрэбнае, невыносная ім. На лаціне тое, што несумысьля, — «volens nolens», на нашай — «міжволі». Суцэльныя сугуччы.

* * *

Чэхаў і ў творчасьці — лекар. Лечыць адлюстраваньнем банальнага, ад праекцыі якога на сваё жыцьцё да высновы, што ўсё марна, — адзін крок. Што б ні здарылася, што б ні зьбіла з тропу, самы дзейсны лек для мяне — яго апавяданьні. Адзіны аўтар, які ніколі не надакучае. Не павучае, ня вучыць нават — проста супакойвае ды ставіць усё на належнае месца.

* * *

У маладосьці і разумнейшым, чым ёсьць насамрэч, і прыгажэйшым, і лепшым карціць выглядаць. У сталасьці — і блізка не касыча гэткая хэнць, наадварот, хочацца, каб людзі бачылі такім, як пачуваешся, — натуральным. Досьведу з каптуром, дык і без прыкрас, каб дурнем не выдаваць, коштам яго можна абысьціся.

* * *

І адзін сыпіўся, і другі, і трэці, а ў маладосьці гэткія, здаецца, былі ўсе трое цьвярэзьнікі, ворагі зьмея. Тут жа наадварот — хоць бы каліва цёнгу да алькаголю. Іншы раз і ведаеш: вось бы і някепска было — зьняць стрэс, проста падлагодзіць сябе самога, настрой узьняць. Ажно не — не ідзе, хоць ты прасі каго, каб уліў сільлю. Во каб у маладосьці гэтак. Не: усяму свой час.

* * *

Так чалавек шчыраваў, калегу ягамосьнага сустракаючы, што нават шапку новую, хоць той і мужчына, купіў дзеля гэткае нагоды. А раптам і ацэніць госьць шчыраваньне, раздобрыцца, пару вершыкаў цісьне, і, можа, без чаргі нават, у сваім выданьні. Недарэмна мітусіўся: праўда ціснулі, ня два, а тры нават.



**ФРАНЦ СІЎКО** нарадзіўся ў 1953 г. у вёсцы Вята на Мёршчыне. Піша прозу, публіцыстыку. Аўтар кніг «З чым прыйдзеш» (1991), «Апошняе падарожжа ў краіну ліваў» (1997), «Удог» (2001), «Ягня ахвярнае» (1993), кніжкі для дзяцей малодшага школьнага ўзросту «Бялячык» (2003). Жыве і працуе ў Віцебску.

# З разьбегу, з раскруту, з расскоку

ТАЦЯНА НЯДБАЙ



АРЦЁМ ЛЯВА

* * *

Даруйце тое,
Што немагчыма
Было б даравацъ
У цьвярозым стане,
Даруйце тое,
Што не мужчына,
Ды цешу позірк
На Вашым стане,

Што адчуваю
На вуснах нават
Ня подых Ваш,
А трымценьне цела,
Што ў паху ўсіх
Луговых траваў
Знаходжу водар
Цябе сьпелы…

* * *

Прыходзь да мяне ўвечары,
Мы будзем запальваць сьвечы…
Рызьзё ападзе з плеч маіх…
І ў рытмах
уласных
вершаў мо
Ты будзеш — які ўжо раз! — першы мой.

* * *

Паміж мной і пустэчай
Ты выбіраеш пустэчу.
Ты вар’–я–цееш!!!
Бо пустэча — гэта і ёсьць я
Безь цябе.

* * *

Упершыню заўважыла,
Што ад тваіх лістоў
Можа быць цёпла і сьветла.
Шкада,
Што для гэтага
Спатрэбілася
Запалка.

І мы
Гартаем твае лісты —
Агонь і я.

* * *

Цёмныя калідоры —
Дух маіх лябірынтаў.
Сонная параноя,
Перасьлед пацукоў.

Мы з табою на заўтра
Адкладаем каханьне,
Мы з табою на ўчора
Пакідаем жыцьцё.

Падбяруся пад саван
(Хоць бы проста сагрэцца) —
Час застыў на ўваходзе,
Час кідаць камяні

Ў грэшных і непакорных,
Любых і ненавісных —
Пакаштуй несьмяротнасьць
Зь дзіркай у галаве.

Чорнасьць — сотні адценьняў
(Наглядзецца няможна) —
Мы з табою на сёньня
Выбіраем спакой.

* * *

З разьбегу,
З раскруту,
З расскоку
Высьлізгваю з рук тваіх.
Ты будзеш маім урокам,
Я буду адной зь іх,
Шалёнай і дзёрзкай,
Дрыготкай,
Нястрыманай і — чужой.
Ірвуся ў жыцьцё твае готыкай
І стыну
У ім
Імжой.

І жоўтымі лапамі клёнаў
Душу тваю зноў лаўлю.
І зьлізваю вільгаць салёную.
Вечар. Шапэн. Прэлю–
Ды–я. Op28 №4.

* * *

Красамоўна
Маўчу словамі!
Але ўсё пра мяне
Знойдзеш
У знаках прыпынку
«by me» —
У знаках руху
І знаках лятанку.
Ну што — далася табе ў знакі?

* * *

Паглядзі
на мае
вусны —
Ці прыгожы, ці спакусны?
Ці такія любіць
будзеш?
Ці такія ўраньні
пабудзіш?

Зазірні
у мае
вочы —
ці пра цноту начэй
змоўчаць?
Ці чароўныя іх
зёлкі
не рассыплюцца на
золку…

Паглядзі
на мае
рукі —
ці пяшчотныя ў іх
рухі?
Ці ня поўхамі іх
цешу?
Ці ня пішуць яны
вершаў?

АДАМ ГЛЁБУС



## Сучасьнікі

### 1990. Калтовіч і чарка гарэлкі

Быў месяц май, ніхто не хацеў паміраць, і мне хацелася выпіць. Я прайшоў берагам Сьвіслачы да гатэлю «Беларусь», зайшоў у бар і прымастакоўся каля стойкі. Не пасьпеў я зрабіць замову, як на маім плячы павіс бандыт Калтовіч: «Ты цяпер пісьменьнік. Быў мастаком, а стаў пісьменьнікам. А я стаў бандытам, і ня проста бандытам, а казырным бандытам з салдатамі. Паглядзі — бачыш дваіх зь дзеўкамі, у кутку? Мае салдаты! У мяне да цябе прапанова: ты напішаш пра мяне, а я табе заплачу!» Быў час, калі бандыты верылі ў слова і замаўлялі кнігі пра сваё жыцьцё. «Колькі заплаціць, каб ты напісаў?» — «Чарку гарэлкі купі, і я напішу». — «Давай я табе дзеўку на гадзіну куплю. Выбірай. Любую ў бары магу купіць». Мне хацелася выпіць. «Замоў гарэлкі». Калтовіч замовіў сотку і пайшоў да дзевак з салдатамі. Я выпіў бандыцкай гарэлкі і сышоў з гатэлю «Беларусь». Пра сваё абяцаньне я згадаў толькі тады, калі мне расказалі пра сьмерць бандыта. Калтовіч рабаваў аўтобусы і машыны ў Польшчы, на трасах паміж Беларусьсю і Варшавай. Застрэліў Калтовіча адзін зь ягоных салдатаў, палічыўшы, што той несправядліва падзяліў нарабаванае. Салдат стрэліў Калтовічу ў вока. Але і салдаты нядоўга пагулялі без свайго атамана па гэтым сьвеце. Іх пастралялі польскія паліцыянты. Быў час, калі ў Беларусі, Польшчы і Літве бандытаў стралялі без судоў і сьледзтваў. Ніхто іх не шкадаваў, ніхто не гараваў па іх заўчаснай сьмерці, ніхто не вяртаў пазык іхнім сваякам. А мне падумалася: выпіў ты чарку бандыцкай гарэлкі, даў слова напісаць пра бандыта Калтовіча, дык і напішы пра стрэл зь пісталета ў вока. Як бы там ні было напачатку, а слова ўсё ж вартае таго, каб яго трымаць.

*3.07.2005, 20:01*

### 1961. Тата і Турэц

На аўтобусе «Менск—Горадня» мы — тата, мама і я — ехалі ў госьці, у вёску Варакомшчыну. У мястэчку Турэц аўтобус зламаўся канчаткова. Спачатку ён заглух пасярод задушлівай гарачыні жнівеньскага поля, але шафёр неяк яго завёў, а ў Турцы аўтобус заводзіцца не захацеў. Папэрхаў жалезным кашлем, павуркатаў вантробным голасам і заціх. Пасажыры пахадзілі па прывакзальным пляцы і паселі на лавы ў драўляным буданчыку станцыі. Тата ўзяў мяне на рукі, і я заснуў. Прахапіўся я ноччу. Мы з татам выйшлі на ганак. Белая поўня стаяла над сіне-чорным краявідам. Мне было страшна ў халодным чорна-сінім Турцы, пад сьцюдзёным сьвятлом высокай поўні. Той страх трохгадовага дзіцяці перад бясконцай цемрадзьдзю запомніўся на ўсё жыцьцё, а назва «Турэц» зьнітавалася з жахам. Часам, калі робіцца страшна жыць, згадваю маленькую, кепска асьветленую станцыю ў вялікім безнадзейна-чорным краявідзе і сябе, маленькага і перапалоханага ў таты на руках.

*8.07.2005, 14:16*

# Знакі прыпынку



УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

* * *

Калі паэт пражывае свой век і памірае, акружаны дзецьмі і ўнукамі, у сваім ложку, дык наўрад ці жыцьцё ягонае і сьмерць стануць легендай. Вунь Гётэ, скажуць, няхай і вялікі паэт, але ж колькі жыў!.. Столькі жыць, калі ты паэт, непрыстойна. Ды яшчэ ў дабрабыце, па-людзку. Не пашчасьціла табе, зажыўся, не забілі цябе ці сам не забіўся, то цягні жыцьцё ў хваробах і галечы — тады, можа, і адшчыкнеш што-небудзь ад легенды… Інакш займееш біяграфію зь бібліяграфіяй — і ня больш за тое.

Колас памёр за пісьмовым сталом. На стале — па-сялянску — стаяла бульба. Ложак — у пакойчыку побач… І амаль усё, што магло стаць легендай Якуба Коласа, дадалося да легенды Янкі Купалы. Сасьлізнула са стала, перакінулася з ложка, скінулася ў лесьвічны пралёт.

* * *

Яўген Мазалькоў (рэдактар кніг Купалы ў перакладзе на расейскую мову) згадвае ў сваіх успамінах, як увечары 28 чэрвеня 1942 году гасьцяваў у Купалы (у 414-м нумары гатэлю «Масква») гадзіны за тры да Купалавай сьмерці. «Перад намі на століку, — піша ён, — ляжала вялікая каробка шакалядных цукерак».

Больш ні пра якія пачастункі ва ўспамінах ні слова. А пра выпіўку Купала кажа Мазалькову: «Праз тыдзень мне 60 — тады і пасядзім як сьлед». Што азначае: тады і вып’ем, а зараз ты зьеў бы цукерку ды йшоў адсюль з усімі сваімі перакладамі…

Мазалькоў пайшоў. Празь нейкі час (праз тры гадзіны) Купала, падняўшыся з чацьвёртага на дзясяты паверх, зьлятае ў лесьвічны пралёт.

Назаўтра ў спэцпаведамленьні на імя Берыі (з копіямі Молатаву і Сталіну) начальнік Трэцяга ўпраўленьня НКВД СССР Гарлінскі дакладвае, што пры аглядзе 414-га нумару «выяўлены каля стала дзьве бутэлькі з-пад шампанскага і не прыбраны са стала посуд з пахам віна».

З кім, калі не з Мазальковым, выпіў Купала шампанскае?..

Шампанскае з цукеркамі — не мужчынскае застольле. Як тады, так і цяпер — гэта так званы «джэнтэльмэнскі набор» для інтымных сустрэч.

Сярод рэчаў Купалы, апісаных разам з пачкамі тытуню «Казьбек» і цыгарак «Эліт», нечакана зьдзіўляе жаночая парфума. У вопісе рэчаў (№59): «Духі «Духмяны гарошак». Купала, які паліў «Казьбек», карыстаўся жаночай парфумай?..

Таксама ў вопісе (№78): *разорванный носовой платок.* І яшчэ (№80): *пуговица.*

Магчыма, парваная насоўка з адарваным гузікам і не зьяўляюцца дэталямі найбанальнейшага сюжэту. Тым ня менш, ці не насамрэч, як кажуць французы, «шукайце жанчыну». І знойдзеце ўсё.

# Дрэва на падносе

Што зрабіць, каб 10-гадовае дрэва выглядала так, нібыта яму 150 год? У чым ідэал прыгажосьці бансай? І з чаго пачаць гэтую садаводчую прыгоду?

Мода на мініятурныя дрэўцы апанавала плянэту. Японцы ахвотна падразаюць свае традыцыйныя сосны і вішні, бансаісты ў Афрыцы гадуюць карлікавыя баабабы, а беларусы — грабы, клёны ці ядловец.

Само слова «бансай» у вольным перакладзе зь японскай азначае «дрэва на падносе». Разьмешчаныя ў неглыбокім вазоне прыгожыя і даўгавечныя дрэўцы — вынік шматгадовай працы і намаганьняў. У Японіі яны лічацца каштоўнымі творамі мастацтва і перадаюцца ў спадчыну з пакаленьня ў пакаленьне. Самыя даўнія пісьмовыя зьвесткі пра адмыслова выгадаваныя мініятурныя дрэўцы паходзяць з Кітаю (каля 400 г. н.э.). Двумастамі гадамі пазьней гэтае мастацтва пераняў японцы і на працягу стагодзьдзяў давялі яго да дасканаласьці. Адсюль бансай рушыў на пакарэньне сьвету. У Эўропе гэты фэномэн быў прадстаўлены на Сусьветнай выставе ў Парыжы толькі ў 1878 г.

## Назіраючы за прыродай

Сапраўдных майстроў мастацтва бансай яднае незвычайная пільнасьць, зь якой яны прыглядаюцца да прыроды. Яны кажуць: «Перш чым пачнеш гадаваць дрэва, мусіш добра зь ім пазнацца. Кожная расьліна непаўторная. Шукаючы крыніцы натхненьня, прыглядайся да дрэў — старых дубоў, сосен, што змагаюцца зь ветрам, ядлоўцу, што ўчапіўся за прыбярэжную скалу. Гэта ўзор для бансаю. Уяві сабе, як менавіта павінна выглядаць тваё дрэўца, а потым гадуй яго цярпліва, аналізуючы кожны крок. Ніколі не вырошчвай яго насуперак прыродзе. Калі ў цябе няма ўяўленьня і сэрца для расьлін, не бярыся за гэтую справу…»

Зрэшты, прынцыпы вырошчваньня бансай — не дагматычная інструкцыя; гэта падказкі, якія пакідаюць аўтару шырокае поле свабоды.

Назіраньне за прыродай прывяло да ўзьнікненьня разнастайных стыляў бансай. Калі абрысы дрэўца набліжаны да трохкутніка, гэта выпрастаны стыль; мяцёлчаты — калі дрэўца мае густое лісьце і крону ў форме паўшар'я; каскадны — калі імітуецца дрэва, што ўчапілася за прыбярэжную скалу. Група дрэўцаў бансай можа таксама сымбалізаваць мініятурны лес.

## Дэталь японскага саду

Аматары бансай вырошчваюць ня толькі клясычныя, элегантныя мініятуры ў гаршках для аздабленьня аранжарэй і тэрас. Усё большым попытам карыстаюцца таксама экзэмпляры для высаджваньня ў грунце, якія часьцей за ўсё ўпрыгожваюць сабой сады ў японскім стылі. Працэс гадаваньня дрэўцаў працягваецца ад двух-трох да дзясятка зь лішкам гадоў. У чым ідэал іх прыгажосьці? Яны нагадваюць клясычны бансай у гаршках, адно што дрэвы для саду ня маюць такой строгасьці формаў і намнога большыя па памерах (1,5—4 м).

Правільна сфармаванае мініятурнае дрэва мае магутнае разгалінаванае карэньне і прыгожы, памкнёны ўгару ствол, выгіны якога гарманічныя, «як узор на тканіне». Ніжняя частка ствала на адну трэць пазбаўлена галін — «голая», а да 2/3 вышыні часткова аголеныя. Кампазыцыя мае «твар» — творца задумвае, зь якога боку яна будзе аглядацца часьцей. Вяршаліна дрэва павінна нахіляцца ў напрамку назіральніка. Самы нізкі адростак ствала зазвычай самы доўгі і тоўсты, астатнія — чым вышэйшыя, тым танчэйшыя і карацейшыя. Тое самае з галінкамі, якія растуць з асноўных сукоў. Нават калі ў цэлым галіны нахілены да зямлі, іх канцы ўзносяцца да сонца. Істотнае значэньне маюць правільныя суадносіны паміж таўшчынёй асновы ствала і вышынёй дрэва. Гэтыя суадносіны павінны складаць 1:10—1:15. На практыцы гэта азначае, што дрэва са ствалом таўшчынёй 10 см павінна быць не вышэйшым за 150 см. Звычайна карона мае ў такіх выпадках трохкутную форму. Выключэньнем зьяўляецца бансай парасонападобнай формы — тут не абавязкова прытрымлівацца прапорцый паміж таўшчынёй і вышынёй дрэва.

## Нябачнае ўмяшаньне

Фармаваньне бансай патрабуе сяды-тады радыкальных дзеяньняў. Маладыя дрэўцы павінны рабіць уражаньне векавых, таму іх скарачаюць, асьвятляюць шляхам абразаньня некаторых галін, тоўстыя сукі часам аплятаюць дротам ці выгінаюць на стэляжах. Важна прыбраць усе гэтыя канструкцыі своечасова — тады, калі расьліна незваротна набудзе прадугледжаную задумай, «натуральную» форму, але да таго, як яны пакінуць сьляды. Добра зроблены бансай ня можа насіць на сабе адзнак ужываньня штучных прылад. Яго гадаваньне — гэта зусім ня тое самае, што падстрыганьне дрэў, для чаго дастаткова садовых нажніц. Тут трэба аналізаваць кожны надрэз і задумвацца, як зрэагуе на яго расьліна — якая пупышка разаўецца, дзе зьявіцца новая галінка. Для працы выкарыстоўваюцца спэцыяльныя прылады, а часам іх замяняюць пальцы садавода. Напрыклад, у сосен новыя пупышкі, так званыя «сьвечкі», выдаляюцца заўсёды ўручную, каб не пакідаць сьлядоў.

Пашырана меркаваньне, што з хвойнымі расьлінамі працы менш, бо іх дастаткова абразаць раз у год, а з ліставымі дрэвамі працэдуру належыць выконваць двойчы — раньняй вясной перад разьвіцьцём лісьця і ў чэрвені. Аднак нядаўна на адной з эўрапейскіх садаводчых выставак менавіта 3,5-мэтровая сасна бансай дасягнула завоблачнай цаны 18 тыс. эўра! Ну а што ж — столькі часу зь яе ўручную выдалялі штогод некалькі дзясяткаў тысяч «сьвечак»!

## Месца для бансай

У садзе дастаткова мець адно дрэва бансай. Тады яно прыцягвае позірк, робіцца нечым выключным. Нагрувашчаньне мудрагелістых формаў распыляе ўвагу, пярэчыць прынцыпам гэтага мастацтва.

Калі мы высаджваем выгадаванае дрэва ў вялікім садзе, лепш за ўсё выбраць для яго зацішны куток, дзе яно зможа блісьнуць прыгажосьцю на фоне спакойнай зеляніны ці гладкай сьцяны. Тыя, хто мае толькі балькон ці тэрасу, таксама могуць цешыцца мастацтвам клясычнага бансай. Мініятурныя дрэвы ў вазонах, вечназялёныя ці такія, што цьвітуць, даюць плады і мяняюць колер увосень, замяняюць тады вялікі сад. Яны могуць ператрываць маразы пад адкрытым небам, трэба толькі сачыць, каб не перасохла і ня вымерзла зямля, дзе яны растуць. Таму лепш за ўсё высадзіць каштоўную расьліну ў драўляную скрыню, напоўненую вільготным лісьцем ці торфам. Заўвага: ня варта пераносіць бансай, зроблены зь мясцовых дрэў, у цёплыя памяшканьні, бо гэта перашкодзіць зімоваму адпачынку расьлін.

## З чаго пачынаць

Найлепш пашукаць у гадавальніках дрэўцы з тоўстым ствалом пры адносна невялікай вышыні і разгалінаванай кроне — іх лягчэй будзе фармаваць. Часам можна таксама купіць расьліну на пачатковай стадыі фармаваньня — так званы прэбансай.

Якія віды выбраць? Для садовага бансай падыходзяць лістоўніцы, маленькія кіпарысы, ядловец, сосны, алыча, грабы, букі, дубы і нават рабіны. Яны добра пераносяць нават няўмела праведзеныя садаводчыя працэдуры. Варта паклапаціцца пра спэцыяльныя прылады для гадаваньня бансай. Нельга забываць пра сродкі для заклейваньня надрэзаў. Яны неабходныя, бо дрэва, якое часта абразаюць, безабароннае перад шкоднымі бактэрыямі і грыбамі. Для малых дрэўцаў у вазонах найлепш падыходзіць спэцыяльная японская плястмаса «Бансай Лак», якая засьцерагае ад інфэкцыі і стымулюе разьвіцьцё тканкі вакол надрэзу, так званага калюсу. Пры гадаваньні садовага бансай можна карыстацца папулярным садовым варам ці замазкай.

**Паводле Gazeta.pl**



ІНФАРМАТАР

# TV-бары й клюбы Менску

(дзе можна паглядзець на вялікім экране ў жывым этэры спартовыя спаборніцтвы ці кіно)




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Арта**
вул.Мірашнічэнкі, 55
261–23–31/31–47
Беларуская кухня, усходняя кухня, ТБ, рэстаран.

**Артэміда**
вул.Казінца, 121
278–21–27
Эўрапейская кухня, ТБ, кавярня.

**d'OM**
вул.Чырвонаармейская, 3
289–13–81
Эўрапейская кухня, заля кіно, кавярня.

**Жар-птушка**
вул.Фрунзэ, 2а
285–27–68, 236–56–72
Эўрапейская кухня, DVD, акварыюм, кавярня.

**Імпэратар**
вул.Варвашэні, 10
284–83–15
Закускі, кухня, ТБ, бар.

**Кафэйны**
вул.Камсамольская, 34
227–07–72
Закускі, кухня, ТБ, кавярня.

**Круіз**
вул.Радыяльная, 40А
230–66–31
Эўрапейская кухня, ТБ, музыка, кавярня.

**Легіён**
вул.Чырвоная, 23
284–51–86
Беларуская кухня, ТБ, піцэрыя.

**Ля фантану**
вул.Амуратарская, 4
223–14–74, 223–14–00
Эўрапейская кухня, ТБ, клюб.

**Піцэрыя ГД «Палесьсе»**
пр.Ракасоўскага, 62
248–29–30
Італьянская кухня, ТБ, бар, кавярня.

**Гудвін**
пр. Ф.Скарыны, 19
226–13–06, 8029–626–13–03
ТБ, рэстаран, эўрапейская кухня

**Стэп**
вул.Прытыцкага, 62
253–05–95, (029) 606–06–06
Эўрапейская кухня, кіно, дартс, кругласутачная кавярня.

**Тайм-аўт**
пр.Машэрава, 75/1
205–94–29
Эўрапейская кухня, ТБ, рэстаран.

**Фаварыт**
вул.Старажоўская, 15
209–76–29/73–03
Эўрапейская кухня, дартс, ТБ, DVD, клюб.

**ХуткаПІТ**
вул.П.Броўкі, 22
232–76–51
Эўрапейская кухня, ТБ, кавярня.

**Эльдарада**
вул.К.Маркса, 33/16
222–27–07
Мяшаная кухня, ТБ, музыка.

**Ямайка — 5:0**
вул.Альшэўскага, 10
252–07–26
Эўрапейская кухня, жывая музыка, шоў, бар.

КАІСА

# Удалая выправа

Сёлетні шахматны фэст «Пардубіцы-оўпэн» стаў для беларускіх шахматыстаў самым пасьпяховым за ўсю гісторыю паездак у Чэхію. Грасмайстар Андрэй Кавалёў заваяваў чыстае першае месца ў галоўным турніры, дастаўшы прыз у 3000 даляраў; яго калега Сяргей Азараў апынуўся на трэцім месцы. Выдатна выступілі ў турніры «А», дзе гулялі 58 грасмайстраў, таксама браты Жыгалкі і Мікіта Маёраў, якія ні разу не саступілі сваім тытулаваным супернікам (праўда, зрабіў шэсьць нічыіх у дзевяці турах).

Найстарэйшы ўдзельнік турніру Ратмір Холмаў, прайграўшы Андрэю Жыгалку і зрабіўшы нічыю зь Сяргеем, пажартаваў: «Ну вось, цяперака я праэкзамэнаваў усю беларускую шахматную школу». Сп.Холмаў у пэўным сэнсе сам належыць да гэтай школы: выдатны грасмайстар, які ў 1950–1960-я ўваходзіў у сусьветную шахматную эліту, доўгі час жыў у Менску і выступаў за Беларусь. Пасьля перабудовы Холмаў вярнуўся ў Расею. Увесну яму споўнілася 80, але ў Пардубіцах ён узбіўся на «плюс» — узяў пяць ачкоў зь дзевяці.

Надзея Палівода, чакаючы на зацьвярджэньне ў ФІДЭ тытулу міжнароднай майстаркі, ледзь ня выканала ў Чэхіі і норму грасмайстарскага балу. А вось Рахілі Эйдэльсон крыху не пашанцавала: яна выступала ў пабочным турніры і, паказаўшы добры вынік (6,5 з 9), атрымала толькі «жаночы» прыз — дзесяць даляраў. І тых на закрыцьці не хацелі даваць, бо, праз недагляд арганізатараў, у кампутары не было пазначана, што Рахіль — жанчына! «Налета прыеду выйграваць пятнаццаць даляраў», — пасьмяялася віцяблянка са сваіх прыгод.

Зьміцер Лыбін у Пардубіцах працаваў намесьнікам галоўнага судзьдзі; паводле яго слоў, арганізацыя турніру штогод зьмяняецца ў лепшы бок. Сёлета ўдзельнікі разьмяшчаліся ў прасторнай залі лядовага палацу, і дзякуючы таму, што недзе пад нагамі выпараўся лёд, менш пакуталі ад сьпякоты. Мо і беларускі «оўпэн» правесьці на хакейнай пляцоўцы?

Як у Менску, так і ў Пардубіцах гульцы былі папярэджаны аб забароне на выкарыстаньне мабільных тэлефонаў у залі. На менскім «оўпэне» судзьдзі пашкадавалі парушальніка — мо таму, што правілы ФІДЭ для беларускіх шахматыстаў пакуль у навіну. У Чэхіі тром удзельнікам, якія ўхітрыліся бомкнуць тэлефонамі, умомант залічылі паразу.

Паглядзіце партыю, якая вырашыла лёс першага месца. Віцебскі грасмайстар правёў яе бездакорна: прарыў у цэнтры, выйгрыш пешкі…

А.Кавалёў (Беларусь, 2548) — М.Алексіенка (Украіна, 2478). Пардубіцы, 2005.

1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. Cb5+ Cd7 4. Cd7+ Фd7 5. c4 Kf6 6. Kc3 Kc6 7. O-O e6 8. d4 cd 9. Kd4 Ce7 10. b3 O-O 11. Cb2 Tfd8 12. Te1 a6 13. Kc2 d5 14. cd ed 15. e5 Ke4 16. Ke4 de 17. Фd7 Td7 18. Te4 Td2 19. Tc4 Tad8 20. Kpf1 h5 21. Tb1 Ka5 22. Tc7 Kc6 23. Ke3 Cc5 24. e6! f6 25. Tb7 Ce3 26. fe T8d5 27. e4 Td6 28. Td7 Td7 29. ed Td7 30. Kpe2 Kb4 31. a3 Kd3 32. Kpe3 Kc5 33. b4 Kb7 34. Tc1 Kpf7 35. Tc6 Kd6 36. a4 Kpe7 37. e5 Kf5+ 38. Kpe4 Td2 39. Cc3 Tf2 40. ef+ gf 41. Tf6 1-0.

**ВР**



### Як бы вы згулялі?

Н.Палівода (Беларусь, 2223) — Р.Шэцьці (Індыя, 2367). Пардубіцы, 2005. Ход белых.

**Адказ.** Мінчанка ўзяла быка за рогі: 1. Cb6 Фc8 (лепей было памяніцца на b3) 2. Ka5 Ca4 3. b3 Cb5 4. Ca7 Ta8 5. c5 — і перамагла міжнароднага майстра.

ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 12 чэрвеня

**АНТ, 23.00**

«Мядовы месяц у Лас-Вэгасе».

ЗША, 1992, рэж. Эндру Бэргман.

Камэдыйная мэлядрама.

Джэк і Бэці (Нікалас Кейдж і Сара Джэсыка Паркер) едуць у Лас-Вэгас, каб ажаніцца. Але недарэка-жаніх прайграе ў покер несусьветную суму, і ўдавец-махляр (Джэймс Каан) прапануе ў якасьці кампэнсацыі на выхадныя ўзяць напракат нявесту, якая дужа нагадвае ўдаўцу-гангстэру памерлую жонку.

Маладая парачка мусіць прайсьці выпрабаваньні (жаніх нават скача з парашутам у кампаніі з Элвісам Прэсьлі), каб завяршыць фільм хэпі-эндам.

Сара Джэсыка Паркер яшчэ не «замацярэла» «Сэксам у вялікім горадзе», а Нікалас Кейдж («8 мм», «Дзікія сэрцам») — легкадумны й вольналюбівы кавалер, які з прыгодамі знаходзіць сабе шлюбную «клетку».

**БТ, 23.45**

«Мастацтва вайны».

ЗША—Канада, 2001, рэж. Крысьціян Дугей.

Прыгодніцкі баявік.

Нэйл Шоў (Уэсьлі Снайпс — «Блэйд») — звышсакрэтны й найлепшы агент спэцаддзелу ААН. Падчас выкананьня чарговага заданьня яго арыштоўвае ФБР — і абвінавачвае ў забойстве кітайскага пасла. Герой мусіць апраўдацца, знайсьці сапраўднага забойцу— і разабрацца з агрэсіўнымі кітайскімі трыядамі.

Ворагам можа быць кожны, але выйграе толькі той, хто валодае мастацтвам вайны.

Крысьціян Дугей («Гітлер — узыходжаньне зла») стварыў дынамічны й закручаны баявік з кулямі, хмарачосамі, мілеpopulate мам і палітычнымі інтрыгамі — якія служаць адпаведным фонам для подзьвігаў Уэсьлі Снайпса.

### Субота, 13 чэрвеня

**НТВ, 19.05.**

«Бяссоньне ў Сыэтле».

ЗША, 1993, рэж. Нора Эфран.

Мэлядрама.

Уначы радыё даносіць голас дзіцяці, якое шукае сабе маці. Тата дзіцяці (Том Хэнкс — «Форэст Гамп») пакутуе пасьля сьмерці каханай жонкі — і маленькі сын расказвае пра сямейнае гора. Сотні жанчын адгукаюцца, кранутыя й расчуленыя, але толькі адна зь іх (Мэг Раян — «Унутраны космас») разумее: бацька дзіцяці і яна прызначаны адно для аднаго. І няхай паміж імі сотні міляў, яна заручаная, а ён анічога ня ведае пра яе — яна закахалася ўжо загадзя.

Актрыса Мэг Раян увасобіла амэрыканскую мару пра ідэальную спадарожніцу жыцьця — і «Бяссоньне ў Сыэтле» сталася яе зорнай карцінай.

Апэратар фільму — слынны Свэн Нюквіст («Ахвярапрынашэньне»).

Цёплая, шчымлівая і сьветлая мэлядрама мела велізарны посьпех ва ўсім сьвеце.

**СТВ, 23.20**

«Пяць перашкод»

Данія—Швайцарыя—Бэльгія—Францыя, 2003, рэж. Ёрген Лет, Ларс фон Трыер.

Фільм-экспэрымэнт.

Геніяльны маніпулятар і суровы фармаліст Ларс Трыер ставіць экспэрымэнт на рэжысэру Ёргену Лету і ягонай карціне «Дасканалы чалавек» 1967 году. На прапанову Трыера Лет стварае пяць паўтораў свайго фільму — кожны раз з новымі перашкодамі ад Трыера. Былы дакумэнтальны фільм нават становіцца анімацыяй…



Кіно дэманструецца ў рубрыцы «Арт-хаўз».

### Нядзеля, 14 чэрвеня

**НТВ, 12.55**

«Майкл».

ЗША, 1996, рэж. Нора Эфран.

Камэдыйная мэлядрама.

У правінцыйным матэлі затрапезная выгляду анёл з крыльцамі паліць, есьць — і дорыць людзям дробныя й прыемныя цуды. Гэтая карціна Норы Эфран не такая добрая, як яе «Бяссоньне ў Сыэтле», але Джон Траволта («Крымінальнае чытво») у ролі анёла ўвагі варты.

**АНТ, 21.05**

«Эвалюцыя».

ЗША, 2001, рэж. Айван Райтман.

Фантастычная камэдыя, прыгоды.

На Зямлю трапляе мэтэарыт. Мікраарганізмы, якія ў ім знаходзіліся, імкліва эвалюцыянуюць — і за некалькі гадзін становяцца мнагаклетачнымі.

Доктар Айра Кейн (Дэйвід Духовны) і журналістка Элісан (Джуліяна Мур) мусяць спыніць іншапланэтнае жыцьцё, якое зь неймавернай хуткасьцю набывае ўсё новыя й новыя формы.

Лёгкая й дасціпная фантастыка зь цікавымі й трапнымі спэцэфэктамі.

**СТВ, 22.10**

«Дарога ў рай».

Аўстралія—ЗША, 1997, рэж. Брус Бэрэсфорд.

Драма.

Гісторыя пра жанчын у японскім лягеры для ваеннапалонных у часы Другой сусьветнай вайны. Гераіні з розных краін, якія размаўляюць на розных мовах, мусяць аб'ядначца ў хор, каб стварыць жыцьцесьцьвярджальную сымфонію чалавечых галасоў.

Галоўныя ролі выканалі Глен Клоўз («Небясьпечныя сувязі»), Фрэнсіс Макдорманд («Фарго»), Джуліяна Маргуліс («Хуткая дапамога»).

Аўстралійскага рэжысэра Бруса Бэрэсфорда («Шафёр міс Дэйзі», «Добры чалавек у Афрыцы») адзначаюць як аўтара зь яскравай індывідуальнасьцю.

**Андрэй Расінскі**

## СПОРТ

**Кубак УЭФА**
**11 жніўня, чацьвер**
Першы матч другога кваліфікацыйнага раўнду Кубку УЭФА. МТЗ–РІПА (Менск) — «Цепліцэ» (Чэхія).
Стадыён «Трактар». Пачатак а 18–й. Квіткі: 3000—5000.

**Чэмпіянат Беларусі. 16 тур**
**13 жніўня, субота**
«Гомель» — «Славія» (Мазыр).
«Тарпэда» (Жодзіна) — «Нёман» (Гродня).
«Зорка–ВА–БДУ» (Менск) — «Дынама» (Берасьце).
«Нафтан» — «Дарыда» (Ждановічы).
**14 жніўня, нядзеля**
«Дынама» (Менск) — «Лякаматыў» (Менск).
**15 жніўня, панядзелак**
БАТЭ (Барысаў) — «Дняпро–Трансмаш» (Магілёў).
«Шахцёр» (Салігорск) — МТЗ–РІПА (Менск).

**Конны спорт**
**З 12 да 14 жніўня** ў Гомелі пройдзе першынство Беларусі па конным спорце (пераадольваньне перашкод) сярод юніёраў і юніёрак.

## МУЗЫКА

**Філярмонія**
**11** (чц) — канцэрт арганнай музыкі.

## АЎТАРСКАЯ ПЕСЬНЯ

**Ветразі надзеі**
**З 19 да 21 жніўня** ва ўрочышчы Скакаль пад Салігорскам адбудзецца 5–ы гарадзкі фэстываль аўтарскай песьні «Ветразі надзеі–2005». Кантактны тэлефон — 653–29–70, Аляксандар Канчак.

## СЛАВУЦІЧ-2005

**19—21 жніўня** непадалёк ад Славуцічу пройдзе 11–ы міжнародны фэстываль аўтарскай песьні «Славуціч–2005». Дабрацца можна з Чаргнігава электрычкай (на Славуціч, Няданнычы ці Іёлчу), далей ад аўтавакзалу аўтобусам да вёскі Рачное. На аўтавакзале Славуцічу будзе інфармацыйны шчыт са схемай.

## ВЫСТАВЫ

**Манэты Кітаю**
У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры Беларусі да 20 верасьня працуе выстаўка «Манэты Кітаю».

**Monochrome/palette**
У «Падземцы» (пр.Скарыны, 43) **да 14 жніўня** працуе выстаўка фатаздымкаў «Monochrome/palette» Вікі Мядзьведзевай (Латвія). Уваход вольны.

**Terra Incognita**
У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 47) **да 27 жніўня** можна наведаць фатавыстаўку Віталя Бутырына (Літва). Квіткі: 2000.

**Неба на трох**
У арт–хаўсе «Востраў» (вул. Усходняя, 131, правае крыло шматпавярховай паркоўкі) **да 15 жніўня** працуе фатавыстаўка «Неба на траіх». Уваход вольны.

**13 вучань**
У кавярні–бары «Лёндан» (пр. Ф.Скарыны, 18) **да 14 жніўня** працуюць выстаўкі «13 вучань» і «Жывапіс А.Бялова».

**Ганна ў гарадах**
**Да 1 верасьня** ў галерэі візуальных мастацтваў «Nova» (вул. Веры Харужай, 16) працуе выстаўка фатаздымкаў Ганны Драпезы. Уваход вольны.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Брод на возеры Сялява, што за Халопенічамі. Апошнія дні летняга турызму.**

## ЖЫВЫ ГУК

**Белая вежа** (284–69–22, 239–16–00)
**12** (пт), 23.00 — «Acoustic Band».
**14** (ндз), 23.00 — «Acoustic Band».
**19** (пт), 23.00 — фольк–гурт **«Altanka».**
**21** (ндз), 23.00 — «Acoustic Band».
**Кавярня «Стары Менск»** (289–14–00)
**13** (сб), 20.00 — «Папарыс».
**14** (ндз), 20.00 — «Папарыс».
**20** (сб), 20.00 — «Папарыс».
**21** (ндз), 20.00 — «Папарыс».
**Bronx** (288–10–61, gsm velcom: 103 і 105)
**12** (пт), 21.45 — «Alegrias».
**19** (пт), 21.00 — вакал Тані Фарэда.

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Bronx** (288–10–61, GSM «Velcom»: 103 і 105)
**11** (чц), 22.00 — dj Mitya, dj Kudesnikoff.
**13** (сб), 23.00 — «Mercedes Party».
**14** (ндз), 17.00 — нядзельны кінасэанс.
**Ізюм** (206–66–18)
**11** (чц), 22.00 — «Royalty R'n'B»: dj Baks (Масква), dj Gaamer.
**12** (пт), 22.00 — «Love party».
**13** (сб), 22.00 — «Fusion party»: dj Lexa
**14** (ндз), 21.30 — live: «Blues Street»; «Sunday dance»: dj Luxury.
**Madison** (219–00–10)
**11** (чц), 22.00 — dj Nice.
**12** (пт), 23.00 — dj Nice.
**13** (сб), 22.00 — dj Nice.
**14** (ндз), 23.00 — «Staff party».
**Белая Вежа** (284–69–22, 239–16–00)
**11** (чц), 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Grizzly, dj Bergamo.
**13** (сб), 1.00 — dj Dee.
**Бліндаж** (219–00–10)
**11** (чц), 23.00 — dj Egor.
**12** (пт), 23.00 — dj Макс Лайтаў.
**13** (сб), 23.00 — dj Макс Лайтаў, dj Egor.
**14** (нд), 23.00 — dj Макс Лайтаў, dj Egor.
X–Ray (223–93–55)
**12** (пт), 22.00 — «Royal Two» (Штутгарт, Германія), dj Noche.
**13** (сб), 22.00 — dj Top.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора» (253-33-60)**
«Усё ці нічога» (прэм'ера): **12** (пт) 16.40, 18.50, 21.10; **13, 14** (сб, ндз) 14.20 (іл), 16.40, 18.50, 21.10.
«Дзівосная даліна»: **12** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **13, 14** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
**«Берасьце»** (272–87–91)
«Імпэрыя ваўкоў»***: **12** (пт) 13.30, 16.00 (іл), 18.30 (іл), 21.00; **13, 14** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.
**«Дружба»** (240–90–13)
«Джынсы–талісман»: **12—14** (пт—ндз) 16.30 (іл), 19.00, 21.00.
**«Кастрычнік»** (232–93–25)
«Усё ці нічога»: **12** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **13, 14** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.
**«Масква»** (203–14–48)
«Усё ці нічога» (прэм'ера): **12** (пт) 16.20, 18.40, 21.10; **13, 14** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.10.
**«Мір»** (288–22–33)
«Джынсы–талісман»: **12** (пт) 14.30, 16.40, 19.00, 21.20; **13, 14** (сб, ндз) 14.30 (іл), 16.40, 19.00, 21.20.
«Імпэрыя ваўкоў»***: **12—14** (пт—ндз) 16.00, 18.20, 20.40.
**«Перамога»** (203–77–66)
«Імпэрыя ваўкоў»***: **12** (пт) 13.50, 16.20, 18.50, 21.15; **13, 14** (сб, ндз) 13.50 (іл), 16.20, 18.50, 21.15.
**«Піянер»** (227–64–87)
«Бэтмэн: пачатак» (2с): **12—14** (пт—ндз) 14.00, 18.45.
«Горад грахоў»****: **12—14** (пт—ндз) 16.30, 21.15.
**«Цэнтральны»** (200–34–16)
«Джынсы–талісман»: **12** (пт) 11.00, 15.00, 19.00, 21.00; **13, 14** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.00, 19.00, 21.00.
«Брудныя танцы–2»: **12—14** (пт—ндз) 13.00, 17.00.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ЮНАМУ ГЛЕДАЧУ

**«Аўрора»**
«Шалёныя скачкі»: **12** (пт) 10.30; **13, 14** (сб, ндз) 13.00.
**«Бярэсьце»**
«Гарфілд»: **12—14** (пт—ндз) 11.00.
**«Дружба»**
«Пінокіё–3000»: **12** (пт) 10.30; **13** (сб) 13.00; **14** (ндз) 11.00.
«Агент Кодзі Бэнкс»: **12** (пт) 14.00; **13** (сб) 11.00; **14** (ндз) 13.00.
**«Масква»**
«Карпарацыя монстраў»: **14** (ндз) 12.00.
**«Мір»**
«Гарэзы»: **12** (пт) 10.30; **13, 14** (сб, ндз) 13.30.
**«Піянер»**
«Падводная братва»: **12—14** (пт—ндз) 10.20.
«Тайная крэпасьць»: **12—14** (пт—ндз) 12.20.

# Рок супраць рэжыму

Акцыю пад такой назвай ладзіць польскае Таварыства маладых кансэрватараў. Як сказаў «НН» прадстаўнік арганізацыі Павал Станчык, акцыя задуманая, каб паказаць салідарнасьць маладых палякаў з тымі, хто перасьледуецца цяпер у Беларусі, — прадстаўнікамі польскай меншасьці і моладзьдзю. «Рок — гэта музыка незалежнасьці, таму мы зьвярнуліся да польскіх музыкаў з просьбай падтрымаць такую акцыю», — кажа П.Станчык.

Шэраг рок–музыкаў запішуць свае песьні для зборніку, які будзе распаўсюджвацца ў Беларусі. Туды ж увойдуць гіты часоў «Салідарнасьці». Сярод музыкаў называюцца Павал Кукіз, кінаактор і лідэр групы «Piersi», група «Golden Life». Таксама ўвойдуць песьні легендарных «Maanam», «Strachy na Lachy». Да акцыі далучыўся і Марак Буцька — экс–сакратар польскага пасольства ў Беларусі. На прэс–канфэрэнцыі, прысьвечанай акцыі «Рок супраць рэжыму», ён сказаў, што рок–музыка ў Беларусі папулярная, але беларускамоўным групам не даюць працаваць і канцэртаваць. У сувязі з чым дыплямат прапанаваў супрацоўнічаць зь беларускімі музыкамі. Пачатак супрацоўніцтву пакладзены — група «NRM» дасьць вялікі канцэрт у межах фэстывалю, прысьвечанага 25–годзьдзю «Салідарнасьці».

**Арганізуецца паездка на канцэрт, прысьвечаны 25-годзьдзю «Салідарнасьці», які адбудзецца 3 верасьня ў Познані (Польшча). У праграме: «NRM», украінскія рэпэры «Greenjoly» («Разам нас багата!»), легенды польскага року «Maanam», «Strachy na Lachy» і іншыя. Завершыць праграму агнявое шоў і фаервэрк. Даведкі: тэл. 622-57-20, 578-97-08, 232-54-58, электронны адрас w1979@tut.by.**

**Сяргей Будкін**

КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# На бязрыб'і і баран...



«Дзівосная даліна» («Чудная долина»)

Расея, 2005, каляровы, 76 хв.

**Жанр:** мэлядрама, рамантычная камэдыя.

**Адзнака:** 4 (з 10).

На постсавецкай прасторы распладзіліся бараны. Андрэй Кудзіненка ўвекавечыў гісторыю барана, які не дае спаць мірным вяскоўцам. Расейскі прадусар Сяргей Сяльянаў выкапаў чароўнага барана ў Цэнтральнай Азіі.

Бедны пастух Сардор закаханы ў Лэйлу. Але яе выдаюць замуж за багатага Маруфа. Лэйла ўцякае ад свайго мужа — і дамагаецца разводу. У любоўнай гісторыі героям дапамагае баран–уцякач, тэрарыст і хуліган; ён «выбівае» з Маруфа патрэбныя словы. Акрамя таго, баранова дабраслаўленьне проста неабходнае для мясцовай капрызнай сьпявачкі, яе амэрыканскага жаніха і для старых у выкананьні Надзеі Румянцавай і Міхаіла Казакова. Нахабную жывёліну нават прымаюць за ўваскрослага мужа, пешчаць і мыюць.

Карціна рэжысэркі Рано Кубаевай — просьценькая гісторыя зь лёгкім усходнім калярытам. Для мыльнай опэры ў фільме зашмат чароўнага; для чароўнай гісторыі — зашмат мэлядраматычнага; для расейскага кіно — зашмат дываноў; для Азіі — занадта расейскага духу.

Румянцава і Казакоў — галоўныя прынады ў гэтым расейскім фільме, але на іх яўна чужое адзеньне — і выглядаюць яны пэрсанажамі «Клону».

Хаця гэтая карціна і саступае «Барану» Андрэя Кудзіненкі, раздражненьня «Дзівосная даліна» не выклікае і ў дажджлівы дзень можа быць прагледжаная — за адсутнасьцю лепшага.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Сацыяльна-рыначная Палёнія

Рэпрэсіі супраць Саюзу палякаў — самы буйны праект беларускай калянізацыі Польшчы з часоў Пілсудзкага. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Уяўляю, які бардак пануе сёньня ў асяродках польскіх этнографаў. Амаль стагодзьдзямі вучоныя мужы лічылі, што кашубы, сілезцы, мазуры і хіба што сарматы (улюбёная фенька недабітых арыстакратаў з-за Бугу) — вось і ўсе этнамаргіналы, якія тармозяць з тым, каб інтэгравацца ў склад польскай нацыі. І раптам на глёбусе Польшчы зьявіўся новы кантынэнт — «нашы палякі».

У той час як герой Мэры Шэлі доктар Франкенштайн намагаўся стварыць аднаго штучнага гомасапіенса, беларускія чыноўнікі зафігачылі цэлую этнаграфічную адзінку. Афіцыйны Менск абвясьціў, што на базе польскай дыяспары ў сінявокай склалася асобная этнакультурная група — так званыя «нашы палякі», якія па шэрагу крытэраў вельмі моцна адрозьніваюцца ад абарыгенаў надвісьлянскага краю.

Паводле слоў беларускага лідэра, які, як высьвятляецца, акрамя хакею няхіла сячэ ў этнаграфіі, Тадэвуша з Горадні ад Тадэвуша з Кракава адрозьніць вельмі проста: трэба спытаць рэспандэнта, што ён думае пра ход лібэральных рэформаў у Польшчы і пра ідэю Кандалізы Райз выкарыстаць сяброў Саюзу палякаў Беларусі (СПБ) у якасьці гарматнай тушонкі для Аранжавай рэвалюцыі.

«Нашапольскі» Тадэвуш на пытаньні тэсту адкажа прыблізна наступным чынам: «Як гаворыць БТ, у Польшчы, у адрозьненьне ад Беларусі, поўная дупа, таму ніякая рэвалюцыя нам не патрэбна».

Цукерка тут у тым, што асновай калектыўнай самаідэнтыфікацыі зьяўляецца ня толькі мова, культура і фальклёр, а таксама палітычныя прыбамбасы, якія ўкладваюцца ў формулу «Я паляк, аднак Польшчы праз пануючыя там палітычныя парадкі цярпець не магу».

Гэта правакацыйны наратыў. Фактычна, мадэль жыцьця палякаў у Беларусі трактуецца як альтэрнатыва жыцьцю палякаў у сучаснай буржуазна-дэмакратычнай Польшчы. Ці не здаецца вам, што гэта вельмі падобна на савецкі габрэйскі праект, які камуністы супрацьстаўлялі сіяністычнаму? Кожны габрэй у сьвеце мог выбіраць, куды рабіць ногі ад дакучлівых жыдафобаў, — у Бірабіджан ці Тэль-Авіў.

Прыкладна тое ж мы канстатуем сёньня: кожны паляк, якога дастала карупцыя і беспрацоўе, можа пераехаць і далучыцца да будаўніцтва сацыяльна-рыначнай Польшчы, пакуль што, праўда, у фармаце некаторых польскіх раёнаў РБ.

Колькі будзе такіх шызікаў, невядома, аднак сам па сабе праект пэрспэктыўны, беручы пад увагу пэрманэнтнасьць крызісаў капіталістычнай эканомікі. Урэшце, ён варты ўвагі з пункту гледжаньня ўкладу ў сусьветную культурную традыцыю. Этнаграфічная экспэдыцыя, якая прыедзе ў Новую Варшаву (былы Шчучын), проста афігее, убачыўшы рытуальны абрад «Выганяньне Анжалікі Борыс з офісу СПБ».

На заканчэньне хацелася б яшчэ раз падзякаваць кіраўніку РБ за яго бязьмежны гуманізм. Бо мог жа проста абвясьціць усіх палякаў шпіёнамі і выслаць усіх садзіць чарнобыльскі рапс.



# Канцлер на хвалях

**У пятніцу, 12 ліпеня ў этэры «Радыё Менск» (92,4 FM) у 23.00 праграма «Тузін гітоў». Яе вядучы Алег Хаменка, лідэр групы «Палац», будзе размаўляць з Канцлерам, лідэрам групы «ZET». Цягам гадзіны прагучаць песьніўдзельніцы мэгатуру, а таксама старыя і новыя творы «ZET».**

УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Эльяшу Б. зь Менску.** Рэакцыя ДАІ на Вашу перамогу ў судзе паказальная. Але выпадак усё ж прыватны, карысных высноваў зь яго чытачы не зрабілі б. Таму друкаваць ня будзем.

**Кацярыне Б. зь Менску.** Частку ўпадабаных Вамі словаў надрукуем, а частку Вы ўспрынялі неадэкватна. Напрыклад, расейскі «укроп» — гэта «кіпень», «вар», зусім ня «кроп». Дарэчы, слоўнік Ластоўскага — ня тая крыніца, на якую можна абапірацца ў паглыбленьні ведаў беларускае мовы. Ластоўскі быў вялікі прыдума. Запісвайце і беларускія словы, якія Вы чулі ад людзей, але якія слоўнікамі не фіксуюцца. Гэта нашмат важнейшае, чым лексыка, выпісаная з слоўнікаў.


**ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА**

**2—5 верасьня**

ў Познань і Варшаву.
3 верасьня ў Познані — канцэрт гурту

**«N.R.M.»**

**Т.: 232-54-58, 622-57-20** (Зьміцер), **578-97-08** (Віталь)


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Найлепшага ў сьвеце татку** Лаеўскага Ўладзімера віншую з Днём народзінаў! Усё будзе добра! Сын Дзяніска

**Уладзімер**, віншую цябе з Днём народзінаў! Зычу здароўя, шчасьця, аптымізму, даўгалецьця, посьпехаў! Жонка Сьвятлана

**Віталя Корнева**, сапраўднага мужыка і беларуса, з Днём народзінаў віншуе сям'я Чырвінскіх. Зычым посьпехаў у жыцьці, каханьня і паразуменьня. Дзякуй Богу, што ёсьць такія людзі, як Ты!

### КАНТАКТЫ

**Студэнткі** здымуць хату ці палову хаты (з асобным уваходам) на працяглы тэрмін за невялікія грошы. Пажадана драўляная хата, можна без выгод. Т.: 226–50–72 (Вольга, Сьвятлана). desan_@tut.by

**Студэнт БДУ** здыме пакой ці кватэру. Чысьціню і спакой гарантую. Т.: (01773) 34–662; 640–75–01. dzianis–bnr@tut.by, kryvich@mail.ru. Дзяніс

**Запрашаем валанцёраў** далучыцца да добраўпарадкаваньня Быхаўскай крэпасьці з 15 да 17 жніўня. Даведкі праз тэлефон: 359–23–90 ці e–mail: faberr@mail15.com

**Мужчына** 25 гадоў пазнаёміцца зь беларускамоўнай дзяўчынай. Зь яскравай зьнешнасьцю і агнявым характарам. 20—30 гадоў. Т.: 753–27–03. Андрэй

**Хлопец** 30 гадоў з сур'ёзным намерам пазнаёміцца з жанчынай ці дзяўчынай, якая ня паліць. Т.: 766–12–79. Зьміцер

**Набуду** «Аўдзі–100–авант», не старэйшую за 1977 год. Дызэль. Т.319–65–74.

**Запрашаем валанцёраў** далучыцца да аднаўленьня замку ў Любчы з 16 па 26 жніўня. Даведкі праз т.: 755–03–70, 225–40–69

**Паважанае спадарства!** У найбліжэйшы час плянуецца адкрыцьцё беларускамоўнага сайту. Кожны з вас мае магчымасьць даслаць на адрас 08.09.1514@tut.by любую інфармацыю (вершы, творы, артыкулы, уласныя меркаваньні на тэмы, якія Вас турбуюць, прапановы і г.д.). Гэтая інфармацыя (без выключэньняў) будзе разьмешчана на нашым сайце. Спадзяюся на плённае супрацоўніцтва з кожным беларусам! Будзьма разам, жыве Беларусь!

### КНІГІ

**Кнігаабмен.** Тэл. 753–91–96

**Прапаную кнігі:** «Беларускі клясычны правапіс», слоўнік Байкова—Некрашэвіча, «Матэматычная энцыкляпэдыя», «Міндоў — кароль Літовіі». Т.: 753–91–96

**Прадам кнігі:** «Тэўтонскі ордэн», «Беларускі арнамэнт» Кацара, «Этымалягічны слоўнік» 1—8 т., «Да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне 1939—51 г.» Віньніцкага, «Армія Краёва на Беларусі», «Ад родных ніў» Л.Геніюш, Прага, 1942 г., факс. выд., ды інш. Багаты выбар. Т.: 753–70–05

### ПРАЦА

**Жыхару Менску** прапануем працу ў галіне інфармацыі. Камунікатыўнасьць, наяўнасьць ПК. Т.: 756–45–78, 311–70–60, электронны адрас: budova@tut.by

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17–й. Т.: 235–18–72


Падпіска на «ARCHE»



**Працягваецца падпіска на штодвухмесячнік «ARCHE». Падпісны індэкс 00345.**


## К О Ш Т Ы

На платныя прыватныя абвесткі
(для прыватных асобаў) на с. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб.
Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал–макету за 1 см$^2$ — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку блянка паштовага пераказу у сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

**Даведкі праз т. (017) 284-73-29**


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 3327.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 20.00 03.08.2005.

Замова №

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а